Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

24 КАСТРЫЧНІКА 2024 г. ЧАЦВЕР

№ 208 (30342)

ЗВЯЗДА

РАЗАМ МЫ МОЖАМ ЗРАБІЦЬ БОЛЬШ 4

ШТО ЗМЕНІЦЦА Ў ПАСАЖЫРСКІХ ПЕРАВОЗКАХ? 8

Важная навіна

ДАТА ВЫБАРАЎ ПРЭЗІДЭНТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ ПРЫЗНАЧАНА НА 26 СТУДЗЕНЯ 2025 ГОДА

Гэтае рашэнне было аб'яўлена падчас пасяджэння Палаты прадстаўнікоў

Адкрываючы пасяджэнне, Старшыня Палаты прадстаўнікоў Ігар СЕРГЯЕНКА адзначыў, што ў наступным годзе ў Беларусі адбудзецца выключна важная і значная грамадска-палітычная падзея — выбары Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. «Яны завершаць цыкл электаральных кампаній па абноўленай Канстытуцыі, — звярнуў увагу спікер. — Вынікі маючай адбыцца прэзідэнцкай выбарчай кампаніі маюць ключавое значэнне для кожнага грамадзяніна, грамадства і дзяржавы ў цэлым. Гэта знакавая вяха ў развіцці любой краіны, выпрабаванне на трываласць палітычнай сістэмы дзяржавы. Менавіта прэзідэнцкія выбары вызначаюць будучыню Беларусі на найбліжэйшыя гады і кірунке яе далейшага развіцця».

«ВЫБАРЫ КІРАЎНІКА ДЗЯРЖАВЫ БУДУЦЬ САДЗЕЙНІЧАЦЬ ДАЛЕЙШАМУ ЎМАЦАВАННЮ НАРОДАЎЛАДДЗЯ Ў КРАІНЕ»

Прапанову аб прызначэнні даты выбараў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь у Палату прадстаўнікоў унесла Цэнтральная выбарчая камісія Рэспублікі Беларусь.

Як звярнуў увагу **старшыня Цэнтральнай выбарчай камісіі Ігар КАРПЕНКА,** унясенне змяненняў і дапаўненняў у Канстытуцыю Рэспублікі Беларусь, прынятых на рэспубліканскім рэферэндуме 27 лютага 2022 года, паклала пачатак маштабнай палітычнай мадэрнізацыі нашай краіны. Карэкціроўка Асноўнага Закона, па яго словах, прывяла да неабходнасці змянення шэрагу нарматыўных прававых актаў, уключаючы Выбарчы кодэкс.

«Пераразмеркаваны паўнамоцтвы органаў дзяржаўнай улады, зменены ўмовы і патрабаванні да вылучэння кандыдатаў на выбарныя пасады, замацаваны нормы, накіраваныя на забеспячэнне электаральнага суверэнітэту, — канкрэтызаваў старшыня ЦВК. — На падставе зменена заканадаўства сфарміраваны парламент краіны, мясцовыя Саветы дэпутатаў, праведзены выбары дэлегатаў Усебеларускага народнага сходу, які пачаў сваю работу ў канстытуцыйным статусе. У сувязі з гэтым правядзенне выбараў кіраўніка дзяржавы з'яўляецца лагічным завяршэннем фарміравання ўсіх інстытутаў улады на падставе абноўленага канстытуцыйнага заканадаўства і, несумненна, будзе садзейнічаць далейшаму ўмацаванню народаўладдзя ў краіне».

Згодна з артыкулам 81 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь і артыкулам 56 Выбарчага кодэкса, выбары Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь назначаюцца Палатай прадстаўнікоў не пазней як за пяць месяцаў і праводзяцца ў нядзелю — не пазней як за два месяцы да заканчэння тэрміну паўнамоцтваў папярэдняга Прэзідэнта. У адпаведнасці з артыкулам 83 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь Прэзідэнт уступае ў пасаду пасля прынясення Прысягі. З моманту прынясення Прысягі нававыбраным Прэзідэнтам паўнамоцтвы папярэдняга Прэзідэнта спыняюцца.

«Пакольскі інаўгурацыя дзеючага кіраўніка дзяржавы адбылася 23 верасня 2020 года, адпаведна чарговыя выбары Прэзідэнта павінны прайсці не пазней за 20 лістапада 2025 года, — канстатаваў Ігар Карпенка. — Такім чынам, заканадаўства не ўтрымлівае ўказанні на канкрэтны дзень правядзення выбараў Прэзідэнта, як, напрыклад, адзіны дзень галасавання па выбарах дэпутатаў, які праводзіцца ў апошнюю нядзелю лютага. Асноўны Закон не забараняе праводзіць выбары раней, ён забараняе праводзіць іх пазней за ўстаноўлены тэрмін».

Па меркаванні Цэнтральнай выбарчай камісіі, аптымальнай датай для правядзення выбараў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь бачыцца 26 студзеня 2025 года. «З улікам уступлення выбранага Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь на пасаду ў двухмесячны тэрмін з дня выбрання правядзенне выбараў у абазначаную дату скароціць на шэсць месяцаў тэрмін паўнамоцтваў дзеючага кіраўніка дзяржавы, што не выключае права дзеючага Прэзідэнта балатавацца на новы тэрмін, — праінфармаваў Ігар Карпенка. — Пры гэтым выбары не будуць з'яўляцца пазачарговымі. У адпаведнасці з артыкулам 81 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, правядзенне пазачарговых выбараў магчыма, калі пасада Прэзідэнта аказалася вакантнай».

СТАР. 4

На палях саміту БРІКС

Падрабязнасці першага дня рабочай паездкі Прэзідэнта ў Казань



Такія насычаныя падзеямі і сустрэчамі рабочыя дні, як учора ў Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі ў Казані, здараюцца нячаста нават у вопытных палітыкаў. Як трапна абазначыў планы кіраўніка дзяржавы тэлеграм-канал «Пул первого», «рабочую праграму Прэзідэнта нельга назваць насычанай — гэта спрынтарскі забег».

Менавіта з бегам на некалькі дыстанцый запар і сапраўды можна параўнаць рабочы графік Аляксандра Лукашэнкі ў сталіцы Татарстана, дзе гэтымі днямі праходзіць XVI Саміт БРІКС. Сёння беларускі лідар бярэ ўдзел у пасяджэнні саміту ў фармаце «БРІКС плюс/аўтрыч». Лідары краін абмяркуюць актуальную міжнародную праблематыку, тэму ўмацавання ўзаемадзеяння ў фармаце БРІКС як адной з асноў шматбаковасці, павышэння з'яднанасці сусветнай большасці і хутчэйшага вырашэння існуючых рэгіянальных канфліктаў.

А ўчора літаральна за паўдня кіраўнік нашай краіны правёў на палях саміту БРІКС тры важныя міжнародныя сустрэчы — з лідарамі Венесуэлы, Лаоса і Эфіопіі. І даў тры інтэрв'ю — тэлеканалу Бі-бі-сі, Вользе Скабеевай, вядучай праграмы «60 мінут» на канале «Расія», і Першаму кітайскаму нацыянальному тэлебачанню — у журналістаў Прэзідэнт Беларусі заўважы нарасхват.

Зрабіць крокі да паглыблення адносін

З Прэзідэнтам Венесуэлы Нікаласам Мадура Аляксандр Лукашэнка сустрэўся як з добрым сябрам. «Радуемся за цябе пастаянна, тваёй нязломнай мужнасці. Вельмі ўдзячныя за гэту мужнасць, за стойкасць. Гэта нам надае сілы і ўпэўненасць», — звярнуўся ён да венесуэльскага калегі.

«Гэтыя сілы — яны ўзаемныя, — сказаў у адказ Нікалас Мадура. — Мы вядзём напружаную барацьбу, але гэта барацьба вядзе да перамогі. Цяпер у нас вельмі значныя планы, якія мы хочам рэалізаваць, каб дасягнуць будучыні».

Пры гэтым ён падкрэсліў вялікую ролю Уга Чавеса ў развіцці Венесуэлы і нарошчванні ўзаемадзеяння з Беларуссю. «Я памятаю аб тых вельмі цёплых, сяброўскіх адносінах, якія былі ў вас з Прэзідэнтам Чавесам, — звярнуўся Прэзідэнт Венесуэлы да беларускага лідара. — Цяпер наш венесуэльскі народ мае гэтыя цёплыя пачуцці ў адносінах да Беларусі».

Прэзідэнт Беларусі таксама аддаў належнае вялікай ролі Уга Чавеса ў станаўленні Венесуэлы і фарміраванні двухбаковых адносін з Беларуссю. «Якія б мы з табой ні вялі перагаворы сёння, заўтра і ў будучыні, з намі заўсёды будзе Уга. Нашы пачуцці да гэтага чалавека аднолькавыя», — падкрэсліў беларускі лідар. Ён таксама нагадаў, што цяперашні венесуэльскі кіраўнік Нікалас Мадура раней прысутнічаў на перагаворах Аляксандра Лукашэнкі і Уга Чавеса ў якасці кіраўніка МЗС і заўсёды яго пазіцыя была на карысць развіцця адносін дзвюх краін. «Ніколі не была на шкоду Беларусі», — звярнуў увагу кіраўнік дзяржавы. «Я да гэтага часу памятаю, калі мы з Чавесам вялі перагаворы, ён заўсёды пытаўся: «Нікалас, так будзем рабіць ці інакш з Беларуссю? Якія будуць адносіны?» І заўсёды тваё меркаванне было ў аснове тых адносін, якія тады складваліся і існуюць цяпер», — сказаў Прэзідэнт.

«Таму Нікалас Мадура, Прэзідэнт Венесуэлы цяперашні, яго палітыка — гэта як Чавес і яго палітыка тады. Я ўвогуле ўражаны тым, наколькі ты сам і твае прыхільнікі, якія цябе падтрымліваюць, адданыя Чавесу і той палітыцы, якую ён ажыццяўляў. Вы проста малайцы. Вы ні на ёту не адступілі ад той палітыкі. Гэта заслугоўвае найвялікшай павагі», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Кіраўнік беларускай дзяржавы нагадаў, што нядаўна па яго даручэнні Венесуэлу наведаў прэм'ер-міністр, «каб зрабіць першы крок да паглыблення адносін». «У тым ліку ажыццявіць рэвізію цяперашніх адносін, адкінуць тое, што ўжо не працуе, пакінуць тое, што нам трэба, і выпрацаваць новае, — растлумачыў Аляксандр Лукашэнка. — Гэта значыць, мы цяпер імкнёмся да таго, каб выпрацаваць новую дарожную карту нашых адносін, план будучыні. Думаю, гэтым шляхам трэба ісці».

Нікалас Мадура выказаў абсалютную згоду з такім падыходам.

Апорны пункт на паўднёвым усходзе Азіі

Беларусь зацікаўлена ў пашырэнні і актывізацыі супрацоўніцтва з Лаосам, заявіў Аляксандр Лукашэнка на сустрэчы з Прэзідэнтам Лаоса Тханглунам Сісулітам.

«Павінен вам сказаць, што мы вельмі, вельмі добрасумленна настроены адносна вашай краіны, — звярнуўся кіраўнік беларускай дзяржавы да лідара Лаоса. — Мы хацелі б паглыбіць нашы адносіны, мець на паўднёвым усходзе Азіі нейкі пункт апоры для Беларусі. І ў сувязі з тым, што мы для Лаоса цікавыя і патрэбныя (прабачце за нясціпласць), мы маглі б пашырыць наша супрацоўніцтва і больш актыўна супрацоўнічаць з вамі. Для гэтага ўсё ёсць».

СТАР. 2

КАРОТКА

- **Вытворчасць сельгаспрадукцыі ў Беларусі за дзевяць месяцаў вырасла больш як на 5 працэнтаў.**
- Рэканструкцыю ўчастка трасы М3 ад Лагойска да Плешчаніц плануюць завяршыць да 7 лістапада.
- **Беларускія тавары складаюць больш як 90 працэнтаў расійскага імпарту малочнай прадукцыі.**
- Дні адчыненых дзвярэй пройдуць у БДПУ з 28 кастрычніка да 1 лістапада.
- **ДАІ: колькасць ДТЗ з удзелам сродкаў персанальнай мабільнасці ў 2024 годзе вырасла амаль на 70 працэнтаў.**

ISSN 1990 - 763X

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

Поўдзень Афрыкі перажывае найцяжэйшы голад

Месяцы засухі на поўдні Афрыкі, выкліканыя з'явай надвор'я Эль-Ніньё, аказалі разбуральнае ўздзеянне на больш чым 27 мільёнаў чалавек і сталі прычынай самага сур'ёзнага голаду ў рэгіёне за апошнія дзесяцігоддзі. Пра гэта паведаміла Associated Press. Сусветная харчовая праграма (СХП) ААН папярэдзіла, што гэта можа стаць «поўнамаштабнай гуманітарнай катастрофай». Пяць краін — Лесота, Малаві, Намібія, Замбія і Зімбабвэ — аб'явілі надзвычайнымі бедствы з-за засухі і выкліканага ёю голаду. Паводле ацэнак СХП, каля 21 мільёна дзяцей на поўдні Афрыкі цяпер недаядаюць з-за неўраджаю. Ангола на заходнім узбярэжжы Афрыкі і Мазамбік на ўсходнім узбярэжжы таксама «сур'ёзна пацярпелі». «Сітуацыя жудасная», — падкрэсліла агенцтва. У паўднёвай частцы Афрыкі цэны на прадукты харчавання рэзка ўзраслі ў многіх раёнах, якія пацярпелі ад засухі, што пагоршыла сітуацыю. Адзначаецца, што засуха мае і іншыя разбуральныя наступствы. Улады Намібіі і Зімбабвэ звярталіся да забойства дзікіх жывёл, у тым ліку слоноў, каб забяспечыць галодных людзей мясам.

Насельніцтва Украіны скарацілася на 10 мільёнаў чалавек

Рэгіянальны дырэктар па Усходняй Еўропе і Цэнтральнай Азіі Фонду ААН у галіне народанасельніцтва Флорэнс Баўэр на брыфінгу ў Жэневе заявіла, што Украіна страціла каля 10 мільёнаў жыхароў з 24 лютага 2022 года. Пра гэта паведамляе РІА «Новости». Па словах Флорэнс Баўэр, значная частка гэтых людзей пакінула краіну. «Насельніцтва старэе, а моладзь шукае магчымасці ў іншых месцах і з'язджае з краіны», — адзначыла яна. Напярэдадні дырэктар украінскага Інстытута дэмаграфіі і сацыяльных даследаванняў Эла Лібанава звярнула ўвагу на вялікую колькасць пажылых жыхароў і нізкі каэфіцыент нараджальнасці. Паводле яе слоў, выратаваць сітуацыю не зможа нават «цудоўнае» вяртанне людзей, якія з'ехалі з краіны. Дэмограф адзначыла, што ва Украіне цяпер вельмі глыбокі дэмаграфічны крызіс.

Па сутнасці справы

САЦЫЯЛЬНА-ЭКАНАМІЧНАЕ РАЗВІЦЦЁ РЭГІЁНАЎ І ІМПАРТАЗАМЯШЧЭННЕ

Летам 2022 года Прэзідэнт даў даручэнне пачаць рэалізацыю ініцыятывы «Адзін раён — адзін праект». Гэтая падзея стала па-сапраўднаму знакавай для развіцця рэгіёнаў. А для некаторых з іх і ўвогуле адкрыла другое дыханне. Прызваная актывізаваць мясцовыя ініцыятывы ў частцы пошуку і ўвасаблення ў жыццё перспектыўных інвестыцыйных праектаў, праграма цалкам выконвае задачы. Дзякуючы ёй істотна паляпшаецца інвестыцыйны клімат у рэгіёнах, забяспечваецца іх збалансаванае сацыяльна-эканамічнае развіццё і скарачаецца разрыў па ўзроўні і якасці жыцця насельніцтва.

Трэба адзначыць, што мясцовыя ўлады без прамаруджвання ўключыліся ў гэтую работу і штогод колькасць праектаў толькі расце. Для параўнання: на пачатку рэалізацыі ініцыятывы было 129 праектаў, а да канца 2023-га — ужо 156 коштам 6,5 мільярда. Сёлета ў краіне ідзе работа па 208 праектах агульным аб'ёмам інвестыцый каля 8,8 мільярда рублёў. Па выніках іх завяршэння плануецца стварыць больш за 10 тысяч рабочых месцаў. Сёння амаль у палове ўсіх раёнаў будуць рэалізаваны па два праекты, у кожным дзясятым — па тры праекты, а ў Дзяржынскім раёне Мінскай вобласці аднамомантна будуць ажыццяўляцца ажно шэсць праектаў. Акрамя ўсяго іншага, варта адзначыць яркія выяўленую імпратазамяшчальную скіраванасць інвестпраектаў.

СТАР. 11

Актуальна

НА ГАДЫ НАПЕРАД

Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў прынялі ў першым чытанні законапраект «Аб змене законаў па пытаннях адукацыі»

Кодэкс аб адукацыі быў прыняты параўнальна нядаўна — у 2022 годзе — і стаў настольнай кнігай для работнікаў адукацыйнай сферы. Дакумент праходзіў выпрабаванні ва ўмовах практычнай дзейнасці, а яго галоўнымі рэцэнзентамі сталі настаўнікі, выхавальнікі, педагогі ўстаноў адукацыі, бацькі (усе яны, дарэчы, прымалі актыўны ўдзел у фарміраванні пакета змен у кодэкс). У выніку выявіліся шэраг рэчаў і палажэнняў, якія трэба дашліфаваць, давесці, як кажуць, да розуму. Новы законапраект прадугледжвае змены ў 20 законах і двух кодэксах — не толькі ў Кодэкс аб адукацыі, але і ў шэраг артыкулаў іншых заканадаўчых актаў. Аднак ніякіх глабальных, канцэптуальных змен не плануецца.

Прафесійная адукацыя: гарантыі маладым спецыялістам

Начальнік галоўнага ўпраўлення прафесійнай адукацыі Міністэрства адукацыі Сяргей ПІШЧОЎ расказаў аб тым, якія гарантыі будуць у маладых спецыялістаў, што звольнены ў сувязі з прызывам, але не накіраваны для праходжання службы па прычыне хваробы або ўкамплектаванасці воінскіх часцей.

— Яны могуць разлічваць на займанне ранейшай пасады на працягу пяці дзён з дня атрымання адпаведнага паведамлення ад ваеннага камісарыята. Гэта норма падтрымана Міністэрствам адукацыі, — растлумачыў ён.

СТАР. 11

На палях саміту БРІКС

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

У сваю чаргу Тханглун Сісуліт падзякаваў Аляксандру Лукашэнку за магчымасць сустрэцца і згадаў пра свой візіт у Мінск у 2013 годзе ў статусе намесніка прэм'ер-міністра — міністра замежных спраў Лаоса. У маі гэтага года ён таксама сустракаўся з Прэзідэнтам Беларусі ў час парада з нагоды Дня Перамогі ў Маскве.

«Я пастаянна сачу за навінамі. Хацеў бы павіншаваць вас з поспехам па кіраўніцтве краінай — Беларусь узмацніла сваю ролю на сусветнай арэне», — сказаў лаоскі лідар. Ён таксама выказаў падзяку Беларусі за супрацоўніцтва ў ваенна-прамысловай сферы і аказанне дапамогі ў падрыхтоўцы кадраў для Лаоса.

Пры гэтым тэмпы і ўзровень супрацоўніцтва, асабліва ўлічваючы высокі ўзровень палітычнага ўзаемадзеяння і дружалюбныя адносіны Беларусі і Лаоса, перакрыліся Тханглун Сісуліт.

Аляксандр Лукашэнка пагадзіўся з гэтым тэзісам: «Адносіны нашы, як вы вельмі правільна сказалі, не адпавядаюць таму патэнцыялу, які ў нас існуе. Нам трэба смялей і энергічней рухацца па гэтым шляху. Трэба вызначыцца, што мы адзін аднаму павінны зрабіць. Думаю, мы гэта зробім у найбліжэйшы час, і вы можаце не сумнявацца, спадар Прэзідэнт, мы сваю дарогу пройдзем і зробім так, каб было для вашага народа зручна і выгадна супрацоўнічаць з Беларуссю».

Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў гатоўнасць супрацоўнічаць з Лаосам па многіх напрамках, якія маюць узаемную цікавасць. «Думаю, трэба, каб група спецыялістаў з вашага боку і група спецыялістаў з нашага боку выпрацавалі план на найближэйшую і сярэднюю перспектыву, каб мы разумелі, у якім напрамку рухацца, якія тавары вас цікавяць у нас і што нас цікавіць у Лаоскай Народна-Дэмакратычнай Рэспубліцы. Усё гэта трэба цяпер склеіць і выпрацаваць канкрэтны план і пакласці нам на стол для зацвярджэння», — сказаў Прэзідэнт. Для вырашэння гэтых пытанняў ён прапанаваў абмяняцца візітамі. «Я вас заўсёды чакаю ў Мінску, тым больш вы ведаеце дарогу ў Мінск», — заўважыў Аляксандр Лукашэнка, дадаўшы, што сам знойдзе час, каб пабываць у Лаосе.

Вароты ў Афрыку

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка на палях саміта БРІКС у Казані сустрэўся з прэм'ер-міністрам Федэратыўнай Дэмакратычнай Рэспублікі Эфіопія Абіем Ахмедам Алі.

Прэзідэнт адзначыў, што Эфіопія для Беларусі хоць і далёкая, але ў той жа час і вельмі блізкая краіна, з ёю заўсёды спрабуем супрацоўнічаць. «Апошнім часам неяк не вельмі атрымліваемся. І я ўдзячны вам за гэту сустрэчу. Думаю, што вы будзеце садзейнічаць нейкаму руху ў нашых адносінах, і што мы зможам выбудаваць нашы адносіны ў далейшым», — падкрэсліў беларускі лідар.

Паводле яго слоў, асаблівую значнасць двухбаковае супрацоўніцтва набывае ў святле таго, што Беларусь зацікаўлена праз Эфіопію атрымаць доступ на рынак Афрыкі, разглядае гэту краіну як вароты ў Афрыку. «Таму нам вельмі цікава супрацоўнічаць з вамі. Думаю, што нам трэба не проста аднаўляць, а ўдасканальваць і мадэрнізаваць шляхі нашага супрацоўніцтва. Мы да гэтага гатовы,» — звярнуўся да суразмоўніка Аляксандр Лукашэнка.

«Хацелася б звярнуць увагу на цікавасць, якую наша краіна праяўляе да гандлёва-эканамічнага ўзаемадзеяння з вашай краінай, — сказаў прэм'ер-міністр. — Перш за ўсё мы зацікаўлены ў сумесная работе ў галіне сельскай гаспадаркі (мадэрнізацыя сельскай гаспадаркі з'яўляецца для нас прыярытэтам). Мы хацелі б папрацаваць разам у тэкстыльнай галіне, горназдабыўной прамысловасці, у сферы высокіх тэхналогій і гэтак далей».

У адказ Прэзідэнт Беларусі падкрэсліў: «Мы людзі адкрытыя, мы гатовы быць вам карысныя там, дзе вы палічыце патрэбным». Кіраўнік дзяржавы прапанаваў арганізаваць візіт спецыялістаў Эфіопіі ў Беларусь, каб яны маглі на месцы вызначыцца з тымі сферамі і таварамі, якія ўяўляюць цікавасць для іх краіны: ці гэта сельская гаспадарка або ваенна-прамысловы комплекс. «Калі вы нешта знойдзеце карыснае для вас, скажыце, мы ў гэтым кірунку будзем вам дапамагаць і будзем з вамі супрацоўнічаць», — запэўніў Аляксандр Лукашэнка. Такім жа чынам Беларусь гатова дзяліцца патрэбнымі для Эфіопіі тэхналогіямі, прычым не проста іх перадаваць у гэтую краіну, але і праводзіць навучанне мясцовых спецыялістаў.

Адной з тэм размовы стала адсутнасць выхаду да мора ў абедзвюх краін.

Абій Ахмед Алі з вялікім шкадаваннем заўважыў, што ў Эфіопіі няма выхаду да мора. Ён лічыць, што з прычыны свайго геаграфічнага становішча Беларусь здольна зразумець, з якімі праблемамі сутыкаецца яго краіна. Прэм'ер-міністр растлумачыў, што Эфіопія мае вялікія запасы прэсная вады і на бязвыплатнай аснове супрацоўнічае з суседнімі краінамі, даючы ім прэсную ваду. «Але, спажываючы нашу прэсную ваду, нашы суседзі, на жаль, не спяшаюцца дзяліцца з намі доступам да мораў і акіянаў, — адзначыў ён. — Наша краіна другая па колькасці насельніцтва ў Афрыцы. Можаце ўявіць, калі такая шматмільённая краіна знаходзіцца без доступу да мора, наколькі цяжка нам выжыць». «Доступ да мораў і акіянаў, да фінансаў павінен быць раўнапраўным, размяркоўвацца паровну. Мы не павінны ваяваць, сварыцца вакол рэсурсаў», — перакрываючы Абій Ахмед Алі. «Таму для нас такая важная пазіцыя Беларусі, якая ведае і падзяляе наш боль. У нас ёсць рэсурс, мы хацелі б дзяліцца ім, але на раўнапраўнай і ўзаемавыгаднай аснове», — дадаў ён.

Аляксандр Лукашэнка пацвердзіў, што для Беларусі таксама знаёма і актуальна гэта тэма. Прэзідэнт выказаў упэўненасць, што для Эфіопіі вырашэнне акрэсленай праблемы — гэта пытанне часу.

«Я СЁННЯ ПРЭЗІДЭНТ БЕЛАРУСІ, І Я БУДУ АБАРАНЯЦЬ ІНТАРЭСЫ БЕЛАРУСКАГА НАРОДА»

Пра што Аляксандр Лукашэнка гаварыў у інтэрв'ю журналісту «Бі-бі-сі» Стывену Розенбергу

У ходзе інтэрв'ю абмяркоўваліся розныя тэмы, у тым ліку цікавасць Беларусі ў БРІКС, СВА і перспектыва мірных перагавораў Расіі і Украіны, тэма ядзернай зброі, ці з'яўляецца яна фактарам стрымлівання і які механізм яе прымянення. Гаварылі таксама на прадмет нармалізацыі адносін з Захадам у цалым і аб выхадзе так званых палітвязняў, перспектывах гэтых працэсаў. Убачу не засталася і тэма выбараў у Беларусі.

Фота БелТА.

Якія гарантыі Расія хоча атрымаць ад Захаду і ці не шкадуе Пуцін аб пачатку СВА

Аляксандр Лукашэнка расказаў, што Беларусь і Расія выпрацавалі адзіную пазіцыю: для ўстанаўлення міру ў рэгіёне патрэбны перагаворы. Прэзідэнт нагадаў, што ў Стамбуле Расія і Украіна нагулі прыйсці да пагаднення, аднак Захад сарваў гэтыя домоўленасці.

«Я іх бачыў: яны мала да чаго катосьці абавязваюць. З гэтага можна пачынаць, яны маюць агульны характар, — заявіў кіраўнік дзяржавы. — Адразу ж селі за стол перагавораў — можна весці размову аб спыненні агню, а потым аб разводзе ўзброеных сіл. Але гэта за стлом трэба вырашаць.

Журналіст зазначыў, што раншэнне Уладзіміра Пуціна аб правядзенні спецыяльнай ваеннай аперацыі не толькі стала катастрофай для Украіны, але і мела сур'ёзныя наступствы для самой Расіі.

«Вы блізка знаёмыя з Пуціным, камунікуеце з ім. Ён шкадуе аб тым, што прыняў такое раншэнне?» — спытаў Стывен Розенберг.

«Шкадуе ён ці не шкадуе — мы на гэтую тэму з ім не размаўлялі. Вядома, ён жа жывы чалавек. У гэтым канфлікце розныя сітуацыі бываюць, хтосьці наступае, хтосьці абараняецца. І адзін, і другі бок нясуць вялікія страты. Шкадуе аб гэтым Пуцін ці не? Вядома, шкадуе, ён жа жывы чалавек, — сказаў Аляксандр Лукашэнка. — Але абсалютна пераканаты ў тым, і будзьце ў гэтым упэўненыя (я не проста перакананы, я гэта ведаю): Пуцін цвёрда лічыць, што ён мае рацыю, і ён матывуе гэта. Ён жа Захаду прапанаваў: вось прапанова Расіі, давайце дамовімся.

На думку кіраўніка дзяржавы, калі Захад не задавальняла тое, у якой форме ім зрабілі прапанову, яны павінны былі адказаць аналагічна, галоўнае — адказаць. Аднак наогул прамаўчаўшы, яны тэкім чынам па-наплявальніцку паставіліся да інтарэсаў Расіі. «І Пуцін часта пра гэта кажа: галоўнае — гэта інтарэсы Расіі і расійскага народа. Ён прыхільны гэтым інтарэсам, ён абавязаны абараняць інтарэсы расійскага народа, і ён абараняе гэтыя інтарэсы. Ён у гэтым перакананы. Можам яго за гэта асуджаць, але ён так думае», — дадаў Аляксандр Лукашэнка.

Журналіст запярэчыў, што цяпер Расію атакуюць беспілотнікі, а частка тэрыторыі і зусім акупаваная замежнымі войскамі — як гэта можа адпавядаць інтарэсам Расіі? Але, адказаў Прэзідэнт, невядома, як бы развівалася сітуацыя, калі б Расія не пачала спецыяльную ваенную аперацыю. Магчыма, усё было б яшчэ горш.

«Было б лепш у Расіі, калі б Украіна ўступіла ў НАТА і былі размешчаны ўзброеныя сілы НАТА на тэрыторыі Украіны з ракетамі і падлётам да пяці хвілін? Было б лепш для Расіі ці не? Уяважаючы ўсё, Пуцін абраў гэты шлях. Па пэўных пытаннях шкадуючы: няўдачы былі. І атака дронамі, і захоп часткі тэрыторыі Расіі. І ён распачаў пэўныя дзеянні. Таму ўсялякае магло быць, мы можам толькі гадаць», — падсумаваў кіраўнік дзяржавы.

Пра ядзерную зброю ў Беларусі

«Пуцін ніколі не прыменіць тую зброю, якая сёння размешчана на тэрыторыі Беларусі, без згоды Прэзідэнта Беларусі. Вы гэта дакладна павінны разумець і ўяўляць», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

У той жа час і Беларусь, калі б ішла размова аб прымяненні ядзернай зброі для абароны свайго краіны, паралізуе б па гэтым пытанні з Расіяй. «Гэта наш саюзнік. Так і з амерыканцамі ўвесь Захад райцца», — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

Прэзідэнт падкрэсліў, што ядзерная зброя — гэта не стрэшыпка, а магутны стрымліваль фактар і ў выпадку неабходнасці ён будзе гатовы прымяніць яго. «Калі хоць адзін бот пераступіць граніцу Беларусі».

Разам з тым Аляксандр Лукашэнка не стаў раскрываць алгарытм прыняцця рашэння аб выкарыстанні ядзернай зброі. «Скажу толькі адно: без майго дазволу гэтая зброя ўжытая быць не можа. Але калі трэба будзе Беларусі, яна будзе ўжытая. Але яшчэ раз кажу: размовы аб ядзернай зброі — сумная тэма. Вы спыталі — я адказаў. Нельга свет шантажыравць ужываннем ядзернай зброі. Мы яе не збіраемся прымяняць, калі будзе сітуацыя такая, як цяпер», — звярнуў увагу беларускі лідар

Пра перагаворы з прадстаўнікамі заходніх дзяржаў

Аляксандр Лукашэнка ў час інтэрв'ю раскрыў падрабязнасці нядаўніх перагавораў з прадстаўнікамі заходніх дзяржаў.

«Мы з гэтымі людзьмі дамовіліся, што гэта закрытыя, канфідэнцыяльныя перагаворы. Яны вельмі дасведчаныя, талковыя людзі. Яны папрасіліся да мяне на прыём, я іх прыняў», — расказаў ён.

Паводле яго слоў, перагаворы ішлі чатыры гадзіны, закраналіся самыя розныя пытанні. «Закраналіся пытанні канфлікту на Блізкім Усходзе. Зяленскі ўзнімае такое пытанне: дайце ракеты, я буду біць па Крамлі да Казані. Я папярэдзіў: хлопцы, вы акуратней з дальнабойнымі ракетамі і іншае. Да Пуціна могуць звярнуцца, напрыклад, хусіты: «Дайце берагавыя комплексы». Якія могуць нанесці страшны ўдар па караблях. А калі ён у адплату, што вы пастаўляеце Зяленскаму дальнабойную зброю, паставіць хусітам комплексы «Бастыён» і будзе паражоны хоць адзін авіяносец? Англійскі, амерыканскі і гэтак далей. «Гэта для нас непрымальна». Я кажу: «Я разумею. Але і для Пуціна непрымальна, калі вы будзеце паставіць дальнабойныя ракеты і біць па ўсёй Расіі». Пагадзіліся: «Так, сапраўды небяспечна».

Яшчэ адной тэмай сустрэчы стала Кітайская Народная Рэспубліка. Аляксандр Лукашэнка папярэдзіў, што, калі Расія і Кітай аб'яднаюць усе магчымыя намаганні, ніхто не зможа супрацьстаяць ім. Паводле яго слоў, у тэхналагічным плане Кітай спыніць ужо немагчыма. «На гэту тэму шмат размаўлялі», — сказаў Прэзідэнт.

Абмяркоўвалася і ўнутрыпалітычная сітуацыя — у Беларусі, Расіі, на Захадзе. «Мы абмеркавалі многія пытанні, іх цікавіў мой пункт гледжання. Я яго выказаў», — падсумаваў Аляксандр Лукашэнка.

Аб войсках КНДР ва Украіне

«Глупства! Гэта эскалацыя ваеннага канфлікту. Ніколі Пуцін не пойдзе на тое, каб катосьці ўгаворваць, каб узброеныя сілы нейкай краіны ўвязваліся ў СВА і ў канфлікт ва Украіне, асабліва, як кажуць вайскоўцы, «на перадку», на лініі судотыку», — пракаментаваў Аляксандр Лукашэнка інфармацыю аб магчымай прысутнасці вайскоўцаў з КНДР ва Украіне.

— Гэта значыць, КНДР не адпраўляе сваіх вайскоўцаў? — удакладніў журналіст.

— Я ў гэта не веру. І ўчора паўночнакарэйцы заявілі, што гэта варажба на кававай гушчы. Ніколі такой размовы і перагавораў не было. Я гавару за Пуціна, ведаючы яго характар. У Расіі насельніцтва хапае, каб вясці ваенныя дзеянні, — заўважыў Прэзідэнт.

— Калі гэта (удзел войскаў КНДР у канфлікце. — **«Зв.»**) пацвердзіцца, вас непакоіць такая сітуацыя? — спытаў Стывен Розенберг.

— Гэта будзе крок да нейкай эскалацыі канфлікту, калі на лініі сударкнання з'явяцца нечыя ўзброеныя сілы, нават беларускія. Нават калі б мы ўвязаліся ў вайну, гэта быў бы шлях да эскалацыі. Таму што вы, англасаксы, адразу б заявілі аб тым, што ў канфлікт увязалася саюзная краіна, значыць, НАТА мае права дапамагчы Украіне. Магчымы такі варыянт? Магчымы. Пуцін і гэты варыянт пралічвае — трэба яму гэта ці не? Але вы кажаце пра КНДР. Дзе Карэя, а дзе Беларусь? Пуцін ніколі перада мной не ставіў пытанне аб тым, каб мы ўвязаліся ў гэтую бойку. Ні ён, ні Шайгу, ні цяперашні міністр абароны Белаусаў. Ніколі не ставілі перад намі такое пытанне, — заявіў Аляксандр Лукашэнка.

Аб нармалізацыі адносін з Захадам

«Я заўсёды хацеў мець нармальныя адносіны з Захадам», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Пры гэтым ён звярнуў увагу, што нядаўнія памілаванні асоб, асуджаных за злачынствы пратэснай накіраванасці, няяк не звязаны з гэтым. Людзі былі вызвалены з гуманітарных меркаванняў, заявіў Прэзідэнт. «Вось і ўсё. І ніякі гэта не крок да паляпшэння адносін з вамі. Не хочаце вы з намі адносін — і не трэба. Мы перажывём і без вас», — заявіў беларускі лідар.

«Я ніколі не гаварыў аб тым, што мы зацікаўлены ў пагаршэнні адносін з Захадам. Гэта вы выбралі такі шлях, пачалі супрацьнас санкцыі ўводзіць па пэўных прычынах», — сказаў Аляксандр Лукашэнка. «Прычыны можна прыдумаць, калі ёсць жаданне. Як не на пустым месцы?» — абурыўся Прэзідэнт.

Ён нагадаў, што пад абмежаванні трапіў нават яго малодшы сын — фактычна дзіця. «Ён у чым вінаваты? Я, дарэчы, гэтым людзям з Захаду (у час нядаўніх перагавораў. — «Зв.») задаваў пытанне. Яны апусцілі галаву, сказалі: «Гэта вар'яцтва», — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

Захад пачаў актыўна ўводзіць супраць Беларусі санкцыі пасля таго, як у Мінску быў пасаджаны самалёт, на борце якога знаходзіўся Раман Пратасевіч. Аднак ніякіх доказаў, што беларускія знішчальнікі перахапілі гэты самалёт, няма. «Вы поўныя вар'яты. Гэты самалёт ляцеў у Вільнюс. Чаму вы яго не пасадзілі ў Вільнюсе? Ён жа развярнуўся над Вільнюсам і вярнуўся ў Мінск. Дзе перагаворы пілота з дыспетчарамі Вільнюса? Вось вашы санкцыі. У вас была мэта націснуць на Лукашэнку, а потым вы прыдумалі прычыны», — падкрэсліў беларускі лідар.

Прэзідэнт таксама звярнуў увагу, што нават калі беларускія ўлады, як заяўляюць на Захадзе, і пасадзілі самалёт, то гэта можна было б назвать вялікай і філігранной аперацыяй, бо ніводзін пункт міжнароднага паветранага права парушаны не быў. «Нас шантажыравалі, папярэдзілі, што бомба ў самалёце. Факты мы вам паклалі на стол. Мы папярэдзілі пілота, што такая інфармацыя. Далей пілот выбірае: у Вільнюсе сесці або ў Мінску. Ён абраў Мінск. Я пры чым тут?» — здзівіўся Аляксандр Лукашэнка.

Аб памілаванні асуджаных

Журналіст спытаў аб магчымасці памілавання Марыі Калеснікавай. «У нас ёсць закон: чалавек усвядоміў сваю віну, ён звярнуўся да Прэзідэнта (як і ў многіх іншых краінах) з просьбай аб памілаванні — ну што ж, мы разгледзім. Калі будзе такі зварот Калеснікавай, я абавязкова разгледжу», — сказаў Аляксандр Лукашэнка. Разам з тым Прэзідэнт здзівіўся, чаму журналіст выключыў менавіта Марыю Калеснікаву, паралельна заяўляючы, што ў Беларусі «мільёны ў турме».

«Таму што ў яе няма допуску да свабоднага ўжо», — паспрабаваў растлумачыць журналіст. «Якой сямі'?! А дзе яе сям'я, вы хоць ведаеце? Вы нават не ведаеце, што за сям'я. Папрасіў бацька яе наведаць. Калі ласка, ідзі. Ён быў. Гэта сям'я? Хтосьці яшчэ хоча з родных, блізкіх наведаць яе, будзе просьба — мы не разгледзім. Там, магчыма, такая сям'я, што ім, можа, і нецікава, як вам, наведаць Марыю Калеснікаву. Вы клапоціцеся за яе больш, чым родныя і блізкія. Я кажу: разгледзім. «Так», «не» — гэта будзе бачна потым», — заявіў кіраўнік дзяржавы.

«Я катэгарычна супраць, што вы пачынаеце асобы выдзяляць. Калі там «сядзіць мільён», дык там усе людзі адноль кавыя. А Калеснікава і іншыя павінны адказаць перад гэтымі людзьмі, чаму яны там апынуліся. Яны многія і кажуць: «Мы ачумелі, адурэлі, нас падманулі». Таму мы іх разглядаем у цэлым. Калі чалавек выпраўлёўся, не парушае закон у калоніі папраўчай, калі нейкія пакаванні па здароўі, мы аблавязкова гэтых людзей, хутчэй за ўсё, памілуем. Ёсць камісія, яна разгледзіць і прыме рашэнне», — расказаў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка расказаў таксама, што некалькі дзён таму камісіі, якую ўзначальвае генеральны пракурор Андрэй Швед, была пастаўлена задача разам з папраўчымі органамі вывучыць справы грамадзян, асуджаных за злачынствы экстрэмісцкай накіраванасці.

«Я схільны да таго, каб людзі, якія ўсвядомілі, зразумелі і не парушаюць парадак там і паводзяць сябе дастойным чынам (не трэба спяваць одну мне), разгледзець гэтыя пытанні (аб памілаванні. — **«Зв.»**). Без Захаду, запомніце. Вы да мяне не маеце ніякага значэння ў плане вызвалення маіх людзей», — заявіў Прэзідэнт.

Аб збеглых «лідарах» і «апазіцыі»

«Апазіцыя — гэта тыя людзі, якія дзейнічаюць унутры краіны ў інтарэсах хаця б мінімальнай колькасці людзей. А вы каго называеце нашымі «лідарамі»? Дзе яны, гэтыя лідары? Прачнецеся! Вы тых, хто ў турме сядзіць за парушэнне законаў, лічыце лідарамі? Дык хоць бы ўсе збеглыя сюды вярнуліся — гэтыя выбары яны не выйграюць. Народ зразумеў, чаго яны хацелі. Калі яны за мяжой, зрабіце што-небудзь для народа, не для Лукашэнкі, а яны бегаюць: «Дайце нам грошы». Гэта першае пытанне. Другое: «Не прызнавайце будучыя выбары». Трэцяе: «Увядзіце больш санкцый». Стварающь узброеныя фарміраванні побач з нашай граніцай, каб закінуць на тэрыторыю Беларусі. Гэта, вы лічыце, апазіцыя?» — спытаў Аляксандр Лукашэнка журналіста.

Прэзідэнт прывёў яшчэ адзін прыклад. У нядаўнім інтэрв'ю асуджаны за арганізацыю змовы з мэтай захопу дзяржаўнай улады Юрый Зянковіч заявіў, што змоўшчыкі хацелі ўзяць у заложнікі б'ліку і малодшага сына Прэзідэнта Мікалая Лукашэнку. Яго планавалася схаваць у склепе ў Гомельскай вобласці, а затым выкарыстоўваць у працэсе торгу, перагаворы, размоў, ціску.

«Гэта адно, што мяне наогул абурае. Другое — расстраляць на ўзлёце або пасадзы верталёт Прэзідэнта з буйнакалібернага кулямёта і гэтак далей. Скажыце, калі ласка, калі б такія факты ўсплылі ў Злучаных Штатах Амерыкі? Яго б сцерлі з зямлі, — заўважыў кіраўнік дзяржавы. — І вы пасля гэтага мяне папракаеце? За што вы мяне папракаеце? Я прашу, калі ты хочаш прыехаць у Беларусь, Стыў, са мной сустрэцца яшчэ: ты прачытаеш гэтае інтэрв'ю і з маёй пазіцыі задасі сабе пытанне: а як Прэзідэнт Беларусі павінен быў паступіць, калі супраць яго такія падкопы плялісі? Даўрэчы, некалькі чалавек, якія збеглі ў групе Зянковіча, адпусціл. Па хваробе выпусціў. Баевіковў выпусціў, а вы мне пра нейкую апазіцыю гаворыце».

«Я ведаю, чым займаецца на захадзе «апазіцыя». Калі-небудзь мы гэта выкладзем усё прамым тэкстам, і вы адкажуць перад беларускім народам, што вы тварылі і чаго хочуць. У гісторыі нашага народа гэта не першая гісторыя, збеглых у нас было мора. І нейкая Сурвіла — дзе яна цяпер? Сядзіць на вашы грошы ў Амерыцы ці дзе там. І гэтыя маргіналы гэтым скончаць», — падсумаваў Аляксандр Лукашэнка.

Аб мірных перагаворах, падтрымцы Расіі і супрацоўніцтве з Украінай

«Калі вы захочаце (я маю на ўвазе Захад), гэты мір можа быць устаноўлены. Вы можаце спытаць, што для гэтага трэба зрабіць. Многае трэба зрабіць, але за сталом перагавораў. Першым крокам павінны быць перагаворы, — перакананы Аляксандр Лукашэнка. — Трэба сесці за стол перагавораў і тыдыцыйна, як ужо яшчэ вышцё выпрацавала, вызначыць план дзеянняў і дамаўляцца аб мірыы».

Пры гэтым кіраўнік дзяржавы лічыць, што ўжо няма часу разбірацца, хто вінаваты ў тым, што здарылася. У адваротным выпадку, паводле яго слоў, бакі ніколі не прыйдуць да міру. «Маюсь зносіны з прадстаўнікамі Захаду, разумнымі людзьмі, мы прыйшлі да адзінай думкі: калі вайна, канфлікт або бойка пачалася, значыць, вінаваты абодва бакі. Магчыма, хтосьці — больш, хтосьці — менш», — расказаў Прэзідэнт.

«Калі пачаўся канфлікт, у мяне адбылася размова з Валодзем Зяленскім. Ён сапраўды так, як вы, пачаў: напалі і іншае. Кажу: «Уладзімір, вайна ідзе на тваёй зямлі, на тваёй тэрыторыі. Так?» — «Так» — «Ты больш за ўсё ў гэтым зацікаўлены (ва ўрэгуляванні канфлікту. — **«Зв.»**)». Што датычыцца, хто на каго напаў, акунёмся ў прычыны. Мы разумеем віну Расіі, так? А я нагадаю вам адзін факт, які я заўсёды называю (ён эмацыянальны, але, тым не менш, важны): у свой час у Доме прафсаюзаў у Адэсе спалілі некалькі дзясятак чалавек. Малацілі, бамблі гэты Данбас, дзе пражывала рускамоўнае насельніцтва. Навошта іх было гнабіць? Навошта гэтую рускую мову вынішчалі і іншае, іншае, іншае. І пайшоў рух, які хваляй накрыў Пуціна: абараніць, забіць, даціснуць і іншае. Пуцін абараніў сваіх людзей», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

У час інтэрв'ю Прэзідэнт заявіў, што Беларусь не давала Расіі тэрыторыю для заходу ва Украіну.

«У нас былі вучэнні, на якіх было задзейнічана некалькі тысяч чалавек расійскіх войскаў. Гэтыя войскі былі ў асноўным з усходняй акругі, і Пуцін пачаў выводзіць гэтыя войскі з Беларусі. Яны былі на поўдні, і па гэтай дарозе, міма граніцы з Украінай, ён пачаў вывад войскаў. Частку войскаў у нейкі перыяд (справакавалі, я ў гэтым перакананы) ён завярнуў на Кіеў. Чаму так здарылася? Спытайце ў Зяленскага», — расказаў Прэзідэнт аб лютаўскіх падзеях 2022 года.

На пытанне аб тым, чаму Беларусь у гэты момант не падтрымала Украіну, Лукашэнка адказаў наступным чынам. «Расія — гэта наш саюзнік. У нас цяснейшыя адносіны, чым у англічан і амерыканцаў. Украіна паўная сябе ў адносінах да Беларусі варожа: яна раней, чым англасаксы, увяла супраць нас санкцыі. Яна забараніла палётны нашых грамадзянскіх самалётаў праз тэрыторыю Украіны. Яна захапіла нашы рухомыя саставы з мінеральнымі ўгнаеннямі. Яна 75 велікагрузаў разам з людзьмі арыштавала. Яна паявла сябе па-бандыцку. Мне прыйшлося праводзіць спецапераацыю, каб вызваліць хлопцаў, якіх яны арыштавалі. А пяцярых чалавек яны забілі і расчляніл, каб мы не зразумелі, як яны загінулі. І вы хочаце сказаць, што я ў абдыжку з Зяленскім у гэты час павінен быў быць? Расія — наш саюзнік. Я падтрымліваў і буду падтрымліваць Расію стольк, колькі ёй патрэбна. Дакладна так, як вы заяўляеце, што будзеце падтрымліваць Украіну», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

«Гэта я яшчэ па мінімуме ўцягнуты ў гэты канфлікт. А можна сказаць, увогуле не ўцягнуты. А паміж намі з Расіяй больш цесныя адносіны, чым паміж Украінай і Амерыкай, якая і грошы выліць туды, і ўзбраенне», — заявіў Аляксандр Лукашэнка.

«Ці значыць гэта, што любое раншэнне расійскага Прэзідэнта...» — пачаў задаваць пытанне журналіст.

«Не значыць. У Прэзідэнта Расіі ёсць інтарэсы расійскага народа, ён іх абараняе. Я сёння Прэзідэнт Беларусі, і я буду абараняць інтарэсы беларускага народа. Яны абсалютна супадаюць з расійскімі. Пакуль яны будуць супадаць, мы з Пуцінным поплеч будзем дзейнічаць», — заявіў кіраўнік дзяржавы.

«Мы не збіраемся ні на каго нападаць, на Украіну ў тым ліку. Гэта нашы людзі — украінцы. Там жывуць нашы людзі. Мы гатовы з імі супрацоўнічаць, што б там ні было. Рана ці позна мы прыйдзем да гэтага. З немцамі ў нас былі якія адносіны — жудасныя. Яны забівалі нашых дзяцей, у калодзежы кідалі, спальвалі, вешалі і гэтак далей. Але праз шмат гадоў мы з немцамі нармальна супрацоўнічалі. Зарубцавалі раны нашым супрацоўніцтвам: гандлёва-эканамічным, тэхналагічным і гэтак далей. З Украінай гэта адбудзецца яшчэ хутчэй, мне падаецца», — лічыць Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт упэўнены, што пасля спынення баявых дзеянняў Захад не захоча дапамагаць Украіне ў адначэнні тэрыторыі і вяртанні да мірнага жыцця. «У Амерыцы ўжо цяпер гавораць, што Украіна багатая, гэтая зямлі аддаць, аддаць амерыканцам карысныя выкапні, патрэбныя для свету, і высокатэхналагічную сыравіну. Таму мы з украінцамі знойдзем агульную мову. Трэба зарэз закончыць гэту вайну», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

Аб імкненні Беларусі ў БРІКС

«Я не стану пралічвадь добрыя якасці дзяржаў і аб'ёмы дзяржаў, якія ўваходзяць у гэтае аб'яднанне. Аб'яднанне на пачатковым этапе, а ўжо наблізілася да паловы — паловы ўсяго: і насельніцтва, і тэрыторыі, выторчы патэнцыял і гэтак далей. А калі казаць аб стратэгіі, то калі краіны, якія ўваходзяць у БРІКС, будуць такім шляхам рухацца і павялічаць тэмпы, я ўпэўнены, яны перасягнуць многія аб'яднанні (яны ўжо перасягнулі, у тым ліку і «сямёрку», і «дваццатку», і іншыя) і наблізяцца да Арганізацыі Аб'яднаных Нацый, не падмяняючы яе пакуль», — сказаў Аляксандр Лукашэнка, адказваючы на пытанне аб прычынах імкнення Беларусі ў БРІКС.

Паводле яго слоў, аналагічнае пытанне маглі задаць нашай краіне і пасля Другой сусветнай вайны, калі яна далучылася да ААН. «Імкнуліся ў ААН для таго, каб стварыць аб'яднаныя нацыі, якія могуць утрымліваць свет у раўнавазе. Дакладна так жа, як заяўляеце, што будзеце падтрымліваць Украіну», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

«Гэта я яшчэ па мінімуме ўцягнуты ў гэты канфлікт. А можна сказаць, увогуле не ўцягнуты. А паміж намі з Расіяй больш цесныя адносіны, чым паміж Украінай і Амерыкай, якая і грошы выліць туды, і ўзбраенне», — заявіў Аляксандр Лукашэнка.

«МНЕ ЗДАЕЦЦА, ТРЭБА СЕСЦІ ЗА СТОЛ ПЕРАГАВОРАЎ»

Падрабязнасці інтэрв'ю Прэзідэнта для праграмы «60 мінут»

Другое за дзень інтэрв'ю Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі на палях саміту БРІКС у Казані — журналістцы УДТРК Вользе Скабеевай. Падчас размовы кіраўнік дзяржавы адказаў на шэраг пытанняў наконт знешнепалітычнай сітуацыі вакол Беларусі і Расіі, а таксама падзяліўся сваім бачаннем завяршэння канфлікту ва Украіне.

Фота БелТА.

Аб эскалацыі

У прыватнасці, беларускі лідар зазначыў, што кіраўніцтва Украіны хацела б ядзернага канфлікту з Расіяй.

«Шмат гаварылі аб ядзернай зброі: «Вось, Расія ўдарыць!..» Украінскія улады хацелі б, каб Расія ўдарыла ядзернай зброяй па Украіне. Ім патрэбна эскалацыя — Захаду, англасаксам. Ім трэба гэта. Таму што іншых ужо варыянтаў няма, — заявіў беларускі лідар. — Але Пуцін малайчына. Разгадаў гэта. Ваша кіраўніцтва, ваенна-палітычнае, гэта разгадала. Вядома, маглі б ударыць. Без усялякіх праблем. Але, робячы крок, трэба разумець, што будзе потым. Заўсёды трэба думаць аб наступных кроках».

«Аднак тое, што кіраўніцтва Украіны хацела б ядзернага канфлікту... Слухайце, больш за 300 працэнтаў. Я не перакананы, я проста гэта ведаю. Не буду пакуль называць гэтыя крыніцы, але я гэта ведаю», — дадаў Прэзідэнт.

Аб тэрмінах заканчэння вайны

Кіраўнік дзяржавы таксама выказаў меркаванне, што вайна на Украіне ў гэтым годзе не скончыцца. Інтэрв'юер задала пытанне пра Уладзіміра Зяленскага і магчымасць хуткага заканчэння вайны: «Пра Валодзю, які Зяленскі. Калі выдыхнуўся, думаеце, вайна хутка скончыцца? Як бачыце перспектыву?»

«Оля, хутка, не хутка — гэта ж не час. Калі б ты сказала, што ў гэтым годзе, я б сказаў: «Не, вайна ў гэтым годзе не скончыцца», — наўпрост заявіў беларускі лідар. А на заўвагу Вольгі Скабеевай наконт слоў Зяленскага аб заканчэнні вайны ў наступным годзе Прэзідэнт зазначыў: «Паслухай, вылезці з бункера і лямпуць, не арыентуючыся ў прасторы, нічога не варта. Ён вылазіць адтуль і чагосьці ляпае. Ён няхай збярэ сваіх найблізкіяшых хоць бы людзей, якія робяць пакуль нейкую пагоду ва Украіне, і з імі параіцца. З вайсковцамі параіцца, са сваімі прыхільнікамі. І яны вам скажуць, што можна гаварыць, а што нельга. Інфармацыю яму дадуць. А ён вось так вылез і ляпнуў на публіку. Разумеючы, што на ім сёння ў нейкай ступені засяроджана ўвага. Гэта хацелкі, гэта яго жаданне. І не болей. Вось гэта яго сутнасць. Гэта ад нявопытнасці. Таму яго сённяшнія заявы з пункту гледжання спецыялістаў смешныя».

У сувязі з такім адказам расійская журналістка зрабіла выснову, што перадумоў для завяршэння канфлікту няма. «З іншага боку, мы ж глядзім, як мы, рускія, нарэшце паперлі на фронце...» — павярнула яна размову ў некалькі іншае рэчышча.

«Ну, можа быць, не зусім паперлі, але пайшлі ладна. Нечакана нават. Але калі яны ўлезлі ў Курскую вобласць (мы кажам з Пуціным сустракаліся). Ён кажа: «Вар'яты». Яны іх пралічылі, разумелі, у чым справа. Я яму сваё меркаванне выказаў, і нашы меркаванні супалі. Гэта страшэнная памылка ўкраінскіх вайскоўцаў», — заявіў Прэзідэнт.

Аб абмене палоннымі

Аляксандр Лукашэнка таксама расказаў аб сур'ёзным і пастаянным удзеле Беларусі ў працэдуры абменаў целамі загінулых і ваеннапалоннымі паміж Расіяй і Украінай.

«Часта гаворыць: Эміраты там садзейнічаюць абмену і іншае. Усе гэтыя абмены праходзяць праз маё рыхі. Палонныя, ваеннапалонныя. Усе на тэрыторыі Беларусі», — сказаў Прэзідэнт. Ён падкрэсліў, што ў гэтым плане ўдалося выбудаваць даверлівыя адносіны з абодвума бакамі: «Я рады, што ваенныя (можа, нават і Зяленскі ў курсе справы) і кіраўніцтва Расіі даяраюць нам. Там ужо мы стварылі такую абстаноўку, што яны заязджаюць на нашу тэрыторыю і абменьваюцца і целамі загінулых. І вось нядаўна, па-мойму, 75 ваеннапалонных абменьвалі». І дадаў: «Таму мы ведаем, што там робіцца. І падтрымліваем гэтыя адносіны».

Аб украінскай ядзернай зброі

Гаворачы аб магчымых распрацоўках ядзернай зброі ва Украіне, кіраўнік дзяржавы абазначыў гэтыя пагрозы хацелкамі Уладзіміра Зяленскага.

«Не веру. Яму гэта ніхто не дазволіць. І яму не дазволіць гэта зрабіць не толькі Расія, але і Захад. Таму што (гэта ўжо не маё меркаванне, гэта перакананне на аснове фактаў) больш за ўсё Захад, англасаксы баяцца ядзернага канфлікту. Яны не хочуць гэтага канфлікту. Амерыканцы яшчэ падумваюць, што яны там за акіянам адсядзяцца. Але без Еўропы ім будзе цяжка вайваць, у тым ліку і ядзернай зброяй. Таму трэба задзейнічаць Еўропу. Еўропа не проста ўпіраецца — яны катэгарычна не дапускаюць выкарыстання ядзернай зброі, ды і амерыканцы гэтага баяцца. Таму яны Валодзю Зяленскаму гэта не дазволяць зрабіць. І гэтыя хацелкі ні да чаго», — сказаў Прэзідэнт.

Разам з тым ён зазначыў, што гэта таксама трэба ўлічваць. «Не стаўрыць, дык сябруй жа ў яго там шмат. І на Блізкім Усходзе, і ў іншых краінах. Каб яны не падцягнулі яму якую-небудзь гадасць, якую ён гатовы сёння выкарыстоўваць супраць Расіі», — перасцярог беларускі лідар.

Гаворачы аб Уладзіміры Зяленскім, Аляксандр Лукашэнка пагадзіўся з тэзісам, што той — «пратэрмінаваны прэзідэнт». «Цяпер ён няхай «адплёвываецца». Ён на мяне ўвесь час валіў бочкі ў 2020 годзе... Цяпер растлумач народу і міжнародная грамадскасці, што ты не пратэрмінаваны прэзідэнт», — заўважыў кіраўнік беларускай дзяржавы.

Падводзячы рысу, Аляксандр Лукашэнка выказаў упэўненасць, што Зяленскі не такі смелы, як можа часам падацца. «Вось я ядзерную бомбу, вось я распрацую, вось я там удару нават па Крамлі... Слухайце, не такі ён смелы. Для таго каб націснуць чырвоную кнопку, трэба валодаць пэўнай смеласцю. Па-другое, трэба думаць аб тым, што будзе потым. Ну, націсну, далей што? Што, Расія абрынецца ад таго, што ты «брудную бомбу» скінеш, нават на Маскву? Не, Расія не загіне, але ўдарыць так, што Украіна знікне», — заўважыў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка канстатаваў, што Зяленскі «любіць добрае жыццё і ў яго ёсць дзе жыць». «Ён баіцца гэта ўсё страціць», — сказаў ён.

Аб выбарах у ЗША

Адказваючы на пытанне аб электаральнай кампаніі ў Злучаных Штатах, кіраўнік дзяржавы назваў яе жахлівай і дурной, але заявіў, што з двух кандыдатаў ён у гэтым выпадку за Дональда Трампа.

«Гэта жудасныя выбары. З нашых крытэрыяў я ўвогуле нічога не разумею. Жудасныя, дурныя выбары, — сказаў беларускі лідар. — Я часта кажу: калі б гэта ў нас ці ў Расіі... Слухай, ніводнага дурня б не выбралі. Ніводнага, ні другога. Жудасна. Гэты некампетэнтны (кандыдат. — **«Зв.»**), а той ляпае чорт ведае што... Ну навошта ты абражаеш? Гэта ж жанчына (размова аб Камале Харыс. — **«Зв»**), у рэшце рэшт. Мужыкі нармальныя з жанчынамі не ваююць: «Дурная, такая, сякая...» Ну ўвязі: у Расіі ці Беларусі нехта выйшаў (і кажа. — **«Зв.»**): «Дурань!» Гэтым ад сябе адштурхнуў вялікую колькасць людзей».

Разам з тым Аляксандр Лукашэнка прызнаўся, што ўсё ж у цяперашніх абставінах з'яўляецца прыхільнікам кампаніі Дональда Трампа.

Аб інфармацыйных укідах

Працягваючы тэму, Аляксандр Лукашэнка зазначыў, што ўкіды аб войсках КНДР на баку Расіі могуць выкарыстоўвацца для ўводу войскаў НАТА ва Украіну.

«Шчыра вам скажу: мы ў курсе справы, што адбываецца на лініі фронту і ў Курскай вобласці. Мы карэйцаў там не фіксавалі. Таму яны ўжо занадта сур'ёзна «схаваныя» там, тэгіля карэйцы, хоць, калі б яны былі, яны павінны былі б вайваць, а не хавацца, — адзначыў кіраўнік дзяржавы. — Але мяне гэта насцярожвае. Я вось ад вас атрымліваю ўтоеную інфармацыю, што нейкі Осцін (кіраўнік Пентагона Лойд Осцін. — **«Зв.»**) і яшчэ нехта там патурбаваліся аб тым, што з'явіліся карэйцы. Мяне гэта насцярожвае тым, што не жадаюць яны там са свайго боку якіх-небудзь не карэйцаў, дык палякаў або французаў падкінуць нам з таго боку — ад Валодзі Зяленскага. Таму да гэтых размоў трэба вельмі сур'ёзна ставіцца і сачыць за гэтым. Я аб гэтым свайму брату (Прэзідэнту Расіі Уладзіміру Пуціну. — **«Зв.»**) скажу абавязкова. Хоць на нагах, але абмяркуем гэтую праблему. А ў найбліжэйшы час сустрэнемся, паглядзім».

Аляксандр Лукашэнка заявіў, што не вельмі верыць у тое, што расіянам патрэбны на фронце карэйцы. «Я магу пра гэта свабодна гаварыць, таму што, нават маючы нашы адносіны з Пуціным і з Расіяй такія, у нас не было такога выпадку, каб Пуцін папрасіў мяне падчас гэтага канфлікту, асабліва цяпер, уключыцца фізічна ў ваенных адносінах у гэтую вайну. Што прасцей? У нас такія адносіны, што можа і жартам, і не жартам сказаць пра гэта. Ніколі такога не было. Не думаю, што такі выпадак настаў», — сказаў Прэзідэнт.

Разам з тым ён заявіў, што ва Украіне ўжо даўно ваююць найміты з дзяржаў НАТА, і гэта людзі, якія фактычна фінансуюцца ўрадамі адпаведных краін. «Тое, што там былі людзі з Францыі, мы гэта ведаем на 300 працэнтаў, — прывёў прыклад Аляксандр Лукашэнка. — Тое, што там прадстаўнікі Польшчы ваююць, — гэта дакладна. Ніхто там нават не ведае і не лічыць, колькі там наймітаў».

— Таму калі б нехта прыйшоў фізічна на дапамогу Расіі, што тут дзіўнага? Чаго дзівіцца, што нехта дапаможа Расіі? — адзначыў ён.

Нагадаў Прэзідэнт і аб выпадку, калі індыйскі бок звярнуўся да Расіі наконт дзясятка сваіх грамадзян, якія трапілі на вайну. «Я памятаю гэты выпадак. Памятаю, як Пуцін рэагаваў без СМІ. Ён кажа: «Я першы раз чую. Калі так, мы знойдзем гэтых людзей і вернем. Нам не трэба, каб даведалі там людзі, якія не хочуць нам дапамагаць», — расказаў кіраўнік дзяржавы.

Падагульняючы сказанае, беларускі лідар яшчэ раз падкрэсліў: «Я ў гэта (ва ўдзел войск КНДР у канфлікце. — **«Зв.»**) не веру. А, самае галоўнае, мне здаецца, тады гэта была б нагода для таго, каб адкрыта, поўнамаштабна ўвесці туды войскі НАТА. Таму што яны выдатна разумеюць, што Валодзя Зяленскі выдыхнуўся. Вайваць няма каму. А пацяпрыць паражэнне ну ніяк не дапушчальна».

Аб перагаворах

Прэзідэнт Беларусі выказаў меркаванне, што заходнікі ўжо больш хочуць, каб Украіна села за стол перагавораў з Расіяй, чым сам Зяленскі. Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што сёння сітуацыя па пытанні мірных перагавораў ужо крыху памянялася.

«Памятаеце, мы раней казалі, што мір будзе тады, калі захочуць англасаксы або захоча Амерыка з тымі натаўцамі, якія Украіну падтрымліваюць. Сёння ўжо не зусім так. Гэтыя размеюць, што ўсё — крах. Улёрся Зяленскі. Ціснуць залішне яны на Зяленскага не могуць, — сказаў Аляксандр Лукашэнка. — Мы заўсёды кажам: ну што тут ціснуць — не пастаўляюце зброю, не давайце грошы і іншае. А гэта іх твар. Захад не можа страціць твар — не даць зброю, не даць грошы. Пасля ўцёкаў з Афганістана гэта ўжо будзе канец, ім ужо нікто верыць не будзе. Яны не хочуць страціць твар».

Паводле слоў Аляксандра Лукашэнкі, на Захадзе ўжо хочуць, каб Зяленскі сам пагадзіўся сесці за стол перагавораў. «Яны ўпляваюць на яго, але не перацікаюць», — заявіў кіраўнік дзяржавы.

«І калі саступаць тэрыторыі, то павінна быць рашэнне Украіны і іх. Вось у гэтым плане я ўпэўнены, што такі пералом, крэн ужо адбыўся. Заходнікі больш жадаюць, каб Украіна і Зяленскі селі за стол перагавораў з Пуціным і з Расіяй, чым сам Зяленскі», — лічыць Прэзідэнт.

Кіраўнік дзяржавы перакананы, што цяпер ёсць магчымасць для перагавораў. «І, мне здаецца, трэба сесці за стол перагавораў. І план будзе выпрацаваны мірнага ўрэгулявання або заканчэння вайны толькі за сталом перагавораў. Украіна — Расія», — сказаў Прэзідэнт.

Аб «мірным плане» Зяленскага

Кіраўніку дзяржавы было зададзена пытанне, ці верыць ён у гэты «мірны план». Адказваючы на яго, Прэзідэнт назваў гэты «план» балбатнёй і перакананў заходнікаў у тым, што вінаватая не толькі Расія.

«Нявказа там плана няма. План — гэта ўсё балбатня. Расія — імперыя. Не ніхто не нахіліць і не прымусіць сесці за стол перагавораў на ўмовах лозунгаў Валодзі Зяленскага. Я жу тысячу разоў аб гэтым гаварыў у пачатку вайны», — заявіў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт нагадаў, што не раз падкрэсліваў той факт, што вайна ідзе ва Украіне, а таму трэба потым разбірацца, хто вінаваты, а не крычаць аб гэтым. «Калі мы вінаваты, то і ты вінаваты. Расія вінаватая, але і ты вінаваты», — сказаў ён.

Глабальны кантэкст

Дыялогавая пляцоўка аднадумцаў

У БРІКС няма вядучых і тых, каго вядуць, а ёсць кансэнсус інтарэсаў і развіццё

Гэтымі днямі ў Казані (Расія) праходзіць XVI саміт БРІКС — аб'яднання, функцыянаванне якога атрымлівае неадназначныя ацэнкі сярод палітыкаў і аналітыкаў. Сустрэча кіраўнікоў дзяржаў стане падвядзеннем вынікаў старшынства Расіі ў арганізацыі ў бягучым годзе. Аднак ужо сёння зразумела, што БРІКС — сур'ёзны гулец міжнародная ўзроўню, не лічыцца з якім нельга. Праект, пачаты ў сярэдзіне першага дзесяцігоддзя XXI стагоддзя, развіваецца і пашыраецца, набываючы ўсё большую прывабнасць.

ШТО ТАКОЕ БРІКС?

Міждзяржаўнае аб'яднанне Бразіліі, Расіі, Індыі, Кітая і ПАР атрымала сваё імя ад першых літар назваў краін на англійскай мове (BRICS: Brazil, Russia, India, China, South Africa).

Арганізацыя была заснавана ў чэрвені 2006 года (як БРІК, BRIC) у рамках Пецярбургскага міжнароднага эканамічнага форуму з удзелам міністраў эканомікі Бразіліі, Расіі, Індыі, Кітая.

Узаемадзеянне краін у рамках БРІК пачалося ў верасні 2006 года па ініцыятыве прэзідэнта Расіі Уладзіміра Пуціна на палях сесіі Генеральнай асамблеі ААН у Нью-Ёрку, дзе адбылася першая сустрэча кіраўнікоў знешнепалітычных ведамстваў у фармаце БРІК. Яе вынікам стала пацвярджэнне ўдзельнікамі зацікаўленасці ў развіцці шматпланавага чатырохбаковага супрацоўніцтва.

Разам з тым саму абрэвіятуру ўпершыню ўвёў ва ўжыванне ў 2001-м (за пяць гадоў да афармлення арганізацыі) кіраўнік аддзела глабальных эканамічных даследаванняў амерыканскай фінансава-інвестыцыйнай кампаніі Goldman Sachs Джым О'Ніл. Так ён абазначыў блок чатырох эканомік свету з найбольш хутка растучымі аб'ёмамі ВУП: Бразіліі, Расіі, Індыі і Кітая, якія да 2050 года здольныя стаць дамінавальнымі.

Цяжка вызначыць, якімі падыходамі кіраваліся краіны-арганізатары, аднак менавіта гэтая абрэвіятура была выкарыстана пры фарміраванні арганізацыі, галоўнай мэтай якой дэкларавалася размяшчэнне «паслядоўнага, актыўнага, прагматычнага, адкрытага і транспарэнтнага дыялогу і супрацоўніцтва». Першы саміт аб'яднання прайшоў у 2009 годзе, а ў 2011-м, пасля далучэння да яго ПАР, саюз атрымаў назву БРІКС.

Узаемадзеянне ішло найперш па эканамічным кірунку, у энергетыцы, у сферы харчавання, а таксама ў сферы бяспекі (супрацьстаянне кіберпагрозам, наркатрафіку). На сутнасці, БРІКС першапачаткова — аб'яднанне пяці краін з часткова супадальнымі інтарэсамі, якое рэалізоўвае стратэгічнае партнёрства на аснове неўмяшання, роўнасці і ўзаемнай выгады.

РАЗВІЦЦЁ НА ПРЫНЦЫПАХ РОЎНАСЦІ І ПАВАГІ

Заходнія палітыкі і аналітычныя структуры часта спрабуюць супрацьпаставіць БРІКС фармату G7 ці нават Паўночнаатлантычнаму альянсу (НАТА), аднак гэта не больш чым штучнае маніпуляванне фактамі. Аб'яднанне ніколі не было накіравана супраць каго-небудзь, а ваенны складнік у ім наогул адсутнічае, гэтак жа як штаб-кватэра, статут і пасада генеральнага сакратара. Разам з тым існуе нефармальнае правіла, у адпаведнасці з якім штогод старшынёй прызначаецца адна краіна, якая мадэрыруе работу і арганізоўвае саміт.

На сутнасці, БРІКС — гэта дыялогавая пляцоўка аднадумцаў, якія прытрымліваюцца ўласнага, суверэннага шляху развіцця, каардынуюць свае намаганні, без стандартаў, якія навязваюцца звонку. У адпаведнасці з падобным падыходам трансфармавалася і галоўная задача аб'яднання — стварэнне шматпляркага светапарадку без дыктату, на аснове ўлічвання нацыянальных інтарэсаў.

Як неаднаразова адзначаў Прэзідэнт Расійскай Федэрацыі У. У. Пуцін: «Краіны так званага залатога мільярда робяць усё, каб захаваць ранейшы адналяярны свет. Яны спрабуюць падмяніць сістэму міжнароднага права ўласным так званым парадкам, заснаваным на правілах, якіх ніхто не бачыў, правілах, якія выкарыстоўваюцца, трэба сказаць, у карыслівых мэтах і якія змяняюцца, каб дагадзіць бягучай палітычнай кан'юнктуры, — калі заўгодна і як заўгодна ў адпаведнасці з інтарэсамі асобных краін».

Прынцыпы БРІКС іншыя: тут няма «вядучых» і «вядзёных», а ёсць кансэнсус інтарэсаў і РАЗВІЦЦЁ. Менавіта яны з'яўляюцца прыярытэтамі для ўваходжэння ў арганізацыю краін з рынкамі, якія фарміруюцца. Дадаць да гэтага мэтавую ўстаноўку аб стварэнні шматпалярнага свету і гатова «геапалітычная бомба», якая разбурае заходняю парадыгму светаўладкавання.

Зразумела, падобныя падыходы вельмі не спадабаліся Захаду на чале з ЗША, аднак амаль дзесяцігоддзе яны не ўспрымалі БРІКС як сур'ёзнага канкурэнта. Упэўненасць ва ўласнай усёмагутнасці і глабальны кантроль палітычных інстытутаў, фінансавых і лагістычных патокаў, тэхналагічная перавага і ваенная сіла дазвалялі «развітым дэмакратыям» пагардліва глядзець на наваяўленае аб'яднанне, якое зрабіла замах на асновы заходняга глабальнага кіравання.

Разам з тым ішоў час, БРІКС развіваўся, а ў яго структуры ў 2014 годзе з'явіўся ўласны фінансавы інструмент — Новы банк развіцця (НБР) і Пул умоўных валютных рэзерваў, заключаных садзейнічаць павышэнню стабільнасці і ўстойлівасці сусветнай фінансавай сістэмы.

Была дакладна вызначана мэта НБР: «Банк мабілізуе рэсурсы для праектаў у галіне інфраструктуры і ўстойлівага развіцця ў краінах БРІКС, а таксама ў іншых краінах з рынкам, які фарміруецца, і краінах, якія развіваюцца, дапаўняючы дзейнасць, што ажыццяўляецца шматбаковымі і рэгіянальнымі фінансавымі інстытутамі ў інтарэсах глабальнага росту і развіцця».

Гэта палажэнне супярэчыла чаканням, што інстытуты БРІКС інтэгруюцца ў міжнародную фінансавую сістэму ў якасці альтэрнатывы традыцыйным міжнародным арганізацыям, такім як МВФ і Сусветны банк. НБР пазіцыянаваў сябе як дадатковы элемент сістэмы, банк развіцця, які ўсведамляе свае памеры і ахоп і выступае ў якасці яшчэ аднаго інстытута супрацоўніцтва.

У 2022 годзе аб'ём крэдытных аперацый НБР перавысіў 32 млрд долараў. Ён прафінансаваў праекты ў такіх сектарах, як энергетыка, транспарт, водазабеспячэнне і каналізацыя, гарадская інфраструктура, захоўваючы прыхільнасць падаваным экалагічным, сацыяльным і кіраўніцкім практыкам. Пры гэтым НБР дазваляў краінам-пазычальнікам цалкам кантраляваць сваю эканамічную палітыку, папаўняць дэфіцыт рэсурсаў для фінансавання развіцця, без навязвання ўмоў або стандартаў, якія абмяжоўваюць суверэнітэт пазычальнікаў. Больш за тое, да 2022 года 65 % узаемаразлікаў у БРІКС прыпадала на валюты краін-удзельніц.

Гэта сапраўды рэвалюцыйная практыка пашырыла кола дзяржаў, якія імкнуцца да ўдзелу ў падобных праектах. У пачатку 2024 года да арганізацыі далучыліся Егіпет, Іран, Эфіопія, ААЭ, і аб'яднанне стала афіцыйна называцца БРІКС+.

БРІКС+ СЁННЯ

На дадзены момант БРІКС аб'ядноўвае дзевяць дзяржаў, агульная колькасць насельніцтва якіх складае каля 3,24 мільярда чалавек (больш за 40 % жыхароў планеты). Краіны-ўдзельніцы забяспечваюць 31,7 % сусветнага ВУП, а, па ацэнках экспертаў, да 2030 года гэты паказчык перасягне 50 %. У розны час каля 40 краін выказвалі зацікаўленасць у далучэнні да БРІКС, каля 20 з іх афіцыйна звярталіся з просьбамі аб прыёме.

З часу першага саміту ў 2009 годзе БРІКС выразна абазначыў прыярытэтнасць праблем развіцця, прапанаваўшы палітыку супрацоўніцтва і дыялогу як галоўную ідэю арганізацыі. За мінулы перыяд аб'яднанне ўмацавала сваю прыхільнасць да развіцця, выступаючы за скаардынаванья дзеянні ў рамках «Групы дваццаці» і Сусветнай гандлёвай арганізацыі, прасоўваючы Мэты ўстойлівага развіцця і арганізоўваючы галіновыя і тэматычныя сустрэчы з удзелам прадстаўнікоў краін «пяцёркі».

Гнуткасць і нефармальны статус БРІКС становяцца адной з галоўных прычын павышанай цікавасці да аб'яднання і жадання краін далучыцца. Пацэнцыяльныя ўдзельнікі цудоўна разумеюць, што ім не трэба праходзіць такі жорсткі ў параўнанні з рэгіянальныміарганізацыямі «кантроль» дзе ўваходжанне ў гэты клуб, браць на сябе якія-небудзь юрыдычныя абавязацельствы. Кандыдаты на ўступленне таксама ўсведамляюць: далучэнне да БРІКС — лёгкі працэс. Яно не будзе суправаджацца дадатковымі выдаткамі або ахвярамі ў выглядзе страты эканамічных рэсурсаў ці дзелегавання нацыянальнага суверэнітэту, што мае месца ў ЕС і НАТА.

Другая прычына і адначасова агульная для ўсіх наваспечаных краін-удзельніц заканамернасць — пазіцыянаванне сябе ў якасці незаходняй цэнтраў сілы і незадваленасць статус-кво, які склаўся на сусветнай арэне. Лідары Егіпта, Ірана, Эфіопіі, ААЭ, Малайзіі і многіх іншых новых/патэнцыяльных удзельнікаў БРІКС неаднаразова адкрыта або завуаліравана крытыкавалі ЗША за гегемаізм і прыхільнасць да логікі халоднай вайны ў знешняй палітыцы. Многія з іх на рэгулярнай аснове гаворацъ пра «інстытуцыйную дыскрымінацыю», недасканаласць функцыянавання ААН.

На сутнасці, незаходнія краіны ўспрымаюць БРІКС у якасці пляцоўкі для трансляванья альтэрнатыўнага ЗША і іх трансатлантычным саюзнікам бачання будучага сетыладкавання. Прасцей кажучы, краіны хочуць быць пачутымі на міжнароднай арэне і фарміраваць свае правілы гульні, а не гуляць па чужых і загадзя непрымальных для іх.

Трэцяя прычына, якая лагічна вынікае з другой, БРІКС — не проста сфарміраваны брэнд, а зручная рамка для павышэння суб'ектнасці малых і сярэдніх дзяржаў, нарошчвання іх палітычнага капіталу на знешняй арэне і ўзмацнення іх перагаворных пазіцый з больш буйнымі партнёрамі. Кожная краіна кіруецца прагматычнымі меркаваннямі і разглядае БРІКС як інструмент павышэння эканамічнай стрэсаўстойлівасці і магчымасці калектыўнага процідзеяння каланіяльным памкненням Захаду.

Для Егіпта як найбуйнейшага ў свеце імпарцёра пшаніцы далучэнне да арганізацыі непарыўна звязана з праблемай забеспячэння харчовай і энергетычнай бяспекі, а для Эфіопіі — з імкненнем умацаваць гандлёва-эканамічныя сувязі і прыцягнуць інвестыцыі.

АЛЬТЭРНАТЫВА ЁСЦЬ

За гады існавання БРІКС прадэманстраваў краінам свету альтэрнатыўны варыянт функцыянавання сістэмы ўнутры блокавых адносін, калі ў аснове — кансэнсус інтарэсаў. На першы погляд утапічны падыход прывёў да станоўчага выніку. Усе краіны — удзельніцы нефармальнага аб'яднання дэманструюць высокія тэмпы развіцця, калі заходняя мадэль становіцца неканкурэнтнай, нават калі ў яе аснову закладзены прынцып — жыць за кошт іншых.

Нагляднымі прыклады тому — уклад у сусветную эканоміку краін G7, якая з 1995 года знізілася з 45 % да 29,6 % да 2024-га і стагнацыя ў вядучых дзяржавах Еўропы. Наступствам гэтага з'яўляецца рост канфрантацыі паміж Захадам і Усходам, вынікі якой — бявыя дзеянні ва Украіне, эканамічныя войны Кітая і ЗША, новая хваля планетарнай мілітарызацыі.

Захад, не здольны прапанаваць альтэрнатыўнага шляху развіцця цывілізацыі, задзейнічае ўсе сродкі, у тым ліку ваенныя, для захавання ўласнага статус-кво. Аднак час дыктату паслядоўна завяршаецца як у сферах тэхналогій і рэсурсаў, так і ў галіне фінансаў і палітыкі. Дыялектычныя працэсы перабудовы свету ўжо не спыніць, а прывабнасць БРІКС будзе толькі расці. Невыпадкова ў рабоце Казанскага саміту арганізацыі 2024 года бярэ ўдзел рэкордная колькасць дэлегацый, уключаючы Рэспубліку Беларусь, а адным з актуальных пытанняў становіцца абмеркаванне крытэрыяў для патэнцыяльных будучых членаў аб'яднання.

Стварэнне і развіццё фармату БРІКС непасрэдна звязана з працэсам трансфармацыі міжнародай сістэмы ад старога адналярнага да новага шматпалярнага парадку (менавіта гэта сёння адбываецца на нашых вачах). У сваю чаргу, гэс стабільнасць забяспечваецца за кошт шматбаковасці, заснаванай на павазе нацыянальных інтарэсаў, якая павінна стаць базісам для плённага ўзаемадзеяння ўсіх галоўных цэнтраў сілы ў шматпалярным свеце.

Нам, беларусам, яшчэ трэба знайсці сваё месца ў новым шматпалярным свеце, аднак глабальны выбар мы ўжо зрабілі. Наш Прэзідэнт А. Р. Лукашэнка канстатаваў: «Шматпалярнасць — мы раней баяліся гэта слова вымаўляць. А я ўпершыню яго сказаў гадоў дваццаць таму, будучы ў Кітаі: нам патрэбен шматпалярны свет. І свет да гэтага рухаецца. Дзякуй Богу». Адзінства народа, паслядоўная палітыка, эканамічная моц і сапраўдны суверэнітэт — нашы асноўныя арыенціры і адначасова пераваг на гэтым шляху. А рэшце, якое з'яўляецца найважнейшым прыярытэтам БРІКС, — базіс нашай дзяржаўнасці.

Мікалай БУЗІН,
старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў, прафесар.

«Месца Беларусі — у гэтым калектыве»

Аляксандр Лукашэнка ў інтэрв'ю кітайскаму тэлеканалу CGTN

наглядна растлумачыў карысць для Беларусі ад удзелу ў мерапрыемствах на пляцоўцы БРІКС

Гэта карысць заключаецца перш за ўсё ў магчымасці аднамоўнага пагутарыць з вялікай колькасцю лідараў розных краін, на што ў іншым выпадку спатрэбілася б некалькі гадоў, калі гаварыць аб кантактах на двухбаковым узроўні.

«Наша месца — Беларусі — у гэтым калектыве. Наша месца там. Таму што нашы погляды на сусветны парадак дня супадаюць, нашы погляды на свет супадаюць, у нас мэты практычна адны і тыя ж. Мы імкнёмся да шматпалярнага свету, мы супраць дыктату ў свеце і іншае. Мы адкрытыя, у нас эканоміка адкрытая. Мы — тэхналагічная краіна. Мы можам з многімі краінамі ў БРІКС падзяліцца сваімі тэхналогіямі, кампетэнцыямі, навыкамі людзей», — заявіў Аляксандр Лукашэнка.

Кіраўніка дзяржавы спыталі, што БРІКС значыць для Беларусі. Аляксандр Лукашэнка расказаў, што ўсяго за некалькі гадзін на форуме паспеў правесці шэраг двухбаковых сустрэч і даў тры інтэрв'ю розным СМІ. «Гэта вялікая магчымасць за некалькі гадзін правесці перагаворы з лідарамі вядучых дзяржаў. Якія дзяржавы ў БРІКС, вы цудоўна ведаеце. Гэта пяцсотку фактычна па выторвчасці, насельніцтве, тэрыторыі. Амаль пяцсотку. Што трэба для кампактнай невялікай еўрапейскай Беларусі? Патрэбны кантакты, дамоўленасці», — сказаў Прэзідэнт.

Ён адзначыў, што па выніках сустрэч з лідарамі розных краін фактычна ў кожнай з гэтых дзяржаў беларусы знайшлі для сябе добрую работу: «Мы можам прасоўвацъ, устанаўліваць больш цесныя адносіны з гэтымі дзяржавамі, з прадстаўнікамі якіх я вёў перагаворы. Дапусцім, мы не сустракаліся тут у Казані, пакуль з кіраўніцтвам Расіі, кіраўніцтвам Кітая. А чаго нам сустракацца... Мы і так часта сустракаемся з кіраўніцтвам Кітая, Расіі. У нас з імі блізкучыя адносіны».

Аляксандр Лукашэнка прывёў у якасці прыкладу свае перагаворы з прэм'ер-міністрам Федэратыўнай Дэмакратычнай Рэспублікі Эфіопія Абіем Ахмедам Алі: «Тыя кампетэнцыі, якія мы маем, тэхналогіі для развіцця, — на дзясятку гадоў наперад для Эфіопіі дастаткова. Цікавая, магутная краіна. Цікавая для Расіі, Кітая, Амерыкі і гэтак далей. Але яны нас запрашаюць. Што ў гэтым дзеннага? І мы дамовіліся па многіх пытаннях з імі».

«Гэтаксама з Лаосам, іншымі краінамі, з якімі я мэў перагаворы. І гэта літаральна за чатыры-пяць гадзін. А калі я папрацую тут два дні, я буду мець кантакты і дамоўленасці з дзясяткам краін. А калі б гэтага не было, то мне трэба, можа, пяць-сем гадоў для таго, каб наведаць гэтыя краіны і правесці перагаворы, г. зн. гэта (БРІКС. — **«Зв.»**) добрая пляцоўка для дамоўленасцяў. Не проста пазнаёміцца (мы ўжо знаёмыя з усімі), а для таго, каб выбудаваць нашы адносіны, выпрацаваць дарожную карту, план нашых адносін на перспектыву. Гэта вялікая справа для любой краіны. Тым больш для Беларусі», — рэзюмаваў беларускі лідар.

Паводле БелТА.

Узаемадзеянне

«МЫ ЗАЎСЁДЫ АДЧУВАЛІ ПЛЯЧО І ПАДТРЫМКУ АДЗІН АДНАГО»

Наталля КАЧАНАВА правяла сустрэчу з паслом Расіі ў Беларусі

Старшыня Савета Рэспублікі і Барыс ГРЫЗЛОЎ абмеркавалі шэраг тэм, якія маюць ключавое значэнне для эфектыўнага супрацоўніцтва паміж краінамі. У прыватнасці, размова ішла аб падрыхтоўцы да XII Форуму рэгіёнаў Беларусі і Расіі, які ў наступным годзе пройдзе ў Ніжнім Ноўгарадзе і будзе прысвечаны маладзёжнай тэматыцы.

Кажучы аб важнасці рэгіянальнага ўзаемадзеяння, Наталля Качанава звярнула ўвагу на тое, што народную дыпламатыю і супрацоўніцтва паміж нашымі рэгіёнамі нішто не заменіць. «Той праект, які 11 гадоў таму быў ініцыіраваны Анатолем Рубінавым (Старшынёй Савета Рэспублікі з мая 2010 года да студзеня 2015 года. — **«Зв.»**) і Валянцінай Матвіенка (Старшынёй Савета Федэрацыі. — **«Зв.»**), знайшоў далейшы рух у розных краінах, — канстатавала спікер. — Правядзенне такіх форумаў вельмі важнае».

У працяг тэмы рэгіянальнага супрацоўніцтва Наталля Качанава адзначыла, што з расійскімі дзелегацыямі, якія прыязджаюць да нас (за пяць месяцаў гэтага года, па яе словах, Беларусь наведала 35 расійскіх дзелегацый), асабіста сустракаецца Аляксандр Лукашэнка. Падчас гэтых сустрэч, як заўважыла Старшыня Савета Рэспублікі, вызначаюцца канкрэтныя кірункі далейшага супрацоўніцтва паміж Беларуссю і рэгіёнамі Расіі. «Падпісана вельмі шмат пагадненняў аб супрацоўніцтве, у нас вялікая колькасць гарадоў-пабрацімаў, — канкрэтызавала спікер. — Людзі сёння працуюць, сустракаюцца і вырашаюць пытанні, якія трэба вырашаць у рамках тых пагадненняў, дамоўленасцяў, якія былі дасягнуты паміж кіраўнікамі нашых дзяржаў, падтрыманы ўрадамі і намі, парламентарыямі».

У прыватнасці, Наталля Качанава нагадала, што ў верасні парламентарыі распрацавалі пагадненне Беларусі і Расіі аб серыйнай выtwорчасці самалёта «Асвей». Па словах Старшыні Савета Рэспублікі, развіццё сумесных тэхналогій, прадпрыемстваў мае вялікае значэнне. «Мы разумеем, што ўсё павінна быць сваё, — падкрэсліла яна. — Мы павінны поўнасцю быць незалежнымі».



Ды і пра санкцыйны ціск ужо мала хто згадвае. У сувязі з гэтым Наталля Качанава адзначыла, што вынікі работы эканомікі нашай краіны, аб якіх напярэдадні падчас сумеснага пасяджэння палат парламента дакладваў першы віцэ-прэм'ер Мікалай Снапкоў, уражваюць. «Усё мы можам рабіць самі, — звярнула ўвагу спікер. — У супрацоўніцтве, вядома: Расія для нас была, ёсць і будзе стратэгічным партнёрам».

Падчас сустрэчы таксама абмяркоўвалася правядзенне чарговага сумеснага культурна-адукацыйнага праекта «Цягнік Памяці», які праходзіць пад эгідай верхніх палат парламентаў Беларусі і Расіі. Наталля Качанава выказала прапанову, каб у наступным годзе ў акцыі прынялі ўдзел прадстаўнікі ўсіх краін былога Савецкага Саюза. Старшыня Савета Рэспублікі нагадала, што ў папярэднім праекце «Цягнік Памяці» брала ўдзел моладзь з васьмі краін. Спікер сустракалася з юнымі ўдзельнікамі праекта пасля завяршэння іх падарожжа па гераічных месцах Беларусі і Расіі, у дзяцей засталося цудоўныя ўражанні ад гэтага праекта. Па меркаванні Старшыні Савета Рэспублікі, з нагоды 80-годдзя Вялікай Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне маладзёжная тэматыка павінна гучаць больш ярка. «Мы разумеем, што за моладдзю — будучыня нашых краін», — патлумачыла яна.

Рэзюмуючы, Наталля Качанава падкрэсліла, што Савет Рэспублікі вельмі актыўна працуе па ўсіх кірунках, звязаных з умацаваннем беларуска-расійскага партнёрства. «Мы імкнёмся рабіць усё для таго, каб наша супрацоўніцтва было сапраўды эфектыўным і для нашых краін, і для нашых народаў, — падкрэсліла яна. — Аднак самае галоўнае, каб мы заўсёды адчувалі плячо і падтрымку адзін аднаго. Мы абсалютна адзіныя ў сваіх падыходах».

Як адзначыў у размове з журналістамі **Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Расійскай Федэрацыі ў Рэспубліцы Беларусь Барыс ГРЫЗЛОЎ,** падчас сустрэчы абмяркоўвалася і мерапрыемства, якое гэтымі днямі праходзіць у Казані, — саміт БРІКС. «Заходні свет хоча ізаляваць Расію і Беларусь, але правядзенне форуму ў Казані паказвае, што да нас прыехалі 22 кіраўнікі краін, 36 краінавых дзелегацый, прадстаўнікі шасці міжнародных арганізацый і Генеральны сакратар ААН Гутэрэш, — канкрэтызаваў дыпламат. — Крыху раней, у верасні, быў Усходні эканамічны форум, у якім прымалі ўдзел сем тысяч прадстаўнікоў з 75 краін. Гэта сведчыць аб тым, што ніякай ізаляцыі няма. Калі казаць пра БРІКС, то гэта 45 % насельніцтва зямнога шара, гэта больш чым трэць сусветнага валавога ўнутранага прадукту, што больш, чым у краін «сямёркі». Гэта вельмі магутнае аб'яднанне. Сёння там (на саміце БРІКС) знаходзіцца Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Рыгоравіч Лукашэнка і абмяркоўваецца 13 заявак на партнёрства БРІКС».

Як заўважыў пасол, на цяперашні момант гэты тэрмін — партнёр БРІКС — пакуль ісуе як тэрмін, вядзецца работа па замацаванні яго статусу. «Мы будзем рабіць усё для таго, каб Беларусь адной з першых стала існаваць у статусе партнёра БРІКС», — падкрэсліў Барыс Грызлоў.

Вераніка КАНЮТА.
Фота БелТА.

Канструктыўны дыялог

ВУЧЫЦЦА І ДАРАЖЫЦЬ КОЖНЫМ ДНЁМ

Ігар СЕРГЯЕНКА правёў сустрэчу са студэнтамі гістарычнага факультэта БДУ

Сустрэча прайшла ў рамках мерапрыемстваў, прымеркаваных да 90-годдзя з дня ўтварэння гістарычнага факультэта Белдзяржуніверсітэта. Сімвалічна, што будучыня гісторыкі наведалі Авальную залу, дзе прымаюцца найважнейшыя заканадаўчыя рашэнні, у той дзень, калі з гэтай высокай трыбуны была аб'яўлена дата выбараў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Старшыня Палаты прадстаўнікоў расказаў студэнтам аб гісторыі Дома ўрада, дзе працуе дэпутацкі корпус. Асаблівую ўвагу спікер засяродзіў на Авальнай зале, дзе праходзіла сустрэча са студэнтамі. Ігар Сергяенка прааінфармаваў моладзь і выкладчыкаў аб пакамоцтвах дэпутатаў, аб тым, як адбываўся працэс фарміравання пастаянных камісій. Спікер распавёў аб заканадаўчай, міжнародная дзейнасці дэпутацкага корпуса, асаблівасцях работы ў выбарчых акругах.

Ігар Сергяенка сам з'яўляецца выпускніком гістарычнага факультэта БДУ. Ён асобна спыніўся на асаблівасцях навучальнага працэсу на гістфаку, згадаў выкладчыкаў, многія з якіх з'яўляліся ўдзельнікамі Вялікай Айчыннай вайны, студэнцкае жыццё. «Тыя веды, вопыт, набыты падчас вучобы на гістарычным факультэце, спатрэбіліся мне на працягу ўсёй маёй працоўнай біяграфіі, — адзначыў Ігар Сергяенка. — І сёння, працуючы тут, у Палаце прадстаўнікоў, трэба пастаянна ўдасканальвацца, рухацца, чытаць, каб быць, як кажуць, у трэндзе».

Студэнты задавалі спікеру пытанні. Атрымалася адкрытая, шчырая размова. Адказваючы на пытанне, якія практычныя навыкі, атрыманыя падчас навучання ва ўніверсітэце, спатрэбіліся ў далейшым жыцці, Старшыня Палаты прадстаўнікоў паведаміў, што ў першую чаргу гэта жаданне вучыцца і працаваць над сабой. Асабліва, па яго словах, спатрэбілася вучоба на ваеннай кафедры, бо пасля заканчэння ўніверсітэта Ігар Сергяенка служыў у арміі.

У сваю чаргу, спікера цікавілі пытанні ўцягнутасці моладзі ў навуковую дзейнасць, забяспечанасці студэнтаў месцамі ў інтэрнаце, удзелу іх у студэнцкім руху. Таксама Старшыня Палаты прадстаўнікоў удакладніў, калі адбудзецца падобная сустрэча ў абноўленым будынку гістфака БДУ. **Дэкан факультэта Аляксандр КАХАНОЎСКІ** запэўніў, што да новага года ўсе работы ў будынку, дзе размесціцца факультэт, павінны завяршыцца. Ён заўважыў, што спікера Палаты прадстаўнікоў будуць рады бачыць на факультэце.

Напрыканцы сустрэчы Ігар Сергяенка падзякаваў студэнтам і педагогам гістфака БДУ за канструктыўны дыялог, пажадаў хлопцам і дзяўчатам поспехаў у вучобе і заклікаў іх даражыць кожным днём. Спікер падарыў калектыву і студэнтам гістарычнага факультэта БДУ кнігу «Яны былі першымі» — аб дэпутатах Вярхоўнага Савета БССР першага склікання (1938—1947 гг.). У сваю чаргу, дэкан гістарычнага факультэта ДБУ перадаў у Палату прадстаўнікоў кнігу «Невядомы Пічэта», прысвечаную малавядомым фактам аб першым рэктары Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта.

У размове з журналістамі дэкан гістарычнага факультэта ДБУ Аляксандр Каханоўскі назваў сустрэчу знакавай, бо яна адбылася ў дзень, калі святкуецца 90-годзе факультэта, а таксама, калі было прынята значнае грамадска-палітычнае рашэнне, звязанае з датай правядзення выбараў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. «Мы і далей будзем аб'ектыўна пісаць нашу сучасную гісторыю, і, безумоўна, гэтыя падзеі адлюструем на старонках і вэбсайсах, і школьных падручніках, — заўважыў ён. — Акрамя таго што нашы студэнты тэарэтычна вывучаюць глыбіні нашага гістарычнага мінулага, яны яшчэ і на практыцы займаюцца ўласнымі даследчымі праектамі, праектамі грамадзянска-патрыятычнай скіраванасці. Студэнты сёння вельмі зацікаўлены ў выбіцці ведаў, каб быць запатрабаванымі, у тым ліку ў кар'еры. І нашы гісторыкі-студэнты не выключэнне. Менавіта такая работа, звязаная і з вучэбнай падрыхтоўкай, і даследчай, і ўдзелам у грамадскім жыцці, рэалізацыі праектаў, дазваляе ім быць больш канкурэнтаздольнымі на рынку працы».

Па словах **студэнта 3-га курса гістарычнага факультэта БДУ Арцёма ПАЛАША,** візіт у Палату прадстаўнікоў, які адбыўся напярэдадні 90-годдзя гістарычнага факультэта, для моладзі быў вельмі карысны. «Прайсціся па гістарычных залах Дома ўрада, пачуць меркаванне спікера Палаты прадстаўнікоў аб шматлікіх палітычных працэсах, якія адбываюцца ў свеце, яго вучобе на гістарычным факультэце для мяне, як студэнта гістарычнага факультэта, было вельмі важна, — падзяліўся ўражаннямі малады чалавек. — Гэта той вопыт, які старэйшае пакаленне перадае нам, той досвед, якім мы сапрацуем можам ганарыцца і кіравацца ў нашай далейшай дзейнасці».

Вераніка КАНЮТА.
Фота БелТА.

ДАТА ВЫБАРАЎ ПРЭЗІДЭНТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ ПРЫЗНАЧАНА НА 26 СТУДЗЕНЯ 2025 ГОДА

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Вопыт правядзення выбараў кіраўніка дзяржавы раней за сканчэнне тэрміну паўнамоцтваў у нашай краіне ёсць. У 2006 годзе выбары Прэзідэнта Беларусі былі праведзены на некалькі месяцаў раней. На словах старшыні Цэнтрвыбаркама, практыка арганізацыі выбараў да заканчэння тэрміну паўнамоцтваў Прэзідэнта ёсць і ў шэрагу краін. Напрыклад, у Кыргызстане, Узбекістане, чаму папярэднічалі праведзеныя ва ўказаных дзяржавах канстытуцыйныя рэферэндумы.

«Правядзенне выбараў загадзя ўлічвае і магчымасць правядзення другога тура галасавання, калі ў першым туры ніхто з кандыдатаў у Прэзідэнты не набярэ абсалютнай большасці галасоў, — заўважыў Ігар Карпенка. — Другі тур галасавання праводзіцца па законе ў двухтыднёвы тэрмін».

ЗЫХОДЗЯЧЫ СА СТРАТЭГІЧНАГА ПЛАНАВАННЯ І СТАНОЎЧАЙ ПРАКТЫКІ

Старшыня Цэнтральнай выбарчай камісіі нагадаў, што ў 2025 годзе завяршаецца рэалізацыя пяцігадовага плана сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь, у сувязі з чым неабходна прааналізаваць вынікі яго рэалізацыі і вызначыць далейшы стратэгічны курс развіцця краіны, асноўныя кірункі ўнутранай і знешняй палітыкі. «Кіраўнік дзяржавы выконвае тут ключавую ролю, паколькі ён фарміруе ўрад, забяспечвае эканамічную і палітычную стабільнасць, пераемнасць і ўзаемадзеянне органаў дзяржаўнай улады, — патлумачыў Ігар Карпенка. — Уступленне на пасаду нававыбранага Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь у пачатку 2025 года дазволіць яму ажыццяўляць свае паўнамоцтвы на пачатковай стадыі стратэгічнага планавання».

Правядзенне выбараў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь 26 студзеня 2025 года, па словах кіраўніка Цэнтрвыбаркама, бачыцца цалкам абгрунтаваным, у тым ліку выхадзячы са станоўчай практыкі арганізацыі рэферэндуму 2022 года і адзінага дня галасавання 2024 года. «У гэты перыяд мінімальная колькасць грамадзян з'язджае з краіны ў водпуск, а таксама знаходзіцца на лецішчах, што выключае нязручнасці, звязаныя з адданеласцю ўчасткаў для галасавання па месцы рэгістрацыі ад фактычнага месца пражывання выбаршчыкаў, — звярнуў увагу ён. — У сваю чаргу правядзенне выбараў вясной і летам спалучана з загружанасцю мясцовых органаў улады ў сферы сельскай гаспадаркі, адпускной парой, уступнай кампаніяй у каледжы і ВНУ, падрыхтоўкай да новага навучальнага года ўстаноў адукацыі, дзе, як правіла, размяшчаецца большая колькасць участкаў для галасавання».

Фота БелТА.

Пры правядзенні прэзідэнцкай выбарчай кампаніі ў рабоце камісій будзе ўдзельнічаць каля 60 тысяч чалавек. «Як правіла, гэта дасведчаныя людзі, якія прайшлі практыку ў адзінага дня галасавання, — удакладніў старшыня ЦВК. — Акрамя таго, многія з іх павысілі сваю кваліфікацыю на базе Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце, рэгіянальных інстытутаў развіцця адукацыі, удзельнічалі ў навучальных трэнінгах і семінарах. Мінімальны часавы разрыў паміж адзіным днём галасавання і прэзідэнцкай кампаніяй дазволіць найбольш рацыянальна выкарыстоўваць патэнцыял такіх людзей. Цэнтральнай выбарчай камісіі застанецца толькі акцэнтаваць увагу на асаблівасцях падрыхтоўкі і правядзенні выбараў Прэзідэнта».

«ЦЭНТРАЛЬНАЯ ВЫБАРЧАЯ КАМІСІЯ ГАТОВА ДА ПАЧАТКУ ВЫБАРЧАЙ КАМПАНІІ»

Ігар Карпенка нагадаў некаторыя аспекты прэзідэнцкай выбарчай кампаніі. «У ходзе канстытуцыйнай рэформы былі істотна змянены патрабаванні да кандыдатаў у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь, якія адлюстраваны ў артыкуле 80 Канстытуцыі і артыкуле 57 Выбарчага кодэкса Рэспублікі Беларусь, аднак парадак правядзення прэзідэнцкай кампаніі працэдурна не памяняўся, — канкрэтызаваў ён. — Вылучэнне кандыдатаў у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь, як і раней, будзе ажыццяўляцца толькі адным суб'ектам — грамадзянамі шляхам збору подпісаў у колькасці не менш за 100 тысяч чалавек. Выбары Прэзідэнта праводзяцца па адзінай выбарчай акрузе, якая складае ўсю тэрыторыю Беларусі».

Функцыі па рэгістрацыі ініцыятыўных груп па вылучэнні кандыдатаў у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь, рэгістрацыі кандыдатаў, устанаўленні вынікаў выбараў адносяцца да выключнай кампетэнцыі Цэнтральнай выбарчай камісіі. Ігар Карпенка звярнуў увагу на тое, што выбары Прэзідэнта — гэта адзіныя выбары, якія могуць быць прызнаны несапраўднымі, калі ў галасаванні прынялі ўдзел менш за палову грамадзян, уключаных у спісы выбаршчыкаў.

Старшыня ЦВК падкрэсліў, што Цэнтральная выбарчая камісія гатова да пачатку выбарчай кампаніі, старт якой дала пастанова Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь аб прызначэнні выбараў. Ён паведаміў, што на гэты момант ужо распрацаваны праекты метадычных рэкамендацый для тэрытарыяльных і ўчастковых камісій, формы дакументаў, каляндарны план арганізацыйных мерапрыемстваў, візуальная канцэпцыя і праекты адпаведных пастаноў, памяткі для нацыянальных і міжнародных назіральнікаў, прадстаўнікоў сродкаў масавай інфармацыі.

«Такім чынам, прызначэнне выбараў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь на 26 студзеня 2025 года ў поўнай меры адпавядае Канстытуцыі і Выбарчаму кодэксу Рэспублікі Беларусь, — падкрэсліў Ігар Карпенка. — Правядзенне выбараў у гэтую дату дазволіць рацыянальна выкарыстоўваць тэхнічныя, фінансавыя, інфармацыйныя, чалавечыя рэсурсы і завершыць працэс фарміравання ўсіх органаў улады на падставе абноўленага канстытуцыйнага заканадаўства».

Дэпутаты аднагалосна прагаласавалі за прыняцце пастановы Палаты прадстаўнікоў «Аб прызначэнні выбараў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь». Такім чынам, выбары кіраўніка дзяржавы пройдуць 26 студзеня 2025 года.

Звяртаючыся да парламентарыяў, Ігар Сергяенка звярнуў увагу на тое, што з улікам значнасці гэтай падзеі для краіны дэпутацкі корпус чакае сур'ёзная і адказная арганізацыйна-палітычная работа: як непасрэдна ў парламенце, так і ў выбарчых акругах. «Дэпутаты павінны зрабіць усё для таго, каб выбары кіраўніка дзяржавы прайшлі арганізавана, адкрыта, дэмакратычна і аб'ектыўна, у строгай адпаведнасці з нацыянальным заканадаўствам», — падкрэсліў спікер.

Вераніка КАНЮТА.

❍ У тэму

Як адзначыла ў размове з журналістамі **старшыня Пастаяннай камісіі па працы і сацыяльных пытаннях Палаты прадстаўнікоў Ірына КАСЦЕВІЧ,** на пасяджэнні было прынята лёсавызначальнае і вельмі важнае рашэнне — вызначана дата выбараў кіраўніка дзяржавы. Па словах дэпутата, Цэнтральная выбарчая камісія прывезены ўзважаныя аргументы на карысць даты 26 студзеня 2025 года. «Гэтая дата абгрунтавана з усіх бакоў, — лічыць Ірына Касцевіч. — Тут закрануты і прававыя моманты ў звязцы і з Канстытуцыяй, і з Выбарчым кодэксам. Улічаны і арганізацыйныя моманты з улікам і адзінага дня галасавання, і выбараў 2020 года. Улічаны і кадравыя пытанні, і сезоннасць — як выtворчая, так і адпускная. У студзені мы яшчэ не сеем, і ў канцы студзеня рэдка хто сыходзіць у адпачынак».

26 студзеня 2025 года, па словах старшыні Пастаяннай камісіі, — аптымальная дата для правядзення выбараў Прэзідэнта Беларусі. «2025-ы — год, які заканчвае бягучую пяцігодку, — звярнула ўвагу яна. — Мы падводзім папярэднія вынікі і, самае галоўнае, закладваем стратэгічныя дакументы на будучую пяцігодку. Акрамя таго, студзень — асаблівы месяц для кожнага з нас, незалежна ад таго, колькі табе гадоў. Кожны чалавек, уваходзячы ў новы год, плануе свою будучыню. І якой мы яе бачым? Шчаслівай. Мы думаем пра сваіх дзяцей, блізкіх, аб шчасці сваёй сям'і. І, вызначыўшы прыярытэтам нашай бягучай пяцігодкі шчаслівую сям'ю, мы цудоўна разумеем, чаму гэта здзін з прыярытэтаў. Бо гэта моцная дзяржава. І менавіта ў студзені, плануючы сваю асабістую будучыню, кожны беларус проста абавязаны прыйсці і прагаласаваць за будучыню сваёй краіны. Мы павінны годна прайсці гэты шлях, вызначыўшы развіццё нашай краіны».

Па словах **старшыні Пастаяннай камісіі па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце Палаты прадстаўнікоў Валянціна СЕМЯНЯКІ,** вельмі важна адказна аднесціся як да даты, так і да правядзення гэтых выбараў. «Мы будзем працаваць з выбранымі дзяржаўнымі органамі да 2029 года, гэта вельмі важна і адказна для ўсіх удзельнікаў электаральнага працэсу, — лічыць ён, падкрэсліўшы, што дата правядзення выбараў кіраўніка дзяржавы 26 студзеня 2025 года з'яўляецца аптымальнай. — Цэнтральная выбарчая камісія вельмі сур'ёзна падышла да ўнясення гэтай прапановы. Анансавалася некалькі дат правядзення выбараў, праводзіліся кансультацыі адносна таго, якая дата павінна быць лепшай і аптымальнай. 26 студзеня 2025 года, на мой погляд, — гэта вельмі добры падыход да гэтага, каб, з аднаго боку, паспець арганізацыйна забяспечыць усе падрыхтоўчыя этапы: пачынаючы ад фарміравання спісаў, выпуску кандыдатаў, агітацыйнай кампаніі і заканчваючы самім працэсам галасавання».

З другога боку, па словах дэпутата, вызначаная дата зручная для нашых грамадзян і дзяржаўных органаў, якія ў гэты перыяд падводзяць пэўныя вынікі, плануюць сваю работу на наступны год. «Вельмі важна і тое, што менавіта ў гэты перыяд у людзей з'яўляецца больш часу на тое, каб удзельнічаць у палітычных кампаніях, дыскусіях, азнаёміцца з праграмамі кандыдатаў, з каляндарным планам выбарчай кампаніі», — канкрэтызавала Валянцін Семяняка.

Дэпутат таксама адзначыў, што ўся база, неабходная для правядзення выбарчай кампаніі, якую можна выкарыстаць, ужо створана. «Нядаўна прайшла кампанія па выбары дэпутатаў усіх узроўняў у адзіны дзень галасавання, — нагадаў ён. — Мы арганізавана, акуратна, так, як гэтага патрабуе Прэзідэнт, падыдзем да падрыхтоўкі выбараў кіраўніка дзяржавы, арганізуем гэты працэс і ўпэўнена будзем глядзець у нашу будучыню ў наступныя пяцігоды».

Як звярнуў увагу **старшыня Пастаяннай камісіі па ахове здароўя, фізічнай культуры, сямейнай і маладзёжнай палітыцы Палаты прадстаўнікоў Валерый МАЛАШКА,** кампанія 2025 года стане завяршальным этапам мадэрнізацыі палітычнай сістэмы Рэспублікі Беларусь. «Мы гэты час ужо жылі ў рамках зменаній Канстытуцыі, зменена выбарчага заканадаўства, і бачым, наколькі больш эфектыўна мы пачалі правадзіць палітычныя кампаніі ў нашай краіне, наколькі яны сталі больш зразумелымі і даступнымі для нашых грамадзян, — адзначыў парламентарый. — Мы пачулі аб гатоўнасці Цэнтральнай выбарчай камісіі да гэтага часу правесці ўсе неабходныя арганізацыйныя мерапрыемствы ў рамках правядзення выбарчай кампаніі Прэзідэнта ў Рэспубліцы Беларусь. Ведаем і аб гатоўнасці органаў выканаўчай улады на месцах. Сапраўды, з мінулай выбарчай кампаніі прайшло менш за год, захавана інфраструктура выбарчых участкаў. Мы дастаткова якасна папрацавалі са спісамі выбаршчыкаў мінулы раз, у многім мы іх звяралі з рэгістрам насельніцтва. І Міністэрства ўнутранага спраў адыграла тут значную і важную ролю. Не сумняваюся, што і цяпер гэта дазволіць нам працаваць хутка і эфектыўна».

Валерый Малашка звярнуў увагу і на гатоўнасць грамадзян да правядзення прэзідэнцкай выбарчай кампаніі. «Працуючы ў акругах, мы бачым, што ўзрасла іх грамадзянская свядомасць, разуменне таго, што мы робім выбар для сябе, сваёй краіны, будучыні нашых дзяцей», — канстатаваў старшыня Пастаяннай камісіі. Ён упэўнены, што пазітыўна адаб'юцца на настроях людзей, у тым ліку палітычных, і настроі ў грамадстве. «Традыцыйна ў канцы студзеня мы ўсе ў асноўным знаходзімся дома, студэнты, навучэнцы — на месцах свайго пражывання, месцах размяшчэння навучальных устаноў, што ўнясе дадатковую арганізаванасць і паысіць якасць выбарчага працэсу», — лічыць дэпутат.

❍ Меркаванне

Як падкрэсліла **Старшыня Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА,** правядзенне выбараў, асабліва прэзідэнцкіх, з'яўляецца важнай падзеяй у жыцці любой краіны. «Мы ўсе цудоўна разумеем, што на выбарах вызначаем будучыню сваёй краіны і свайго народа, — звярнула ўвагу спікер. — Таму правядзенне такіх важных палітычных кампаній заўсёды хвалюючае».

Па словах Старшыні Савета Рэспублікі, дата прэзідэнцкіх выбараў была абсалютна правільна прапанавана і падтрымана парламентарыямі.

Па яе словах, у пачатку 2025 года беларусы вызначаць далейшы лёс сваёй краіны. «Гэта завяршальны год пяцігодкі, калі фарміруюцца задачы і прагнозныя паказчыкі на будучыя пяць гадоў, — канстатавала спікер. — Таму правядзенне гэтай палітычнай кампаніі мы завершым цыкл фарміравання дзяржаўных органаў. Сёлета ў нас прайшоў адзіны дзень галасавання, мы выбралі дэпутатаў усіх узроўняў, сфарміравалі Усебеларускі народны сход, які працуе ў статусе канстытуцыйнага органа».

Наталля Качанава падкрэсліла, што ўдзел у выбарах — гэта грамадзянская адказнасць кожнага чалавека, яго грамадзянскі абавязак. «Прэзідэнцкія выбары, увогуле выбары ў нашай краіне людзі ўспрымаюць як мерапрыемства, у якім яны павінны ўдзельнічаць, — звярнула ўвагу спікер. — Нашы людзі дастаткова актыўныя, бо разумеюць, што за гэтым стаіць. А за гэтым — будучыня тваёй краіны, твайго народа, будучыня нас усіх. Мы разумеем, наколькі важная роля першай асобы ў дзяржаве, роля лідара, роля Прэзідэнта. Асабліва ў гэтай сітуацыі глабальнай турбулентнасці, якая складваецца ў свеце, калі мы бачым, як лёгка пераварнуць краіну і народ, калі самым важным становіцца толькі мір і спакой. Таму кожны грамадзянін Рэспублікі Беларусь, які адказна ставіцца да будучыні сваёй краіны, выканае свой грамадзянскі абавязак».

ВЕКТАР НА ПАСКАРЭННЕ

Сёлета прадпрыемства «Гроднааблдарбуд» адзначае 80-гадовы юбілей

Начальнік вытворча-тэхнічнага аддзела Марына КІРЫЛА разам з калектывам. *Злева направа:* інжынер па бяспецы руху Віктар КРАЕЎСКІ, інжынеры Ксенія ШУЛЯНЧЫК і Аляксей ІМПЯРОВІЧ, інжынер-эколаг Жанна БУЛАЙ.

За гэты час пройдзены слаўны шлях ад аддзелаў па будаўніцтве дарог пры мясцовых адміністрацыях да паўнавартаснага буйнога прадпрыемства з шырокай сеткай філіялаў і вытворчых аб'ектаў. Працягласць дарог за гэты перыяд павялічылася ў пяць разоў — ад 2 да 10 тысяч кіламетраў.

«Без дарог у нас жыцця няма. Гэта і настрой людзей, і эканоміка, і транзіт...» Словы Прэзідэнта Беларусі падчас нарады ў Гродзенскай вобласці ў красавіку мінулага года як нельга лепш адлюстроўваюць важнасць дарожнай інфраструктуры для краіны.

Чарговая рэкамендацыя датычылася прывядзення іх у парадак да 9 Мая. Што было зроблена ў сувязі з гэтым даручэннем?

— Для нас гэта штодзённая праца. Мы да сярэдзіны мая штогод рыхтуем дарогі да летняй эксплуатацыі, аглядаем іх стан, выяўляем нейкія неадпаведнасці, недарэчнасці, каб у летні перыяд усё гэта ліквідаваць.

Сёлета ў сувязі з даручэннем Прэзідэнта гэтаму перыяду — асабліва значэнне і павышаная ўвага. Нас кантралявалі і ДАІ, і Мінтранс, штодзень збіралася інфармацыя аб ходзе работ, кожны дзень мы рабілі асобныя віды работ былі завершаны раней запланаванага тэрміну.

— Што за работы?

— Гэта ачыстка і афарбоўка бар'ернай металічнай агароджы, аўтобусных прыпынкаў, малых архітэктурных формаў, нанясенне разметкі вызначанага кіламетражу, прыборка смецця ўздоўж дарог. Трэба было ўсе 10 тысяч кіламетраў аб'ехаць і сабраць смецце пасля зімы. Сістэматычна рабілі ямачны рамонт. Гэтаму ўдзялялася ўвага.

— Тэмпы работ нарошчваюцца. У чым гэта выяўляецца?

— Значна выраслі аб'ёмы работ капітальнага і бягучага рамонту. Летась стаяла задача адрамантаваць па дзяржпраграме «Дарогі Беларусі» 200 кіламетраў дарог, мы пры дадатковым фінансаванні адрамантавалі 270 кіламетраў. А сёлета нам трэба адрамантаваць ужо 500 кіламетраў. Больш амаль у два разы. Адпаведна павялічылася і фінансаванне. З выдзеленых 160 мільёнаў рублёў на 1 верасня асвоена 110 мільёнаў. Да канца года засталося асвоіць менш за 50 мільёнаў рублёў.

— Які аптымальны работы дарожнай службы?

— Напачатку робіцца папярэдні агляд. Калі прыходзіць час фарміравання аб'ектаў на будучы год, мы ведаем па бюджэце на год сваю лічбу. Пасля агляду бачым, якія дарогі атрымалі тую ці іншую ацэнку, якая на іх інтэнсіўнасць, наколькі яны важныя для эканомікі, і прымаем рашэнні ўключаць ці не гэты ўчастак у план рамонту будучага года. Такая практыка кожны год. Мы складаем спіс, які абавязкова ўзгадняем з райвыканкамам.

— Улады, як правіла, улічваюць пажаданні сваіх жыхароў...

— Вядома. Мы таксама ўлічваем звароты грамадзян пры складанні праграмы на будучы год, аналізуем, адкуль былі звароты, колькі іх, абгрунтаваныя яны ці не. Улічваем гэты фактар.

— Якія дарогі робіце цяпер?

— У нас усе дарогі мясцовага, абласнога падпарадкавання. Магістралямі займаецца прадпрыемства «Аўтадар». У першую чаргу звяртаем увагу на якасць дарог ад аграгарадкоў да райцэнтраў. Другая па значнасці група — дарогі, якія злучаюць цэнтры сельсаветаў з аграгарадкамі і навакольнымі вёскамі. Не забываем і пра адданыя вёскі, яны таксама ў поле зроку нашага прадпрыемства.

— Як паляпшаецца якасць дарог?

— Пры павелічэнні аб'ёмаў не забываем пра якасць. Падчас капітальнага рамонту дарогі пераводзяцца ў больш высокую катэгорыю пакрыцця, напрыклад, ад гравійкі да бетону. Ад гэтага якасць узрастае.

— Як дарожныя работы размеркаваны па раёнах Гродзенскай вобласці?

— Ёсць раёны з вялікай працягласцю дарог. Напрыклад, у Гродзенскім яны складаюць 900 кіламетраў, а ў Бераставіцкім — толькі 350. У залежнасці ад працягласці і катэгорыі дарог па спецыяльнай методыцы робіцца разлік сродкаў на кожны раён. Летась аб'ёмы выдзеленых сродкаў вырасліпрапарцыянальна па ўсіх раёнах.

Многае робім за кошт рэспубліканскіх сродкаў, якія паступлюць на рамонт вулічна-дарожнай сеткі ў жыллёва-камунальную гаспадарку. Мы працуем разам, аднаўляем пакрыццё дарожнай часткі. Шмат працуем з прадпрыемствамі, якія займаюцца рэканструкцыяй малочнатварных фермаў, дзе таксама робіцца новае пакрыццё. Прымаем удзел у падрыхтоўцы да абласных «Дажынак».

Наша дарожнае прадпрыемства аказвае цэлы спектр паслуг. У іх ліку — продаж пясчана-гравійнай сумесі. На спецыяльным абсталяванні здрабняем камяні і атрымліваем друз, які ідзе ў склад асфальтавай сумесі. Увесь прыбытак прадпрыемства пускаем на развіццё.

— Ваша прадпрыемства ўстойліва трымае лідарства па аб'ёме дарожных работ. Гэты год не выключэнне?

— «Гроднааблдарбуд» і сёння лідар па капітальным рамонце сярод усіх прадпрыемстваў краіны дадзенага профілю. Што-год прадпрыемствам «Гроднааблдарбуд» капітальна рамантуецца каля 20 кіламетраў мясцовых дарог — гэта самы высокі паказчык у краіне.

Адно наша прадпрыемства робіць столькі капрамонтаў, колькі ўсе разам узятыя абласныя структуры, пры тым што гэта не самыя «ўдзячныя» для нас аб'екты. Напрыклад, кошт аднаго кіламетра капрамонту пры «адзенні» гравійкі ў асфальт складае 600—650 тысяч рублёў. А вось новае пакрыццё на былым асфальце абыходзіцца ў два разы танней. Але мы аддаём перавагу менавіта капітальнаму рамонту. Гэта значыць, што расце колькасць асфальтавых дарог, што робіць жыццё ў населеных пунктах больш камфортным. Такая пазіцыя ў прыярытэце ў кіраўніцтва Гродзенскай вобласці і нашага прадпрыемства.

Паважаныя калегі і ветэраны КУП «Гроднааблдарбуд». Прыміце віншаванні з прафесійным святам і 80-гадовым юбілеем нашага прадпрыемства.
Работа дарожнай гаспадаркі — гэта штодзённая праца па абслугоўванні населеных пунктаў, своечасовыя работы на дарогах, забеспячэнне якаснага стану дарожнага палатна. Усё гэта — важная ўмова дабрабыту насельніцтва. Ад нашай работы залежыць настрой нашых жыхароў — вадзіцеляў, пасажыраў, пешаходаў.
Вялікі дзякуй усім, хто воляй лёсу апынуўся ў гэтай прафесіі і застаецца ў ёй надалей. Нізкі паклон ветэранам працы, а сённяшнім супрацоўнікам — плёну, дабрабыту ў сем'ях, здароўя і актыўнага даўгалецця.

Генеральны дырэктар КУП «Гроднааблдарбуд» Сяргей СЛІНКО.

Гродзенскія дарожнікі гэта добра разумеюць і пастаянна нарошчваюць тэмпы работ. Вось і летась у рэгіёне планавалася адрамантаваць удвая больш кіламетраў дарог, чым летась. Як спраўляецца КУП «Гроднааблдарбуд» з пастаўленымі задачамі, расказаў **генеральны дырэктар Сяргей СЛІНКО.**

— Сяргей Віктаравіч, дарогі заўсёды былі пад пільнай увагай кіраўніцтва Беларусі. Ці справаздачы. Заданні, якія былі пастаўлены кіраўніком дзяржавы, выконвалі ў вызначаны тэрмін.

— Аб'ёмы работ былі звычайнымі ці павялічыліся?

— Аб'ёмы прыкладна тыя самыя. Аднак была ўзмоцнена работа па бягучым рамонце. І да пэўнага тэрміну ўсе віды і аб'ёмы работ былі выкананы поўнасцю. Больш за тое,

ЗНІЗІЦЬ НАГРУЗКУ НА ЦЭНТР ГОРАДА

Новае рашэнне дарожнага праекта прапанавалі ў КУП «Гроднадарпраект»

Арганізацыя створана для праектавання дарог мясцовага значэння і мастоў. У штаце 50 чалавек, усе супрацоўнікі з вышэйшай адукацыяй, атэставаны на выкананне складаных аб'ектаў. Да абласных «Дажынак» у горадзе Масты спраектавалі пяць вуліц, у тым ліку цэнтральную Савецкую, дзе будуць разгортвацца галоўныя падзеі свята.

Але нядаўна тут пайшлі крыху далей. Дзякуючы атрыманай атэстацыі на ўсе віды дзейнасці ў прадпрыемства з'явіўся вельмі сур'ёзны заказ гарадскога ўпраўлення капітальнага будаўніцтва — распрацаваць абхаднае кальцо ва ўсходняй частцы горада Гродна з усімі інфраструктурнымі аб'ектамі. А гэта і электразабеспячэнне, і ліўневая каналізацыя, і добраўпарадкаванне: тратуары, веладарожкі, праезная частка.

Дырэктар КУП «Гроднадарпраект» Алег КУЦКО абмяркоўвае разам з падначаленымі праектныя рашэнні. *Злева направа:* інжынеры-праекціроўшчыкі Антон ГАРОШКА і Кацярына ДЗЕМАСЮК, галоўны інжынер праекта Ягор КАНЕЦКІ, намеснік дырэктара — галоўны інжынер Ірына АЎРУКЕВІЧ і начальнік аддзела пошукаў Юрый ЯХІМЧЫК.

— Гэтым праектам мы выйшлі на новы этап дзейнасці, нават новы ўзровень работы нашай праектнай установы, — падкрэсліў **дырэктар КУП «Гроднадарпраект» Алег КУЦКО.** — Наш вытворчы аддзел дастойна выканаў сваю задачу, чым вельмі ганарымся. Нядаўна мы атрымалі яшчэ адзін заказ, над якім будзем працаваць у наступным годзе.

Аб сутнасці прарыўнога праекта расказала **намеснік дырэктара — галоўны інжынер Ірына АЎРУКЕВІЧ.** Па яе словах, новае рашэнне звязана з працягам вуліцы Дзяржынскага — адной з галоўных магістраляў горада — і выхадам на прамысловае прадпрыемства «Хімвалакно». Такім чынам, будзе створана новае абхаднае кальцо на ўсходняй частцы горада, якое дазволіць яшчэ больш разгрузіць цэнтральную частку Гродна. Увесь грузавы транспарт пойдзе ў абход горада. Улічаны тут і ўсе магчымыя камунікацыі.

КАБ ПАСКОРЫЦЬ ПРАЦЭС

Сёлета на прадпрыемстве пачаў працаваць новы асфальтавы завод

Вытворчая база КУП «Гроднааблдарбуда» пастаянна абнаўляецца. Вось і сёлета тут набылі новую сучасную асфальтавую ўстаноўку, магутнасць якой у пяць разоў перавышае былы аналаг. Пакуль такі экзэмпляр адзіны ў вобласці.



Намеснік генеральнага дырэктара Уладзіміра ЦЫЛЬКО на добраўпарадкаваным пляцоўцы Юнацтва.

Як паведаміў **прараб прадпрыемства Вадзім ДРАЗДОЎ,** новы завод дазваляе атрымаць 130 тон асфальтавай сумесі за гадзіну, а ў змену гэты паказчык дасягае больш за тысячу тон. У той час сталы завод выдаваў за такі ж перыяд 200—250 тон.

Аб магутнасці новай устаноўкі сведчыць і вялікая колькасць самазвалаў, якія раз-пораз пад'яжджаюць па гатовы прадукт. Напрыклад, толькі за 10 хвілін было загружана тры машыны. Нягледзячы на спецыфіку вытворчасці, на тэрыторыі завода — парадак, не відаць ніякага дыму. Новая ўстаноўка бліскучыць сваім металічным сявятлом. Дарэчы, яе мантаж ажыццяўлялі спецыяльны пад'ёмны кран — адзіны ў Гродне.

Па словах **намесніка генеральнага дырэктара па эканоміцы КУП «Гроднааблдарбуд» Уладзіміра ЦЫЛЬКО,** па вобласці працуе 14 асфальтавых заводаў, але новая ўстаноўка па многіх параметрах іх пераўзыходзіць — і па магутнасці, і па экалагічнасці. Пры тым што завод карыстаецца мазутным палівам, тут няма ніякіх шкодных выкідаў і дыму, які быў раней.

— Устаноўка не з танных, яе кошт складае больш за тры мільёны рублёў, але павелічэнне аб'ёмаў патрабуе і больш прагрэсіўнай вытворчай базы, — падкрэсліў Уладзімір Цылько. — Новы завод абслугоўвае Гродна і Гродзенскі раён — тут аб'ёмы работ самыя вялікія ў вобласці.

На заводзе працуе свая лабараторыя, дзе ідзе праверка сыравіны і гатовага прадукту. Складнікі будучага асфальту ў выглядзе друзу розных фракцый і пяску праходзяць праз спецыяльныя ўстаноўкі, змешваюцца з бітумам, і выпускаецца сумесь, тэмпература якой складае 120 градусаў. Гэта сумесь і паступае для ўкладкі дарожнага палатна.

Прараб асфальтабетоннага завода «Каўлакі» Вадзім ДРАЗДОЎ на фоне асфальтазмешальнай установкі.

ДАРОЖНЫ ГЛЯНЕЦ СУСТРЭНЕ «ДАЖЫНКІ»

У сталіцы абласнога фестывалю — горадзе Масты — прадпрыемствам «Гроднааблдарбуд» асвоена 4 мільёны рублёў і ўкладзена больш як 5 тысяч тон асфальту

Начальнік ДРБУ-208 Станіслаў МУСАТАЎ.

Начальнік ДРБУ-208 Станіслаў МУСАТАЎ расказаў аб тым, якія работы праведзены па добраўпарадкаванні дарог і тэрыторый. Завершана ўкладка тратуарнай плітакі вакол Дома культуры, цэнтральнай раённай бальніцы, будынкаў гаргаза і цэнтра гігіены і эпідэміялогіі. Заасфальтавана 15 вуліц, шэраг дваровых тэрыторый.

— Нягледзячы на скарочаныя тэрміны і новыя аб'екты, якія дадаюцца ў ходзе работ, наш філіял спраўляецца, работы вядуцца па графіку, уся неабходная тэхніка ёсць, матэрыялы паступаюць своечасова, дарожныя рабочыя і вадзіцелі дарожнай тэхнікі таксама стараюцца выканаць работу добра, каб горад з гонарам мог прынясці шматлікіх гасцей падчас фестывалю хлебаробаў, — рэзюмаваў Станіслаў Мусатаў.

Але не толькі для гасцей стараюцца дарожнікі-будаўнікі. Іх галоўны клопат — аб мясцовых жыхарах, якіх радуе новае асфальтавае пакрыццё, добраўпарадкаваная тэрыторыя. І справа не толькі ў «Дажынках». У дарожнага філіяла нямала аб'ектаў як у раённым цэнтры, так і за яго межамі.

Работы на вуліцы Якуба Коласа былі завершаны да абласных «Дажынак».

АПОШНІМ ІДЗЕ КАТОК

Хто робіць дарогі роўнымі і трывалымі

Машыніст катка Уладзімір КУЛЬ рамантуе асфальт у вёсцы Галубы.

Усе мы ведаем, што на ўкладзены асфальту не абысціся без спецыяльнай машыны з магутным шматтонным каткомцыліндрам. Каб дасягнуць найбольшай шчыльнасці, працуюць адразу тры каткі. Такую карціну можна было назіраць падчас укладкі асфальту ў вёсцы Галубы Мастоўскага раёна. Тут работнікі мясцовага філіяла ДРБУ-208 клалі дарожнае палатно на трох участках сельскіх дарог агульнай працягласцю каля трох кіламетраў з выхадам на трасу. У гэту зону трапілі і вуліцы трох вёсак. Па словах майстра Івана Сыча, мясцовыя жыхары вельмі рады такім зменам, цяпер іх вёскі будуць пазбаўлены пылу, які быў дагэтуль. Работы вядуцца строга па тэхналогіі.

— Калі дарога пашкоджана, яе трэба спачатку выраўняць, а потым класці верхні пласт. Гэта можна рабіць адначасова, таму тут працуюць ажно тры каткі. Кожны праходзіць па адным месцы 10—12 разоў. Апошні каток наводзіць канчаткова глянец, — расказаў майстар пра спецыфіку работы. Ён дадаў, што простою няма, асфальт паступае своечасова, таму работа ідзе хутка і якасна.

ХУТКА І ЯКАСНА

Як спраўляюцца з ростам аб'ёмаў у Дзятлаўскім ДРБУ-119

Новае дарожнае пакрыццё замест гравійкі атрымалі ў верасні і жніўні вёсак Байкі, Лыскі, Кастровічы ў Слонімскім раёне.

Участак мае працягласць 2,6 кіламетра. Ён злучае населеныя пункты з трасай, якая вядзе на Слонім і Масты. Работы выконвае ДРБУ-119.

На балансе філіяла мясцовыя дарогі двух раёнаў — Дзятлаўскага і Слонімскага. Іх агульная працягласць складае 1200 кіламетраў.

— Займаемся як бягучымі, так і капітальнымі рамонтамі, утрыманнем дарог, а таксама дапамагаем райвыканкамам у асфальтаванні гарадскіх вуліц. Напрыклад, у Дзятлаве выканалі работы па добраўпарадкаванні вуліцы Леніна. Робім ямачны рамонт, абкошваем, мяняем знакі і аўтапавільёны. У верасні працавалі на 13 аб'ектах — дарогах і мастах, — паведаміў **начальнік ДРБУ-119 Дзмітрый МАЗОЛЬ.**

Ён адзначыў, што летась у філіяла ў два разы павялічыліся плануемыя аб'ёмы, што патрабуе і больш хуткай работы. Між тым патрабаванні да дарог растуць, асабліва сёлета, у Год якасці.

Машыніст асфальтаўкладчыка Аляксандр СІДОРЧЫК ужо 18 гадоў працуе на прадпрыемстве.

Токар Ігар МАЦЮК паказвае адрамантаваную запчастку начальніку ДРБУ № 119 Дзмітрыю МАЗАЛЮ.

Майстар Ігар ПАЎЛЕНКА кантралюе падрыхтоўку асновы пад асфальтаванне.

Майстар Андрэй ШЭСТАК і асфальтабетоншчык Павел ЗАЛЕЎСКІ ўкладваюць асфальтабетон на дарозе Ніз — Кастровічы — Байкі.

Майстар Андрэй ШЭСТАК і асфальтабетоншчык Павел ЗАЛЕЎСКІ ўкладваюць асфальтабетон на дарозе Ніз — Кастровічы — Байкі.

ВІНШУЕМ З УЗНАГАРОДАМІ!

Нагрудным знакам Міністэрства транспарту і камунікацый «Ганаровы дарожнік Беларусі» I ступені ўзнагароджана **Ірына Аўрукевіч — намеснік дырэктара — галоўны інжынер КУП «Гроднадарпраект».**

Нагрудным знакам «Ганаровы дарожнік Беларусі» II ступені ўзнагароджаны: **машыніст укладчыка асфальтабетону 7-га разраду ДРБУ-118 Аляксей Мацкевіч, прараб АБЗ ДРБУ-188 Алег Бусловіч, машыніст аўтагрэйдара ДРБУ-189 Генадзь Сакевіч.**

Ганаровай граматай Міністэрства транспарту і камунікацый узнагароджаны: **начальнік участка ДРБУ 119 Віталь Балтрушка, галоўны інжынер ДРБУ 134 Андрэй Юлізнюк, галоўны інжынер праекта аддзела КУП «Гроднадарпраект» Ягор Канецкі, майстар ДРБУ-156 Яўген Місура, галоўны інжынер ДРБУ-209 Леанід Янюк.**

Ганаровай граматай Гродзенскага абласнога выканаўчага камітэта ўзнагароджаны: **машыніст катка ДРБУ-188 Дзмітрый Еўтушэнка, машыніст аўтагрэйдара ДРБУ-160 Віктар Парманчук.**

Аб'яўлена падзяка ад імя старшыні абласнога выканкама: **вадзіцелю аўтамабіля ДРБУ-157 Віктару Карэйву і прарабу ДРБУ-159 Андрэю Кумішчу.**

Алена ДАЎЖАНОК, Маргарыта УШКЕВІЧ. Фота Лізаветы ГОЛАД.

УНП 500036511

Калектыў планава-эканамічнага аддзела. *Злева направа:* вядучы інжынер Алена ЗАЗЕКА, начальнік аддзела Андрэй ПЕХЦЕРАЎ, вядучы эканаміст Сяргей ГЛАЗКІН, намеснік начальніка аддзела Аляксандр БОНДАР.

Рознарабочы Уладзімір АРЦІМЁНАК раўняе адхоны.

Аддзел механізацыі і энергетыкі. *Злева направа:* вядучы інжынер Алена БАТАВА, намеснік начальніка аддзела Мікалай ФЕДАРОВІЧ, начальнік аддзела Ігар КУДЗЕЛЬ, вядучы інжынер-механік Яўген МІКАЛАЕЎ.

ПРАФЕСІЯНАЛЫ СВАЁЙ СПРАВЫ

Дарогі са знакам якасці ад ДБТ-1

Вытворчая нарада кіраўніцтва. *Злева направа:* дырэктар філіяла ДБУ-7 Сяргей КАРЧАВЕЦ, дырэктар філіяла ДБУ-3 Віталь КАПЦЭВІЧ, генеральны дырэктар ААТ «ДБТ-1, г. Віцебск» Алег КАПЦЭВІЧ, дырэктар філіяла МБУ-5 Дзмітрый АЎСЯННІКАЎ, першы намеснік генеральнага дырэктара — галоўны інжынер ААТ «ДБТ-1, г. Віцебск» Сяргей КЛЯБАНАЎ.

ПАВАЖАНЫЯ КАЛЕГІ І ВЕТЭРАНЫ ПРАЦЫ, віншуем вас з надыходзячым прафесійным святам!

Немагчыма не адчуваць гонар ад плёну нашай сумеснай працы. Дзякуем вам за цяжкую і сапраўды неацэнную працу на дарожных магістралях усёй краіны ў любую пару года. За 55 гадоў наш ДБТ-1 горада Віцебска дасягнуў немалых поспехаў і пабудаваў шмат значных дарог, што злучаюць паміж сабой не толькі важныя эканамічныя і геапалітычныя аб'екты, але і блізкіх людзей, якія воляй лёсу апынуліся ў розных кутках краіны. Дзякуй за глыбокую адданасць абранай прафесіі. Жадаем вам поспехаў ва ўсіх добрых пачынаннях, няхай дарога вашага жыцця будзе напоўнена прыемнымі імгненнямі!

Генеральны дырэктар ААТ «ДБТ-1, г. Віцебск» Алег КАПЦЭВІЧ.

Участак дарогі Р-46 каля вёскі Сарочына.

ААТ «ДБТ-1» — гэта якасць, надзейнасць і ўпэўненасць у заўтрашнім дні. Сёлета прадпрыемства святкуе свой 55-гадовы юбілей. За ўвесь гэты час трэстам пабудавана, адрамантавана і ўведзена ў эксплуатацыю больш за 9000 кіламетраў аўтамабільных дарог абласнога, рэспубліканскага і міжнароднага значэння. Над чым вядуцца работы цяпер і чым жыве гэтае прадпрыемства?

Намеснік генеральнага дырэктара па эканоміцы Сяргей БУЛАЙ.

Сучасныя падыходы

Работы па будаўніцтве, рэканструкцыі, рамонце аўтамабільных дарог і штучных збудаванняў на іх, пакрыццяў аэрадромаў, добраўпарадкаванні населеных пунктаў не толькі ў Рэспубліцы Беларусь, але і за яе межамі — усё гэта выконвае ДБТ-1 горада Віцебска. Дарэчы, сёлета прадпрыемства атрымала дыплом I ступені ў штогадовай прэміі «Лідары ў будаўніцтве 2024» у намінацыі «Прадпрыемства года ў галіне дарожна-будаўнічай дзейнасці».

З 2015 года прадпрыемства ўзначальвае вопытны дарожнік **Алег КАПЦЭВІЧ.** Ён курыраваў мноства значных праектаў, сярод якіх дарога Віцебск — Полацк, Пецярбургская кальцавая, Балтыйская трубаправодная сістэма. У яго атрымалася аб'яднаць у сваім падыходзе да работы наватарства і досвед папярэднікаў, што дапамагае бесперапынна развіваць прадпрыемства.

Паводле слоў Алега Капцэвіча, для таго каб заставацца канкурэнтаздольнымі на рынку, неабходны тры асноўныя складнікі: наяўнасць сучаснай дарожна-будаўнічай тэхнікі, прымяненне прагрэсіўных тэхналогій і інавацый, а таксама высокі прафесіяналізм супрацоўнікаў.

— Мы пастаянна пашыраем намянклатуру прадукцыі і паслуг. Так, наша арганізацыя актыўна абнаўляе машынны парк, своечасова замяняючы тэхніку найноўшымі дарожна-будаўнічымі машынамі, якія ў тым ліку зніжаюць рызыкі атрымання вытворчых траўм. Усяго ў нас налічваецца 370 адзінак тэхнікі і аўтатранспарту, — падзяліўся генеральны дырэктар.

Таксама ён дадаў, што «ДБТ-1» шырока выкарыстоўвае дарожна-будаўнічую тэхніку, абсталяваную 3D-сістэмамі кіравання LeicaiCON, CHCNAV, што павышае якасць і эфектыўнасць працы.

— Акрамя таго, пад перспектыўны праект мы набылі новы асфальтабетонны завод. Цяпер у нашага прадпрыемства іх восем, — адзначыў ён. — Толькі ў 2024 годзе плануем абкласці больш за 570 тысяч тон асфальтабетону.

Цікава і тое, што прадпрыемства прапануе пакупнікам розныя бетонныя і жалезабетонныя вырабы, а таксама элементы студняў і труб. Да таго ж «ДБТ-1» прапануе шырокі спектр лабараторных выпрабаванняў. Для кантролю якасці работ і матэрыялаў у філіялах трэста працуюць атэставаныя і акрэдытаваныя лабараторыі, служба кантролю якасці.

І ўсё гэта карыстаецца попытам. **Намеснік генеральнага дырэктара па эканоміцы Сяргей БУЛАЙ** адзначыў, што статыстычныя справаздачы прадпрыемства адлюстроўваюць рост выручкі ад рэалізацыі прадукцыі, дынаміка якой склала 195,2 працэнта ў 2023 годзе ў параўнанні з 2022 годам.

Экскаватаршчык Анатоль РУКАЛЬ працуе на рэканструкцыі Р-46.

«Ганаровыя дарожнікі» I ступені

Першы намеснік генеральнага дырэктара — галоўны інжынер **Сяргей Клябанаў.**

Дырэктар філіяла ДБУ-2 **Леанід Батура.**

Начальнік аддзела матэрыяльна-тэхнічнага забеспячэння **Іван Ляўковіч.**

«Ганаровыя дарожнікі» II ступені

Начальнік аддзела механізацыі і энергетыкі **Ігар Кудзель.**

Кіроўца аўтамабіля 1-га класа 5-га разраду **Васіль Горнаў.**

Галоўны бухгалтар **Людміла Лаўранюк.**

Машыніст катка самаходнага 6-га разраду філіяла ДБУ-3 **Леанід Лапко.**

Прараб філіяла ДБУ-7 **Андрэй Клімянкоў.**

Прараб філіяла ДБУ-26 **Мікалай Табола.**

Перспектыўныя праекты

Работнікі «ДБТ-1» працуюць на розных буйных аб'ектах, сярод якіх рэканструкцыя аўтамабільнай дарогі Р-46 Лепель — Полацк — граніца РФ (Юхавічы) 31,9 км — 61,5 км, капітальны рамонт гэтай жа дарогі на розных участках, а таксама будаўніцтва

Першы намеснік дырэктара — галоўны інжынер філіяла ДБУ-2 Артур КЛАВОВІЧ падчас нарады.

на тэрыторыі Расіі аўтамабільнай дарогі А-289 Краснадар — Славянск-на-Кубані — Цямрук — А-290 Новарасійск — Керч.

Нам удалося трапіць на рэканструкцыю дарогі Р-46. Работа вядзецца напоўніцу. Дарэчы, менавіта пад гэты аб'ект і быў выкуплены новы асфальтабетонны завод.

— Р-46 — вельмі значны аб'ект. Дарога падзелена ад М-3 дарогі да горада Полацка на дзве чэргі па 30 кіламетраў у сярэднім з уладкаваннем двух кальцавых скрыжаванняў. Адно з кальцавых скрыжаванняў ужо рэалізавана ў Полацку на 61-м кіламетры, — падзяліўся **першы намеснік дырэктара — галоўны інжынер філіяла ДСУ-2 Артур КЛАВОВІЧ.** — Перашапаткова шырыня асфальтабетоннага пакрыцця была 6,5 метра, аднак пасля рэканструкцыі складзе 12 метраў з прыладай аўтобусных прыпынкаў, агароджы ад жывёл, бар'ернай агароджы і абнаўленнем пешаходных дарожак. Адным словам, дарога стане больш камфортнай, якаснай і бяспечнай, а таксама будзе адпавядаць трэцяй катэгорыі ў новых умовах інтэнсіўнасці руху.

У найбліжэйшых планах у прадпрыемства — пачаць першую чаргу будаўніцтва. Гэта адлегласць даўжынёй у 30 км ад кальцавога перасячэння з аўтадарогай М-3 да населенага пункта Сарочына.

— Цяпер вядуцца работы па заключэнні дагавораў, чакаюцца вялікія аб'ёмы працы. Усю зіму будуць актыўна весціся падрыхтоўчыя работы, каб вясной выйсці на спрыяльны перыяд і пачаць працаваць непасрэдна над дарожным пакрыццём, — дадаў Артур Клавовіч.

Гатовы да эксплуатацыі мост праз раку Туржанка.

Дарожныя рабочыя Ігар ГАЎРЫЛОВІЧ і Аляксандр ЧАРНЯЎСКІ ўмацоўваюць трубу.

Вытворча-тэхнічны аддзел абмяркоўвае працоўныя пытанні. *Злева направа:* вядучыя інжынеры Наталля БОЙКАВА, Ганна НІКІЦІНА, намеснік начальніка аддзела Кірыл ГАЛАЎКОЎ і інжынер Зоя РЫМАШЭУСКАЯ.

Юрыдычны аддзел працуе з дакументацыяй. *Злева направа:* намеснік начальніка Канстанцін САНЬКО, начальнік аддзела Таццяна ЕРАНЬКОВА, вядучы спецыяліст па каштоўных паперах Ірына АПЕНЬКА.

З клопатам аб супрацоўніках

Усяго на прадпрыемстве працуе каля 800 чалавек. Для работнікаў тут створаны цудоўныя ўмовы, прапісаныя ў калектыўным дагаворы. Гэта і матэрыяльная дапамога супрацоўнікам і ветэранам працы па розных нагодах, і страхоўка, якая пакрывае абследаванне, і нават пазыкі на правядзенне дарагіх медыцынскіх аперацый.

А што ж з кватэрным пытаннем? Па словах **начальніка юрыдычнага аддзела Таццяны ЕРАНЬКОВАЙ,** прадпрыемства выдзяляе арэнднае жыллё з магчымасцю выкупу, месца ў інтэрнаце або кампенсуе выдаткі па найме жылых памяшканняў. А яшчэ супрацоўнікам могуць выдаць пазыку на куплю нерухомасці да 80 % ад агульнага кошту ўсяго пад 3 %.

Акрамя таго, вялікая ўвага ўдзяляецца адукацыі і навучанню.

— Павышэнне кваліфікацый — само сабой зразумелае. Арганізацыя яшчэ цалкам аплачвае атрыманне вышэйшай адукацыі, аднак пасля гэтага супрацоўнік павінен у нас адпрацаваць тры гады альбо кампенсаваць затраченыя сродкі, — падзялілася Таццяна Еранькова.

З цеплынёй работнікі трэста ўспамінаюць экскурсіі, якія прадпрыемства арганізуе як мінімум раз на год.

— Зусім нядаўна былі ў Маскве, Ніжнім Ноўгарадзе і Суле. Ахвотных шмат — заўсёды поўны аўтобус. Экскурсія, вядома ж, на льготных умовах з часткавай кампенсацыяй ад прафсаюза, — адзначыла начальнік юрыдычнага аддзела.

Важную частку жыцця прадпрыемства займае і спартыўнае жыццё. Удзел у турзлётах, спаборніцтвах па міні-футболе і рыбалцы... Удалося нам паразмаўляць з **вядучым інжынерам аддзела ПТА Ганнай НІКІЦІНАЙ,** чалавекам з актыўнай творчай пазіцыяй. Менавіта яна дапамагае з арганізацыяй розных мерапрыемстваў, робіць шмат важных дробязяў ад распрацоўкі макетаў і буклетаў да работы над брэндбукам і стварэннем дыпломаў.

— Я люблю працаваць у гэтай арганізацыі, мне падабаецца дапамагаць і рабіць тое, што ўмею. Я ўвогуле творчы чалавек, і для мяне гэта хутчэй адпачынак, — падзялілася яна.

Так, атрымліваецца, што ў ДБТ-1 умеюць не толькі якасна рабіць дарогі, але і стварацьдружную атмасферу ў калектыве і своечасова падтрымліваць супрацоўнікаў.

УНП 300000398

Алена ДАЎЖАНОК, Лізавета ГОЛАД. Фота Лізаветы ГОЛАД.

ЯК «БЕЛДАРСУВЯЗЬ» РОБІЦЬ ДАРОГІ ІНТЭЛЕКТУАЛЬНЫМІ

БЕЛДОРСВЯЗЬ

Сучасная дарога — гэта не толькі якаснае дарожнае пакрыццё, але і перадавое тэхналагічнае аблічча. Укараненне інтэлектуальных транспартных сістэм ужо стала буйной тэндэнцыяй для Беларусі. А займаецца гэтым усім РУП «Белдарсувязь» — прадпрыемства, якое ўжо больш за 20 гадоў робіць нашы дарогі інтэлектуальнымі.

Дырэктар Мікалай БІЧАН.

Тэхнічнае абслугоўванне дарожна-вымяральнай станцыі.

Цэнтр маніторынгу дарожнага руху.



Абмеркаванне пілотнага праекта «Сістэма папярэджання вадзіцеляў транспартных сродкаў аб выхадзе дзікіх жывёл на дарогу». *Злева направа:* начальнік аддзела тэхнічнай падтрымкі ўпраўлення інфармацыйных тэхналогій (далей — УІТ) Яўген МАЖЭЙ, начальнік аддзела развіцця тэлекамунікацыйных сістэм і інфармацыйнай бяспекі УІТ Дзмітрый ІЎЛЕЎ, начальнік УІТ Віталь ЛЫСКОЎСКІ.

ПАВАЖАНЫЯ КАЛЕГІ, РАБОТНІКІ І ВЕТЭРАНЫ ПРАДПРЫЕМСТВА!

Віншую вас ад усёй душы з прафесійным святам — Днём аўтамабіліста і дарожніка. Жадаю моцнага здароўя, шмат сіл, энергіі і бадзёрага настрою. Няхай дарога вашага жыцця заўсёды будзе насычанай, роўнай і займальнай, а працоўныя будні — лёгкімі і плённымі.

Дырэктар РУП «Белдарсувязь» Мікалай БІЧАН.

З чаго ўсё пачыналася

Тэхналагічны прарыў 2000-х гадоў ускалыхнуў увесь свет. Натуральна, дарожная галіна не магла заставацца ўбаку. Ды і геаграфічнае становішча Беларусі як транзітнай краіны дыктавала тое, што аўтамагістралі павінны быць зручнымі для ўсіх удзельнікаў дарожнага руху. Таму ў 2001 годзе было створана якасна новае прадпрыемства РУП «Белдарсувязь».

— У тыя гады прадпрыемства выконвала функцыі аператара тэхналагічнай сувязі, займалася зместам і развіццём лінейна-кабельных сетак сувязі, а таксама абсталяваннем сігнальна-вызывной і радыёцыйнай сувязі, укараненнем метазманіторынгу і ведамаснай тэлефоннай сувязі, — падзяліўся **дырэктар прадпрыемства Мікалай БІЧАН.**

Ужо ў 2003 годзе РУП «Белдарсувязь» стала самастойнай юрыдычнай арганізацыяй. Новы статус паставіў новыя задачы, у тым ліку і па мадэрнізацыі. Так, прадпрыемства з таго часу стала адзіным аператарам тэхналагічнай сувязі дарожнай гаспадаркі.

— З нуля была створана ведамасная сетка радыёсувязі для забеспячэння аператыўнага кіравання тэхналагічным транспартам, якая пакрывае больш як 90 % рэспубліканскіх дарог і налічвае каля 3200 радыёстанцый дарожнай гаспадаркі і 160 мачт і веж радыёсувязі, — адзначыў Мікалай Уладзіміравіч.

Больш за тое, прадпрыемства першым у Беларусі ўкаранёна інавацыйную тэхналогію задзімання валаконна-аптычнага кабелю сувязі ў ахоўную поліэтыленавую трубу, дзякуючы чаму хуткасць перадачы даных дарожнай гаспадаркі павялічылася да 10 Гбіт/с. І адным з першых стварыла сістэму маніторынгу тэхналагічнага транспарту. На дадзены момант каля 2000 адзінак тэхнікі, якая ўдзельнічае ва ўтрыманні аўтамабільных дарог, абсталявана прыладамі GPS-маніторынгу, што дазваляе значна скараціць эксплуатацыйныя выдаткі і павысіць эфектыўнасць работы транспарту і брыгад, асабліва ў зімовы перыяд утрымання дарог.

А з 2021 года РУП «Белдарсувязь» стала аператарам інтэлектуальнай транспартнай сістэмы Мінтранса, а таксама каардынатарам пытанняў інфарматызацыі ў сістэме Міністэрства транспарту і камунікацый Рэспублікі Беларусь.

Вымярэнне валаконна-аптычнай лініі сувязі.

Пракладка ахоўнай поліэтыленавай трубы ў грунт для ўсталявання валаконна-аптычнага кабелю.

Пастаяннае развіццё

Сакрэт поспеху любой справы — трымаць нос па ветры. Асабліва гэта актуальна ў пытаннях лічбавізацыі і сучасных тэхналогій. Паводле слоў першага **намесніка дырэктара Дзяніса ДУБКО,** прадпрыемства ўжо даўно пачало працаваць з розными ІТС, сярод якіх сістэмы метазманіторынгу, маніторынгу тэхналагічнага транспарту, відэаназірання, а таксама сістэма ўліку інтэнсіўнасці руху транспарту.

— У нейкі момант зразумелі, што іх трэба ўсіх аб'яднаваць, каб яны разам стварылі сінергетычны эфект, працуючы адзін на аднаго. Каб кожная сістэма пацвярджала даныя іншай сістэмы і наадварот. Адпаведна, была першая спроба стварэння цэнтра кіравання рухам. У 2020 годзе яму не ўдалося завяршыцца, таму што былі ўведзены санкцыі і праграмнае забеспячэнне не купілі. Мабыць, менавіта гэта паслужыла новым штуршком для развіцця, бо зразумелі, што павінна працаваць імпартазамяшчэнне, — адзначыў Дзяніс Дубко.

Усяму гэтаму папярэднічаў адпаведны Закон «Аб дарожным руху», які даў разуменне аб тым, што такое ІТС. Пасля гэтага ўрадам была прынята пастанова № 724 «Аб парадку функцыянавання інтэлектуальных транспартных сістэм», у якой ужо больш падрабязна распісваўся парадак работы ІТС.

— Так, у 2023 годзе ў нас быў створаны цэнтр маніторынгу дарожнага руху, які прадугледжвае аўтаматызацыю работы і інтэграцыю ўсіх сістэм, якія толькі існуюць у дарожнай гаспадарцы, а таксама атрымванне інфармацыі з іншых інфармацыйных сістэм, якія ІТС не з'яўляюцца, але, тым не менш, для работы патрэбны, — растлумачыў першы намеснік дырэктара. — Сёння мы ўжо ў дзяжаўнай праграме. Аднак, пакуль чакалі, прымецца ці не прымецца наш праграмна-апаратны комплекс, вырашылі не стаяць на месцы, а працаваць у кірунку відэааналітыкі. Адна з абласцей — гэта вызначэнне дзікіх жывёл на дарозе, таксама пачалі распрацоўваць рэестр ІТС і праграмнае забеспячэнне кіравання.

Падчас рабочай нарады. *Злева направа:* начальнік аддзела развіцця інтэлектуальных транспартных сістэм Аляксей ІВАШЫНКА, першы намеснік дырэктара Дзяніс ДУБКО, начальнік аддзела лічбавізацыі Наталля ПАЦЁЙ, начальнік упраўлення перспектыўнага развіцця Станіслаў КЛІБАШАЎ.

Перадавая сучаснасць

Сёння РУП «Белдарсувязь» выконвае поўны комплекс работ па праектаванні, будаўніцтве і абслугоўванні элементаў інтэлектуальнай транспартнай сістэмы Міністэрства транспарту і камунікацый, мае ліцэнзію на права ажыццяўлення дзейнасці ў галіне сувязі, ажыццяўляе функцыі галіноўага офіса лічбавізацыі. Да таго ж для забеспячэння цэнтралізаванага развіцця ў краіне інтэлектуальных транспартных сістэм у адпаведнасці з пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 25.10.2022 № 724 прадпрыемства вызначана цэнтрам маніторынгу дарожнага руху, галоўнай задачай якога — забяспечыць інтэграцыю розных інтэлектуальных транспартных сістэм і іх элементаў у адзінае цэлае.

Над якімі ж аб'ектамі вядзецца работа? Паводле слоў **начальніка вытворча-тэхнічнага ўпраўлення Аляксандра КІСЯЛЁВА,** у дадзены момант прадпрыемства ўдзельнічае ў рэканструкцыі такіх аўтамабільных дарог, як М-10 ад Гомеля да Калінкавіч, Р-53 на ўчастку ад Жодзіна да Барысава і Р-46 ад Полацка да Ушачаў, а таксама ў трэцяй чарзе — будаўніцтва М-3 41—56 км.

— З нашага боку — выпрацоўка будаўніцтва сістэмы кіравання зместам аўтамабільнай дарогі, укараняюцца новыя элементы інтэлектуальнай транспартнай сістэмы (далей — ІТС). Гэта ўключае ў сабе сістэму відэаназірання, будаўніцтва дарожна-вымяральных станцый, пракладку оптавалакновага кабелю, усталёўку табло зменнай інфармацыі, а таксама іншых элементаў ІТС, — растлумачыў ён.

Паводле яго слоў, сама сістэма відэаназірання на аўтамабільных дарогах — гэта аператыўная інфармацыя для дыспетчарскіх службаў заказчыкаў аб стане на самой дарозе.

— Па факце гэта дае поўную інфармацыю аб аварыйнасці дарогі. Іншымі словамі, калі ў зімовы час не пачышчана дарога ці галалёд, усё гэта будзе перададзена адпаведным службам, а таксама выведзена на табло для вадзіцеляў. Гэты працэс поўнасцю аўтаматызаваны дзякуючы датчыкам, якія счытваюць стан дарожнага пакрыцця, — дадаў Аляксандр Кісялёў.

Прадпрыемства ідзе наперад, і вось ужо ўводзіцца сістэма распазнання інцыдэнтаў на камерах.

— Камера запраграмавана так, што калі яна вызначае нейкі інцыдэнт, то інфармуе дыспетчара і выводзіць на найбліжэйшае табло інфармацыю. Цяпер у нас 520 камер. Раней гэта быў проста сродак інфармавання дыспетчараў, якім самім трэба было ўсё праглядаць і аналізаваць. Цяпер жа людзям будзе спрашчаць работу сістэма відэааналітыкі, — падзяліўся ён.

Сам Аляксандр Кісялёў працуе на прадпрыемстве з 2010 года. Паводле яго слоў, з кожным годам усё больш запыт на інтэлектуальныя дарогі.

— Заказчыкі вельмі сур'ёзна да гэтага ставяцца, і аб'ём абсталявання для таго, каб зрабіць дарогу інтэлектуальнай, толькі павялічваецца, — заключыў ён.

Акрамя ўсяго іншага, РУП «Белдарсувязь» ажыццяўляе падрыхтоўку мерапрыемстваў для таго, каб Мінтранс змог дасягнуць узроўню лічбавага развіцця, які даводзіць урад да кожнага дзяржаўнага органа.

Па словах **начальніка ўпраўлення перспектыўнага развіцця Станіслава КЛІБАШАВА,** РУП «Белдарсувязь» працуе з прадпрыемствамі Мінтранса і ажыццяўляе кантроль за ўнесенымі данымі.

— Цяпер кожнае прадпрыемства абавязана праходзіць ацэнку лічбавага развіцця. Адпаведна, гэты паказчык мы аналізуем, глядзім, штогод падаём інфармацыю Мінтрансу, акумулюем усе прапановы ад прадпрыемстваў для таго, каб можна было дасягнуць гэтага ўзроўню лічбавага развіцця, і рыхтуем план мерапрыемстваў. І ў далейшым будзем ажыццяўляць маніторынг іх выканання, — растлумачыў ён.



Калектыў вытворча-тэхнічнага ўпраўлення займаецца падрыхтоўкай да здачы аб'екта Р-46. *Злева направа:* інжынер-праекціроўшчык Яўген ХАНЕЦКІ, інжынер Алеся ДЗЯНІСАВА, начальнік упраўлення Аляксандр КІСЯЛЁЎ, інжынер-праекціроўшчык Наталля ІЎЛЕВА.

Работа ў задавальненне

Складана было б казаць пра нейкія вялікія дасягненні, калі б не работнікі прадпрыемства, якія нястомна працуюць для развіцця беларускіх дарог.

— Забяспечыць сваім супрацоўнікам дастойныя заработную плату, умовы працы і побыту, прыцягнуць да здаровага ладу жыцця — задачы, якія аб'ядноўваюць кіраўніцтва прадпрыемства і яго прафсаюзны камітэт, — адзначыў **начальнік аддзела прававой і арганізацыйна-кадравай работы Аляксандр ПІНЧУК.**

Клопат аб супрацоўніках відаць нязбройоным вокам. Так, у офісе прадпрыемства актыўна праводзіцца рамонт для таго, каб працоўны працэс быў максімальна камфортным.

— У нас склаўся прафесійны, згуртаваны і матываваны калектыў. Да нас вельмі шмат прыходзіць моладзі. Для яе створаны цудоўныя ўмовы. Кожнаму спецыялісту даецца месца ў інтэрнаце. Да таго ж новых працаўнікоў калектыў заўсёды прымае з радасцю, — падзяліласа **старшыня прафсаюзнага камітэта Ірына ХАРОНЖЫНА.**

Нам удалося заспець за працай двух маладых спецыялістаў: інжынераў-праграмістаў Андрэя Шулакова і Ульяны Дунаеву. Яны скончылі факультэт інфармацыйных тэхналогій БДТУ. Ульяна працуе на прадпрыемстве больш за год, а ў Андрэя толькі пачалося размеркаванне, хоць працаваць тут ён пачаў яшчэ падчас вучобы.

— Гэтае месца мне ва ўніверсітэце параілі, сказалі, што добрая арганізацыя, можна паспрабаваць свае сілы. Прыйшла на перадыпломную практыку, і па яе выніках ужо ўзялі ў штат, — падзялілася дзяўчына.

Маладыя людзі дадалі, што работа цікавая, з вялікай колькасцю розных тэхналогій. Досвед універсальны, які нідзе больш не атрымаеш.

Новых супрацоўнікаў матывуюць уступаць у прафсаюз. Не проста для птушачкі, а таму, што гэта рэальная магчымасць атрымаць дапамогу ад прадпрыемства. Па словах Ірыны Харонжынай, прафсаюзны камітэт робіць вельмі шмат для падтрымкі супрацоўнікаў. Гэта і выплаты да свят, а таксама юбілейных дат, і страхоўка, і падыкі на куплю жылых памяшканняў.



Маладыя спецыялісты: інжынеры-праграмісты Андрэй ШУЛАКОЎ і Ульяна ДУНАЕВА за работай.

Важную ролю ў сацыяльным жыцці прадпрыемства займае спорт. Так, сёлета каманда РУП «Белдарсувязь» стала ўжо двухразовым чэмпіёнам турніру па мініфутболе памяці Аляксандра Васільевіча Мініна, двухразовым чэмпіёнам горада Мінска па мініфутболе, пераможцамі і ўладальнікамі кубка горада Мінска па мініфутболе памяці Генадзя Браніслававіча Абрамовіча, а таксама сярэбранымі і бронзавымі прызёрамі першай лігі чэмпіянату Рэспублікі Беларусь па мініфутболе.

— Для трэніровак мы арандуем спартыўную залу. Кожную сераду нашы спартсмены ходзяць туды займацца, так што перамога гэта заслужаная. У нас дырэктар сам вядзе здаровы лад жыцця і заўсёды імкнецца да таго, каб і супрацоўнікі прытрымліваліся гэтага. У нас у калектыўным дагаворы нават прапісана такая норма, што супрацоўнікам, якія не кураць, належыць выплата памерам у тры базавыя велічыні раз на квартал. І, ведаеце, за два гады гэтай практыкі курцоў стала нашмат менш, — адзначыла Ірына Харонжына.

Летась прайшла першая спартакіяда сярод падраздзяленняў прадпрыемства, што выклікала непадробную цікавасць у супрацоўнікаў. І вось гэтай зімой ужо плануецца першая зімовая спартакіяда.

— Мы выязджаем, ладзім розныя спаборніцтвы. Гэта працуе на сяброўства і згуртаванне калектыву. Работнікі чакаюць гэтага з нецярпеннем, пытаюцца, калі ўжо будзе наступнае, — дадала старшыня прафсаюзнага камітэта.

Апроч гэтага, для работнікаў і членаў іх сем'яў штогод арганізоўваюцца паходы ў дэльфінарый, цырк, тэатр.

— Сям'я — гэта ячэйка грамадства, таму стараемся рабіць так, каб усе разам хадзілі на мерапрыемствы, — адзначыла Ірына Харонжына. — А яшчэ турыстычныя паездкі арганізоўваем. У гэтым годзе лёталі ў Баку. Было вельмі цудоўна, людзі засталіся задаволеныя. Да таго ж Грузію наведвалі, Карэлію.

Паводле яе слоў, дырэктар прадпрыемства Мікалай Уладзіміравіч старэецца ўсё зрабіць так, каб калектыву было максімальна добра, каб людзі працавалі з задавальненнем. Верагодна, у гэтым і ёсць залог поспеху і вялікіх дасягненняў.

Каманда РУП «Белдарсувязь» — двухразовыя чэмпіёны турніру па мініфутболе памяці А. В. Мініна.

Алена ДАЎЖАНОК, Лізавета ГОЛАД. Фота Лізаветы ГОЛАД і з архіва прадпрыемства.

УНП 190304566

ЦЭЛАЯ ЭПОХА ДАРОЖНАЙ ГАЛІНЫ КРАІНЫ

Паважаныя калегі, дарагія сябры!

Вось ужо 55 гадоў ААТ «Дарожна-будаўнічы трэст № 3» здзяйсняе свой унёсак у развіццё дарожнай галіны краіны. Мы пераадольвалі цяжкасці, сутыкаліся з выклікамі, але заўсёды знаходзілі рашэнні, ідучы ў нагу з часам, і ніколі не забывалі пра галоўныя прынцыпы нашай працы — надзейнасць і бяспеку. Дзякуй вам, паважаныя калегі, за адказны падыход да прафесіі. Ваша адданасць справе, адказнасць і калектыўны дух — гэта тое, што дазваляе нам рухацца наперад і адкрываць новыя гарызонты. Жадаю вам і надалей заставацца лідарамі сваёй галіны, развіваць і ўмацоўваць прадпрыемства. Наперадзе нас чакаюць вялікія мэты, якіх мы абавязкова дасягнем.

Генеральны дырэктар ААТ «Дарожна-будаўнічы трэст № 3» Валерый ПАЛЯКЕВІЧ.

Ад мінулага да сучаснасці

Гісторыя прадпрыемства пачалася ў кастрычніку 1969 года, калі на базе трох дзейных тады дарожна-будаўнічых раёнаў і мостабудаўнічай арганізацыі быў створаны «Дарожна-будаўнічы трэст № 3».

Ім прыйшлося прайсці праз шмат выпрабаванняў. Падчас аварыі на Чарнобыльскай АЭС дарожнікі ехалі ў пацярпелыя гарады і вёскі, нягледзячы на небяспеку, і самаддана працавалі. Нялёгкім быў і час перабудовы, калі заказаў не хапала і аб'ёмы дарожнага будаўніцтва няўхільна зніжаліся. Аднак менавіта гэты шлях загартаваў і паказаў, што не варта здавацца, нягледзячы ні на што.

На словах **генеральнага дырэктара Валерыя ПАЛЯКЕВІЧА,** ДБТ № 3 — гэта цэлая эпоха дарожнай галіны краіны.

— За больш чым паўвекавую гісторыю прадпрыемствам было рэалізавана нямала буйных і значных праектаў. Мы зарэкамендавалі сябе надзейнымі партнёрамі, якія выконваюць якасную работу на любых аб'ектах: ад дарог мясцовага і рэспубліканскага значэння да міжнародных трас, — адзначыў ён.

Усе дасягненні прадпрыемства ацэньваюцца па заслугах. Так, другі год запар ДБТ-3 атрымлівае званне «Найлепшая будаўнічая арганізацыя па горадзе Магілёве». Таксама прадпрыемства стала «Арганізацыяй года» ў Рэспубліканскім конкурсе на найлепшыя дасягненні ў будаўнічай галіне Рэспублікі Беларусь «Будаўнікі Алімп 2024».

Падрыхтоўчыя работы пад дарожны камень.

Якія перспектывы ў ДБТ № 3

Новы праспект «17 Верасня».

Кіраўнік праекта Юрый БУЯКОЎ прадстаўляе план праходжання пуцеправода-дубляра.

Работа кіпіць

Адзін з самых значных праектаў прадпрыемства сёння — будаўніцтва пуцепавода-дубляра «вуліца Якубоўскага — Загародная шаша» ў Магілёве, які атрымаў афіцыйную назву праспект «17 Верасня». І гэта невыпадкова: будаўніцтва было разбіта на тры чаргі, і кожную з іх здавалі якраз да гэтай даты.

— Будаўніцтва вялося з 2020 года. Падрыхтоўка пачалася яшчэ раней. Увогуле, увесь шлях ад ідэі да рэалізацыі заняў восем гадоў, — падзяліўся **кіраўнік праекта Юрый БУЯКОЎ.**

Паводле яго слоў, гэта вельмі значны праспект для Магілёва.

Керамаграніт выкарыстоўваецца для абліцоўкі фасаду будынкаў, прадукцыя сёння надзвычай запатрабаваная, як і буйнафарматная плітка. Паводле слоў **генеральнага дырэктара прадпрыемства Віталя МІХНЮКА,** ажыццяўленне праекта стала істотным крокам у справе павышэння якасці і канкурэнтаздольнасці прадукцыі. Новая лінія эфектыўна працуе на павелічэнне аб'ёмаў без страты якасці. Новыя магчымасці адкрыліся менавіта дзякуючы перадавому абсталяванню. Тут стаіць больш доўгая печ, чым на ранейшых вытворчасцях. Момант рэкуперацыі — адбору і паўторнага выкарыстання цяпла для эканоміі энерганосьбітаў — з гэтай лініі прымяняюцца больш дакладна. Такім чынам эканоміцца да 5—7 % цеплавой энергіі для вытворчасці прадукцыі, што зніжае сабекошт. Таксама ўстаноўлена новая лічбавая машына, якая дае магчымасць стварання розных рэльефаў.

Урачыстая цырымонія запуску новай тэхналагічнай лініі, як ужо гаварылася, адбылася ў пачатку гэтага года. **Намеснік прэм'ер-міністра краіны Анатоль СІВАК,** які прысутнічаў на цырымоніі, гаварыў тады, што рэалізацыя праекта дэманструе, як выконваюцца даручэнні кіраўніка дзяржавы. Першае з іх датычыцца праграмы «Адзін раён — адзін праект», другое — паляпшэння якасці прадукцыі. «Калі рэалізавалі гэты праект, было вырашана некалькі задач. Задзейнічаны вытворчыя пляцоўкі, якія да апошняга часу не выкарыстоўваліся. Раён атрымаў новыя рабочыя месцы. Прадпрыемства, рэгіён атрымалі інвестыцыі», — сказаў віцэ-прэм'ер.

Дэпутат Палаты прадстаўнікоў па Пружанскай акрузе, у якую ўваходзіць і Бяроза, **Юрый НАРКЕВІЧ** не так даўно наведваў гэтае прадпрыемства, сустракаўся з калектывам. Карэспандэнту газеты дэпутат сказаў, што адкрытае акцыянернае таварыства «Бярозабудматэрыялы» ўяўляе сабой узор прадпрыемства, якое ўвесь час развіваецца: «Тут прыцягваюць інвестыцыі, працуюць над новымі праектамі. Апошні, напрыклад, даў магчымасць стварыць дадаткова 26 новых рабочых месцаў. Плануецца рэканструяваць маса-нарыхтоўчы цэх. І галоўнае, што людзі працуюць з добрым настроем. Сярэдняя зарплата даўно перавысіла 2000 рублёў. Прадпрыемства забяспечвае добры сацпакет, магчымасці для павышэння кваліфікацыі і кар'ернага росту працаўнікоў».

Старшыня камітэта эканомікі Брэсцкага аблвыканкама Наталлля АЛЯХНОВІЧ зазначыла, што з 24 праектаў праграмы «Адзін раён — адзін праект» на імпартазамяшчэнне накіраваны 18, гэта значыць абсалютная большасць. Рэалізацыя ўсіх праектаў дазволіць стварыць у рэгіёне дадатковa каля 980 рабочых месцаў.

Святлана ЯСКЕВІЧ.
Фота з адкрытых крыніц.

«Дасканаласць якасці — дасканаласць смаку»

Менавіта такі лозунг абрала для сваёй работы маладое прадпрыемства ў Бешанковіцкім раёне «Скорпіа-Кветка», якое спецыялізуецца на вытворчасці харчовых араматызатараў. Праект з'яўляецца імпартазамяшчальным і экспартаарыентаваным, носіць статус адзінага вытворцы харчовых араматызатараў, у тым ліку са статусам «натуральныя» ў Рэспубліцы Беларусь.

Таварыства з абмежаванай адказнасцю «Скорпіа-Кветка» адкрылася ў мінулым годзе ў рамках інвестыцыйнай праграмы «Адзін раён — адзін праект». Пры выбары месца для будучай вытворчасці восенню 2021 года вывучалі розныя пляцоўкі, але ў межах Віцебскай вобласці. Найлепшым варыянтам аказаўся Бешанковіцкі раён: тут у аграрадарку Будзілава пуставала памяшканне былога Каранеўскага дзіцячага сада — базавай школы. За кароткі тэрмін інвестар прарабіў усю неабходную падрыхтоўку, каб прыступіць да выпуску прадукцыі: былі адрамантаваны памяшканні будынка, закуплена і завезена абсталяванне. І, самае галоўнае, пастаўлена мэта — заняць лідзіруючае месца сярод прадпрыемстваў харчовай прамысловасці Беларусі і цалкам задаволіць патрэбы рынку з улікам развіцця прагамы імпартазамяшчэння.

«У адрозненне ад Расіі і Азіяцкага рэгіёна, дзе развіты невялікі прыватны бізнес, у Беларусі захаваліся буйныя прадпрыемствы, якімі славіцца краіна яшчэ з савецкіх часоў. Таму калі «Скорпіо-Аромат» разглядала варыянты развіцця, Беларусь выбралі з улікам прамысловага патэнцыялу харчовай галіны і геаграфічнага становішча», — расказвае **дырэктар ТАА «Скорпіа-Кветка» Аляксандр КЛУБКОЎ.**

Бізнэс дырэктар развівае разам з жонкай. Яна Клубкова адзначае, што мясцовыя ўлады аказалі інвестарам усебаковую падтрымку. «Спрацавалі бліскуча, гонар ім і хвала. Старшыня райвыканкама Галіна Ануковіч і намеснік старшыні па эканоміцы Таццяна Ждановіч распісалі план, што, навошта і як рабіць, паабяцалі дапамагчы афарміць дакументы — і слова стрымалі. Нам дапамагалі прайсці ўсе бюракратычныя этапы. Была школа, а цяпер прадпрыемства, таму трэба было вырашаць пытанні з рознымі службамі, зрабіць праект. Сышло нямала часу. І нарэшце запусціліся, пачалі рабіць свае араматызатары», — успамінае намеснік дырэктара.

Раней араматызатары на беларускія прадпрыемствы пастаўлялі з Польшчы, Літвы, Германіі, Францыі. Каб не залежаць ад палітычных капрызаў Захаду, Прэзідэнт паставіў задачу павышаць долю імпартазамяшчальных вытворчасцяў. Інгрэдыенты для харчовых араматызатараў у Беларусь завозяцца з дружалюбных краін — Кітая, Індыі і Іншых.

Цяпер ТАА «Скорпіа-Кветка» абсталявала цэхі для вытворчасці сухіх і вадкіх араматызатараў і выбрала шырокую лінейку араматызатараў уласнай вытворчасці для ўсіх галін харчовай прамысловасці па ліцэнзіі расійскага ТАА «Скорпіо-Аромат», вытворцы больш за 10 000 рэцэптур араматызатараў у сухой, вадкай, пастападобнай і грануляванай формах. На дадзены момант араматызатары з гандлёвай маркай ТАА «Скорпіо-Аромат», якія пастаўляюцца ТАА «Скорпіа-Кветка» як эксклюзіўным дылерам у Беларусі, выкарыстоўваюцца ўсімі вядучымі вытворцамі харчовай (кандытарскай і малочнай) прадукцыі краіны. Сярод іх — СТАА «Камунарка», ААТ «Чырвоны харчавік», ААТ «Чырвоны мазыранін», ААТ «Слодыч», ААТ «Бабуліна крынка», ААТ «Мінскі малочны завод № 1», ААТ «Мінскі маргарынавы завод», ТДА «Фірма АВС» і іншыя.

«Мы задэкларавалі каля 60 узораў нашай прадукцыі, найбольш запатрабаваных на прадпрыемствах харчовай галіны Беларусі, а іх тысячы, і ўсё гэта можна рабіць тут. Так што ёсць куды развівацца», — расказвае аб перспектывах дарэктар прадпрыемства Аляксандр Клубкоў.

З Кітая закупілі лінію разліву харчовых араматызатараў у дробную тару для пастаўкі іх у Расію. З пачатку рэалізацыі праекта ў яго ўкладзена больш за 600 тысяч рублёў. Важна, што інвестыцыйны праект стварыў для людзей новыя працоўныя месцы, што ў глыбінцы асабліва важна. Пакуль на прадпрыемстве працуюць 12 чалавек, амаль усе члены калектыву — людзі мясцовыя, некаторыя спецыялісты прыязджаюць з Віцебска. Кіраўніцтва ТАА «Скорпіа-Кветка» прапаноўвае работнікам канкурэнтную зарплату, каб людзі імкнуліся працаваць і атрымліваць больш. У памяшканні былой школы абсталяваны офісы, душавыя кабіны і пакой адпачынку для работнікаў, складскія памяшканні. На прадпрыемстве ўсталявалі ўласную сістэму ачысткі і абезжалезвання вады.

«Для нашага раёна, дзе прамысловыя прадпрыемствы можна пералічыць па пальцах адной рукі, любая створаная, нават невялікая вытворчасць мае вялікае значэнне. Гэта і новае жыццё пустым будынкам, і інвестыцыі, і падатковыя паступленні ў бюджэт. Вядома, новыя рабочыя месцы, прычым нават не ў райцэнтры, а ў аграрадарку, што асабліва каштоўна для нас. Гэты праект, які рэалізоўваецца ў рамках прэзідэнцкай ініцыятывы «Адзін раён — адзін праект», цалкам адлавядае таму, на што нацэлілі Кіраўнік дзяржавы: «Людзям патрэбна праца там, дзе яны жывуць». Толькі так, ствараючы новыя вытворчасці, новыя працоўныя месцы ў глыбінцы, можна яе развіваць, спрыяць росту дабрабыту яе жыхароў», — адзначыла **начальнік аддзела эканомікі Бешанковіцкага райвыканкама Людміла ХАДЗЯНОК.**

Аляксандра ГВОЗДЗЕВА.
Фота з архіва прадпрыемства.

НА ГАДЫ НАПЕРАД

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Слыніўся начальнік галоўнага ўпраўлення і на навінах, якія прадугледжваюць грант на навучанне замежным грамадзянам і асобам без грамадзянства, якія пражываюць за мяжой, па адукацыйнай праграме падрыхтоўкі асоб да паступлення ва ўстановы вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі. Робіцца гэта, паводле яго слоў, для прасоўвання беларускай сістэмы адукацыі ў замежных краінах. Але ёсць нюанс.

— Адной з умоў выдзялення грантаў на навучанне з'яўляецца веданне рускай мовы, — падкрэсліў Сяргей Пішчоў.

Яшчэ адно сур'ёзнае моўавыдзяленне — абавязковае ўзгадненне ўстановамі адукацыі размеркавання і перамеркавання выпускнікоў з арганізацыямі — заказчыкамі кадраў, выканаўчымі камітэтамі, а таксама асобнымі галіновымі міністэрствамі. Не менш важна і тое, што ўзмоцнена адказнасць заказчыкаў кадраў па мэтавай падрыхтоўцы. Цяпер на заканадаўчым узроўні замацаваны абавязкі кампенсаваць сродкі, затрачаныя дзяржавай на падрыхтоўку спецыялістаў, у выпадку неабгрунтаванага скасавання або невыканання ўмоў дагавора аб мэтавай падрыхтоўцы спецыяліста, рабочага, слухача.

Добрая навіна для ўстаноў дадатковай адукацыі дарослых: яшчэ адной унесенай у Кодэкс нормай даецца магчымасць прысвоення ім статусу бізнес-школы.

— Гэта робіцца для папулярызацыі такога віду адукацыі, падрыхтоўкі будучых кіраўнікоў у рамках праграм дадатковай адукацыі дарослых, у тым ліку для выхаду на знешні контур, — удакладніў прадстаўнік Мінадукацыі і расказаў яшчэ аб адной цікавай прапанове — праве на стыпендыю Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па рашэнні Кіраўніка дзяржавы навучэнцам, якія атрымліваюць адукацыю не толькі за кошт сродкаў рэспубліканскага бюджэту, але і ў прыватных установах адукацыі.

ПТА І ССА: ПАДТРЫМКА АСАБЛІВЫХ НАВУЧЭНЦАЎ

Намеснік начальніка Галоўнага ўпраўлення прафесійнай адукацыі — начальнік упраўлення прафесійна-тэхнічнай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі Міністэрства адукацыі Аляксандра ПЯТРОВА расказала пра змены ў Кодэкс, якія датычацца навучэнцаў з АПФР, падкрэсліўшы пры гэтым, што навацыі істотныя.

Гаворка ідзе пра навучэнцаў, якія скончылі школу і атрымалі пасведчанне аб агульнай базавай адукацыі. Але іх здароўе пагоршылася, і ім рэкамендуюць навучанне без агульнай сярэдняй адукацыі.

— У практыцы рэалізацыі адукацыйнай праграмы прафесійна-тэхнічнай адукацыі на аснове спецыяльнай ёсць выпадкі, калі ў гэтыя групы просяць залічыць дзяцей з падобнымі праблемамі. Такія прэзідэнты, на жаль, здараюцца ўсё часцей, таму ў Кодэкс аб адукацыі было вырашана ўнесці допуск такіх навучэнцаў да рэалізацыі праграмы прафесійна-тэхнічнай адукацыі без агульнай сярэдняй. Важна: у іх павінна быць адпаведнае накіраванне, якое выдаюць цэнтры карэкцыйна-развіццёвага навучання і рэабілітацыі. Калі мы паказана навучанне, мы ў выключным выпадку дапускаем да яго, — заазначыла спецыялістка.

Яшчэ адной навацыяй стане вызваленне ад кампенсацыі сродкаў асоб, якія атрымалі адукацыю на аснове праграмы спецыяльнай адукацыі.

— Рабочае месца ім даецца і сёння і будзе даваць у далейшым на тых жа ўмовах, — тлумачыць Аляксандра Пятрова. — На дзяржаўным узроўні прынята рашэнне: калі па нейкіх прычынах такі выпускнік не можа працаваць, то з прычыны выключнасці дадзеная катэгорыя трэба вызваліць яго ад кампенсацыі сродкаў.

АГУЛЬНАЯ СЯРЭДНЯЯ І ДАШКОЛЬНАЯ АДУКАЦЫЯ: НУЛЬ МОЖНА АНУЛЯВАЦЬ

Адно з важных нова'вядзенняў датычыцца выпускнікоў школ. Як адзначыла **намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення агульнай сярэдняй і дашкольнай адукацыі — начальнік упраўлення агульнай сярэдняй адукацыі Міністэрства адукацыі Ірына КАРЖОВА,** навучэнцы з нулявым вынікам цэнтралізаванага іспыту змогуць яго перасдаць. Ім будзе дадзена права яшчэ раз паспрабаваць свае сілы ў жніўні.

Цяпер выпускнікам, якія атрымалі нуль балаў на ЦЭ, не выдаецца ні сертыфікат цэнтралізаванага іспыту, ні атэстат аб агульнай сярэдняй адукацыі — толькі даведка аб навучанні. Адзнаку можна выправіць, але толькі на наступны год, прайшоўшы выніковую атэстацыю ў парадку экстэрнату. Змяненні ў Кодэксе карэкціруюць сітуацыю і дазваляюць школьнікам атрымаць абодва дакументы ў тым жа годзе, і ў выпадку станоўчай адзнакі ў выпускніка'з'яўляецца магчымасць працягнуць адукацыю ў каледжы. Яшчэ адной навацыяй у сферы ЦЭ стане замацаванне ў Кодэксе практыкі правядзення рэпетыцыі цэнтралізаванага іспыту, а таксама вызвалення ад цэнтралізаванага і выпускнога іспытаў навучэнцаў 11 класа па медыцынскіх паказаннях.

Таксама па новых нормах навучальныя заняткі для вучняў 10 класаў будуць завяршацца 25 мая, як і для вучняў 9 і 11 класаў. Як вядома, вучні 10 класаў у пачатку чэрвеня праводзяць вучэбна-палявыя зборы. Гэта не толькі фактычна падаўжае школьнікам навучальны год, але і ўносіць некаторыя цяжкасці ў афармленне пэўных дакументаў.

— Норма дазволіць праводзіць зборы да 1 чэрвеня, і з першага дня лета дзеці ўжо будуць на канікулах, — падсумавала Ірына Каржова.

Яшчэ адно пытанне — бясплатнага падвозу школьнікаў у сельскай мясцовасці — таксама павінна вырашыцца. Сёння правам бясплатнага падвозу школьныміі аўтобусамі карыстаюцца дзеці, якія пражываюць у сельскай мясцовасці, дзе няма школы. Не ўлічваліся буйныя населеныя пункты, дзе ёсць школы, але адлегласць іх ад дома школьніка — практычна як да суседняй вёскі. Гэтую праблему, дарэчы, узнялі жыхары рэгіёнаў: чаму б аўтобусу, які падвозіць дзяцей з вёсак, не забіраць па дарозе юных жыхароў такога населенага пункта? Прапанову палічылі рацыянальнай.

— Яна дазволіць у вёсках вялікай працягласці рабіць прыпынкі школьнага аўтобуса для школьнікаў, якія пражываюць там, — сказала Ірына Каржова.

На заканадаўчым узроўні плануецца замацаваць норму аб тым, што вучні школ павінны прысутнічаць на навучальных занятках у адзенні дзелявога стылю. Акрамя, канешне, фізкультуры і працоўнага навучання.

Алена ВІНАГРАДАВА.

❍ У тэму

Дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, член Пастаяннай камісіі па адукацыі, культуры і навуцы Сяргей КЛІШЭВІЧ:

— Законапраект прыняты ў першым чытанні, і гэта значыць, што дэпутаты пагадзіліся канцэптуальна з тымі прапановамі, якія былі ўнесены ўрадам у Палату прадстаўнікоў. На гэты момант ідзе іх шліфоўка. 17 кастрычніка адбылося фінальнае пасяджэнне рабочай групы, дзе дэталёва разглядалася кожнае з іх.

Сёння даволі часта гучыць меркаванне аб тым, што, маўляў, хопіць уносіць змены, выдаць нам дакумент, па якім мы будзем працаваць сёння і ў будучыні. Але я хачу адзначыць, што змены, якія ўнесены, усе карэкціроўкі — гэта не ініцыятыва органаў кіравання. Гэта ініцыятыва ад людзей — педагогаў, выхавальнікаў, бацькоў, якія сутыкнуліся з некаторымі праблемамі, і цяпер проста шліфуюцца шурпатасці, каб у далейшым тых праблем не ўзнікала. Мы ўсяго толькі імкнёмся палегчыць жыццё нашай настаўніцкай і бацькоўскай супольнасці. Даём магчымасць ім карыстацца на поўную моц тымі сацыяльнымі гарантыямі, якія дае дзяржава ў сферы адукацыі.

Другі крытэрый, якім кіруемся, — захаванне справядлівасці. Размова, у прыватнасці, ідзе аб мэтавым навучанні. Мы з вамі павінны разумець, што людзі, якія атрымалі льготнае права паступаць у вышэйшую навучальную ўстанову без экзаменаў або ў спрошчанай форме, павінны несці адпаведную нагрузку ў параўнанні з тымі, хто рыхтаваўся да паступлення.

Акрамя таго, на гэтых людзей зроблены мэтавы запыт. Калі арганізацыя адмаўляецца іх прымаць, то, па-першае, яна і нясе адказнасць, бо абавязкава ўзяць сабе спецыялістаў, падрыхтаванага за бюджэтныя грошы. Па-другое, чалавек, які паступаў на льготных умовах, павінен сказаць «дзякуй» дзяржаве ў выглядзе адпрацоўкі ў пяць гадоў, як і планавалася. І гэта справядліва. Ніхто не дасць паразітаваць у нашай краіне на бюджэце, на тых грошах, якія зарабляюць працаўнікі сяла і прамысловасці.

Другі момант справядлівасці — гэта наданне статусу педагагічных работнікаў выхавацелям дзіцячых дамоў сямейнага тыпу, іншымі словамі, маці і татам прыёмных дзяцей. Яны ўзялі на сябе вялікую адказнасць і гадуюць, выхоўваюць тры, пяць, дзесяць, а то і больш дзяцей. Яны з імі дваццаць чатыры гадзіны за суткі і сем дзён на тыдзень. Зразумела, што яны нясуць такую ж функцыю, займаюцца такой жа справай, што і педагогі ва ўстановах адукацыі.

Соцыум

Высокі попыт дыктуе цэны

Колькі каштуе адпачынак у беларускім санаторыі ў асенне-зімовы перыяд і на Новы год?

У беларускіх здраўніцах з пачатку года адпачылі 1,22 мільёна чалавек, сярод іх больш за 190 тысяч замежных грамадзян. Каля 600 тысяч беларусаў адпачылі з выкарыстаннем ільгот і сродкаў рэспубліканскага бюджэту. Па пуцёўках у свабодны рэалізацыі адзін дзень у стандартным нумары у сярэднім каштаваў 110 рублёў, летам — 125. Ці патанеюць пуцёўкі ў асенне-зімовы перыяд і колькі будуць каштаваць навагодняя святы ў санаторыі, расказаў дырэктар Рэспубліканскага цэнтра па аздараўленні і санаторна-курортным лячэнні насельніцтва Генадзь БАЛБАТОЎСКІ.

Галоўная каштоўнасць

У перыяд летняй аздараўленчай кампаніі адзначаўся павышаны попыт на паслугі санаторна-курортных і аздараўленчых арганізацый. Усе ўстановы працавалі з максімальнай загрузкай, у тым ліку высокімі былі попыт і запаўняльнасць у верасні.

За дзевяць месяцаў бягучага года ў параўнанні з аналагічным перыядам 2023-га колькасць тых, хто прайшоў аздараўленне і лячэнне ў санаторыях, павялічылася на 5,5 % і склала 1 мільён 220 тысяч чалавек. Выручка ад санаторна-аздараўленчых паслуг за гэты перыяд вырасла на 16 % і ў абсалютных лічбах перавысіла 990 мільёнаў рублёў.

Традыцыйна павышаным у летнія месяцы быў попыт з боку замежных грамадзян. У беларускіх здраўніцах адпачылі 190,5 тысячы чалавек з іншых краін — на 18 % больш у параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года. Выручка па экспарце паслуг вырасла на 36 % і склала 320 мільёнаў рублёў.

— Па колькасці замежных грамадзян мы не дасягнулі дакавіднага ўзроўню, калі была дастаткова вялікая ўдзельная вага жыхароў Заходняй Еўропы. Сёння больш за 90 % складаюць нашы ўсходнія суседзі, але нельга сказаць, што зусім няма цікавасці ад жыхароў прыбалтыйскіх краін і Польшчы. Сёлета штодзённа ў нашых санаторыях знаходзілася каля 150 жыхароў прыбалтыйскіх краін. І калі браць статыстыку па колькасці замежнікаў, то пасля беларусаў і расіян па колькасці адпачывальнікаў Латвія і Літва стаяць на 3 і 4 месцах. І бязвізавы рэжым гэтаму садзейнічае. Мы будзем імкнуцца нарошчваць колькасць замежных грамадзян. Здароўе — галоўная каштоўнасць чалавека, незалежна ад таго, у якой краіне ён жыве. І калі ён атрымлівае відавочны медыцынскі і аздараўленчы эфект, то сёння ніякія граніцы яго не стрымаюць, — падзяліўся мерканаваннем Генадзь Балбатоўскі.

Ці даступныя здраўніцы беларусам?

Ён адзначыў, што даступнасць санаторыяў для беларусаў застаецца высокай. Калі раней суадносіны беларусаў і замежных грамадзян былі 60 на 40, то на працягу апошніх 2-3 гадоў — 70 на 30 на карысць беларусаў.

— З пункту погляду гэтых лічбаў, даступнасць для беларусаў высокая. Акрамя таго, за дзевяць месяцаў 600 тысяч беларусаў прайшлі аздараўленне з выкарыстаннем ільгот і сродкаў рэспубліканскага бюджэту. Таму нельга сказаць, што гэта недаступна для нашых грамадзян. Але мы ставім перад сабой мэту павелічэнне экспарту паслуг. Максімальныя лічбы па колькасці замежнікаў у нашых санаторыях былі ў 2019 годзе — 241 тысяча. Сёлета аздараўленне прайшлі ўжо 190,5 тысячы, і з улікам тых тэндэнцый, якія мы назіраем, па прагнозах, мы перавысім гэту лічбу. А памер выручкі 2019 года мы перавысілі яшчэ два гады таму, — адзначыў Генадзь Балбатоўскі.

Што датычыцца цэн, то на выніках дзевяці месяцаў адзін дзень па пуцёўках з свабоднай рэалізацыі ў стандартным двухмесным нумары каштаваў 110 рублёў. Сёлета цэны ў параўнанні з мінулым годам павялічыліся ў межах пяці працэнтаў, што ўкладваецца ў рамкі даведзеных макраэканамічных паказчыкаў.

— Сёння санаторыі працуюць у рынкавых умовах, і попыт адлюстроўваецца ў цэнах. Калі ёсць 100-працэнтная запаўняльнасць на працягу дзевяці месяцаў, то мы можам казаць пра адэкватнасць цэн, — дадаў кіраўнік Рэспубліканскага цэнтра па аздараўленні і санаторна-курортным лячэнні насельніцтва.

Дарэчы, у летні перыяд па прычыне павышанага попыту цэны былі вышэйшымі. Адны суткі ў стандартным двухмесным нумары каштавалі 125 рублёў. У чацвёртым квартале прагназуецца, што дзякуючы скідкам ад уласніка ў параўнанні з летнім перыядам цана зменшыцца да 115 рублёў, але яна ўсё роўна будзе вышэйшай за сярэднюю па выніках дзевяці месяцаў. Што датычыцца навагоднягага перыяду, кошт аднаго дня складзе 139 рублёў, у параўнанні з мінулым годам ён вырасце на 10 %. Сярэдняя цана навагоднягага банкета чалавека ў межах 250 рублёў.

Дарэчы, большасць месцаў у здраўніцах ужо забранірованы да канца гэтага года. У прыватнасці, на лістапад зарэзервавана 88 % месцаў, на снежань — 65 %, на студзень 2025-га — 57 %. Высокі працэнт браніравання і на навагоднія святы — 84 % месцаў ужо занята. Але ахвотныя сумясціць аздараўленне з навагодняй банкетам у адным з санаторыяў яшчэ маюць усе шанцы знайсці цікавыя прапановы.

Не толькі для пажылых

Перад санаторыямі стаіць мэта прыцягваць больш маладых людзей.

— Хочам памяняць стэрэатып, які склаўся, што санаторыі — месца знаходжання для асоб з медыцынскімі дыягназамі і людзей сталага веку. Сёння санаторыі становяцца шматфункцыянальнымі аб'ектамі, якія аказваюць шырокі спектр паслуг, прычым не толькі медыцынскіх. Таму штогод узрастаны цэнз змяншаецца. Мы шырока пазіцыянуем сямейны адпачынак, шмат робіцца ўкладанняў у матэрыяльна-тэхнічную базу. Напрыклад, па выніках дзевяці месяцаў на чвэрць вырасла фінансаванне ў параўнанні з мінулым годам па набыцці абсталявання і правядзенні рамонтнабудаўнічых работ. Гэта лічба склала 136 мільёнаў рублёў, у той час як за ўвесь 2023 год яна склала 159 мільёнаў. З улікам такой дынамікі па выніках года яна складзе каля 200 мільёнаў на ўмацаванне матэрыяльна-тэхнічнай базы, — паведаміў Генадзь Балбатоўскі.

Дарэчы, колькасць месцаў апошнія дзесяць гадоў не мянялася і складае 28 тысяч. Новыя аб'екты з'яўляюцца, але істотнага росту няма, бо пры рэканструкцыі старога нумарнога фонду ўласнікі імкнуцца да паляпшэння ўмоў пражывання — часта з двух нумароў робяцца адзін на карысць камфорту.

— Колькасць ложкавага фонду, які маецца, парытэтная і задавальняе патрэбу. Аднак улічваючы ўстойлівы попыт на дадзены від паслуг і перспектыўнасць такога віду адпачынку, па даручэнні Урада мы распрацавалі пералік патэнцыяльных месцаў, дзе могуць быць пабудаваны новыя аб'екты. Яны прывязаны да прыродных лячэбных фактараў. Сёння гэта некалькі дзясяткаў месцаў, якія могуць быць выкарыстаны для ўкладання інвестыцый у будаўніцтва санаторна-курортных цэнтраў. Гэты пералік даведзены да ўсіх аблвыканкамаў і, мяркую, што ў найбліжэйшы час мы пачнём больш актыўна пазіцыянаваць гэтыя месцы для прыцягнення інвестараў і будаўніцтва новых аб'ектаў, — праінфармаваў суразмоўца.

Заяўкі для дзяцей задавольваюцца цалкам

Падчас дзіцячай летняй аздараўленчай кампаніі заяўкі былі задаволены, і ўсе, хто мэтазгодна і жаданне, атрымалі пуцёўкі ў лагеры. На гэтыя мэты Рэспубліканскім цэнтрам па аздараўленні і санаторна-курортным лячэнні насельніцтва было выдаткавана больш за 60 мільёнаў рублёў. У летніх лагерах адпачыла і аздаравілася 399 тысяч дзяцей (на 11 тысяч больш у параўнанні з мінулым годам).

Восеннюю плануецца арганізаваць аздараўленне падчас канікул, якія пачынаюцца 28 кастрычніка. Аздараўленне пройдуць каля 70 тысяч дзяцей. Заяўкі таксама будуць задаволены ў поўным аб'ёме, фінансаванне для гэтых мэт ужо выдаткавана. Прыкладна такая ж колькасць дзяцей пройдзе аздараўленне ў перыяд зімовых канікул.

Алена КРАВЕЦ.

Новыя кнігі

ПРАЗ ЛЁСЫ СУАЙЧЫНКАЎ

Выйшаў у свет біяграфічны слоўнік «Беларусь — Расіі і свету: 300 гадоў», які аб'яднаў 2671 артыкул, прысвечаны ўраджэнцам Беларусі, беларусам, нашчадкам беларусаў, якія праявілі сябе найперш у ваеннай службе, дзяржаўнай справе, навуцы ў Расійскай імперыі, Савецкім Саюзе, Расійскай Федэрацыі ў перыяд з 1721 да 2021 года. Словам, за тры стагоддзі!.. Аўтар унікальнага навуковага і творчага праекта, які здзейснены па заказе і пры фінансавай падтрымцы Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь, — доктар гістарычных навук, прафесар Мікалай Печань.

Мікалай Анатольевіч Печань нарадзіўся ў 1957 годзе ў вёсцы Будзілаўка Докшыцкага раёна на Віцебшчыне. Закончыў Новасібірскае вышэйшае ваенна-палітычнае агульнавайсковае вучылішча, Ваенна-палітычную акадэмію імя У. І. Леніна. Каля 30 гадоў жыцця аддаў вайсковай службе. Займаў пасаду намесніка начальніка Цэнтральнага музея Узброеных сіл Расійскай Федэрацыі па навуковай рабоце. Прафесар. Кола навуковых зацікаўленняў нашага земляка — традыцыі афіцэрскага корпуса, воінскія сімвалы, подзвігі і гераізм салдат і афіцэраў, рытуалы Рускай імператарскай арміі. І, безумоўна, — лёсы беларусаў у самыя розныя перыяды гісторыі Расіі. Мікалай Анатольевіч з'яўляецца аўтарам 300 навуковых, навукова-публіцыстычных артыкулаў, нарысаў, у тым ліку і 30 кніг па гісторыі Узброеных сіл Расіі і патрыятычным выхаванні.

— Я рады, што кніга, над якой я працаваў многія гады, выйшла менавіта ў Беларусі, у Выдавецкім доме «Звязда», — гаворыць Мікалай Печань. — Удзячны Міністэрству інфармацыі Рэспублікі Беларусь, яго цяперашняму кіраўніцтву, удзячны Уладзіміру Барысавічу Пярцову, які пры ўсёй занятасці разгледзеў за самой ідэяй расказаць пра лёсы нашых суайчыннікаў важную і гістарычную, і выхавачую справу. Сама ідэя доўга выкрышталізоўвалася ў маёй свядомасці. І мне пашчасціла ў сваім жыцці выкласці яе, атрымаць маральную, арганізацыйную падтрымку ад Старшыні Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь у 2008—2024 гады Уладзіміра Андрэйчанкі, старшыні Парламенцкай камісіі па правах чалавека, нацыянальных адносінах і сродках масавай інфармацыі Мікалая Бузіна, гісторыка і палітыка Вячаслава Даніловіча, акадэміка Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Аляксандра Кавалені, старшыні ФНКА «Беларусы Расіі» Сяргея Кандыбовіча і іншых яркіх асоб, якія і парадзі давалі, і першымі маімі рэцэнзентамі выступалі. Вельмі прыемна было працаваць з кніжнай групай «Звязды» на чале з Наталляй Генадзьеўнай Шчарбаковай. Шмат што я рэдагаваў, дадаваў ужо ў час падрыхтоўкі кнігі да выдання. І гэта не выклікала ніякіх складанасцяў у стасунках з рэдактарамі кнігі, усе праяўлялі зацікаўленасць у тым, каб біяграфічны даведнік склаўся, быў выдадзены найлепшым чынам. Канешне ж, мне, збіраючы інфармацыю для дадзенага выдання, давялося ўлічваць вопыт папярэднікаў. Многія гісторыкі, публіцысты, пісьменнікі, журналісты звяртаюцца да біяграфій нашых знакамітых суродзічаў. Але ж даўно наспела неабходнасць сістэматызаваць, выкласці інфармацыю разам, аб'яднаўшы лёсы працчураў пад адной вокладкай... Даволі шмат часу ў мяне заняў прагляд крыніц у ліку перыядычных выданняў. Звяртаўся я і да самых малатыражных, малавядомых газет і часопісаў. Прагледзеў дзясяткі гісторыка-дакументальных хронік «Памяць», прысвечаных розным раёнам Беларусі. І ўсё ж у аснове былі уласны пошук. Асабліва — у дачыненні да лёсаў нашых прашчураў у XX — на пачатку XXI стагоддзяў... Заўважу, што з многімі героямі кнігі я знаёмы асабіста.

Уладзімір Андрэйчанка ў прадмове да выдання заўважыў: «...Сёння ва ўмовах знешняга націску, нарастання ваенна-палітычнай напружанасці элементамі дзяржаўнай палітыкі. Матэрыялы, прадстаўленыя ў кнізе, дэманструюць уклад Беларусі ў развіццё сусветнай цывілізацыі, выхоўваюць у сучаснага пакалення гонар за краіну і нашых папярэднікаў».

Са старонак біяграфічнага даведніка чытач адкрые надзвычай многа цікавых, адметных фактаў. Міністэрствы ва ўрадах СССР і Расіі ўзначальвалі ў розны перыяд 14 ураджэнцаў Беларусі, беларусаў. У 1949—1954 гг. міністрам абароны ПНР быў Канстанцін Канстанцінавіч Ракасоўскі (маці яго — Антаніна Аўсяннікава — нарадзілася ў мястэчку Целяханы Пінскага павета, на Берасцейшчыне). Сярод нашых землякоў — два Маршалы Савецкага Саюза, чатыры маршалы родаў войск (авіяцыі, артылерыі, бранятанкавых войск), дзевяць генералаў арміі, 36 генерал-палкоўнікаў ва Узброеных сілах СССР, 21 генерал-палкоўнік — ва Узброеных сілах Расійскай Федэрацыі, тры адміралы ВМФ СССР і РФ, 28 віцэ-адміралаў... Пяць беларусаў камандавалі франтамі ў грамадзянскую вайну і ў Вялікую Айчынную... 76 камандавалі арміямі... Такая ваенна-гістарычная статыстыка ўзбагачае выданне, робіць яго болей прыцягальным, дазваляе шырэй выкарыстоўваць кнігу пры правядзенні ўрокаў нават у агульнаадукацыйнай школе.

Даволі насычаным, багатым на інфармацыю падаецца раздзел «Біяграфічныя партрэты за перыяд існавання Расійскай імперыі і другіх краін (1721—1922)». Яшчэ параўнальна нядаўна лёсы царскіх генералаў, звязаных паходжаннем з Беларуссю, беларускімі родамі, заставаліся таямніцай, не дужа прыцягвалі ўвагу гісторыкаў, краязнаўцаў. Мікалай Печань упершыню ў такім аб'ёме выпрайляе гэтую акалічнасць. Часам звесткі пра тых ці іншых асоб не дужа шыракія, але ж і яны — аснова для таго, каб наступныя даследчыкі пайшлі далей. Мо з часам будуць напісаны болей поўныя жыццяпісы дваранінаў Гродзенскай губерні генерал-лейтэнанта Уладзіслава Баўфала (камандзіра 3-й грэнадзёрскай дывізіі ў Першую сусветную), генерал-лейтэнанта Канстанціна Біцюткі (загінуў у Першую сусветную), удзельніка Кітайскага паходу (1899—1901) генерал-маёра Міхаіла Бема і іншых цікавых асоб... А старонкі выдання «Беларусь — Расіі і свету: 300 гадоў» стануць добрым штуршком для наступных пошукаў.

Відавочна, праца доктара гістарычных навук Мікалая Печаня патрабуе прадаўжэння.

Кастусь ЛЕШНІЦА.

Крынічка

Выдучая рубрыкі Ірына ТАМКОВІЧ. Тэл. 8 (017) 287-18-15

Гэта той самы жучок, які дзіравіць вашы фасоліны да і падчас захоўвання. Захаваць фасолю цэлай, калі ў ёй ёсць хаця б адна зярняўка, нерэальна. Што ж гэта за звер такі?

Фасолевая зярняўка — галоўны вораг фасолі

А звер гэты ўяўляе сабой невялікага жучка памерам да паўсантыметра, бурай афарбоўкі з жоўта-чырвоным брушкам і кончыкамі надкрылаў. Гэты шкоднік фасолі (і не толькі: зярняўка таксама пашкоджвае гарох, сою, бабы, сачавіцу, нут, хоць і не гэтак ахвотна) з'яўляецца, калі пачынаюць спець бабы. Размнажаецца казурка і на агародзе, і ў месцах захоўвання прыдатных для аптымальных тэмпературах — ад 15 да 30 градусаў. Самкі жука-зярняўкі адкладаюць лічынкі групамі на насенне, у расколіны сухіх бабоў, паміж зернямі і інш. У адной кладкі — 40—50 яек. На працягу чатырох сутак лічынкі свабодна поўзаюць, пасля чаго ўгрызаюцца ў фасоліны, дзе і развіваюцца да самай метамарфозы. За год жук можа даць больш чым тры пакаленні, адзін цыкл развіцця займае 1-2 месяцы.

На паверхні пашкоджаных зярняў заўважныя невялікія цёмныя дзірачкі. У адной фасоліне могуць сяліцца адначасова 10—20 лічынак.

Як змагацца з фасолевай зярняўкай?

Для пачатку пагаворым аб прафілактыцы шкоднікаў фасолі. Бабы ўбіраюць з градкі да парэзання, трохі прасушыце, аблушыце, пасля чаго для абеззаражвання зерне высыпце на бляху і на працягу 20 хвілін прагрэйце ў духоўцы пры тэмпературы 50 градусаў. Ёсць і іншы варыянт, як пазбавіцца ад шкоднікаў фасолі: змясціць бабы ў маразілку на трое сутак. І ў першым, і ў другім выпадках лічынкі ці дарослыя асобіны загінуць.

Захоўваць фасолю трэба ў шчыльна закаркаваных ёмістасцях, а яшчэ лепш — у слоіках, з якіх адпампавалі паветра. Добра захоўваць фасолю ў халадзільніку ці на балконе, лоджыі.

Перад пасадкай збожжа пратручваюць — у перакісе, марганцоўцы або проста гарачай вадзе (70—80 градусаў).

Да хімічнай барацьбы са шкоднікамі фасолі трэба звяртацца, калі ніякія іншыя спосабы не дапамагаюць. Напрыклад, зярняўка вельмі не любіць паху часнаку і кропу, таму, калі пасадзіць іх па суседстве з фасолевай градкай, з вялікай доляй верагоднасці шкоднік абыдзе вашу фасолю.

З пакупных сродкаў з фасолевай зярняўкай дапаможа справіцца «Дэціс» або «Актара» (адпаведна апрацоўка яшчэ да цвіцення). Але можна ўзяць біяпрэпараты шырокага спектра дзеяння: «Гаўпсін», «Вертыцылін» (апырскванне да цвіцення і пасля цвіцення). Абавязкова ўлічвайце тэрмін чакання, асабліва калі гаворка ідзе аб спаржавай фасолі.

24 КАСТРЫЧНІКА Даты Падзеі Людзі

Дзень Арганізацыі Аб'яднаных Нацый. Ён знамянуе сабой гадавіну ўступлення ў сілу ў 1945 годзе Статута ААН. Арганізацыя афіцыйна з'явілася на свет з моманту ратыфікацыі гэтага асноваторнага дакумента большасцю яго ўдзельнікаў, у тым ліку пяццю пастаяннымі членамі Савета бяспекі.

У краіне

1743 год — нарадзіўся (г. Пінск) Рафал Чарвякоўскі, беларускі хірург, вучоны. У 1771 годзе паступіў у Рымскі ўніверсітэт (Папская дзяржава), дзе 16 сакавіка 1776 года атрымаў ступень доктара медыцыны. Аўтар 12 тамоў па хірургіі. Вынаходнік некалькіх хірургічных прылад і спосабаў умяшання. У 1777 годзе рымскі папа Пій VI выдаваліў Рафала Чарвякоўскага па яго ўласнай просьбе ад духоўнага звання, бо тое было несумяшчальным з лячэннем жанчын. Прахадзіў урачэбную практыку ў шпіталях сталіц шасці дзяржаў Заходняй Еўропы. Выкладаў медыцыну ў Галоўнай каронной школе (Кракаўскі Ягелонскі ўніверсітэт). У 1780 годзе атрымаў званне прафесара. Тут заснаваў кафедру анатоміі, хірургіі і акушэрства і стаў іх першым выкладчыкам.

1795 год — адбыўся трэці, апошні з падзелаў Рэчы Паспалітай, па якім канфедэрацыя Каралеўства Польскага і Вялікага Княства Літоўскага спыніла сваё існаванне, як і самі гэтыя дзяржавы.

1897 год — нарадзіўся Кузьма Мікітавіч Галіцкі, генерал арміі, Герой Савецкага Саюза. У Вялікую Айчынную ваяваў на Заходнім, Паўночна-Заходнім, Калінінскім, 1-м Прыбалтыйскім, 3-м Беларускім франтах. У чэрвені 1941 года 24-я стралковая дывізія пад камандаваннем Галіцкага паспяхова адбівала варожыя атакі каля Ліды, затым з баямі прарвалася з Навагрудскага «катла». Удзельнік абароны Гомеля, Масквы, вызвалення гарадоў Вялікія Лукі, Невель, Орша, Барысаў, Мінск, Маладзечна, Усходне-Прускай аперацыі.

1921 год — нарадзіўся (г. Верхнядзвінск) Надзея Віктараўна Траян, Герой Савецкага Саюза, кандыдат медыцынскіх навук. З пачатку Вялікай Айчыннай вайны на падпольнай рабоце ў Смалявічах, адна са стваральніц падпольнай камсамольскай арганізацыі, затым разведчыца партызанскай брыгады «Дзядзькі Колі». Удзельніца падрыхтоўкі забойства генеральнага камісара Беларусі гаўляйтара В. Кубэ. Пасля вайны была на выкладчыцкай рабоце, дырэктарам Усесаюзнага НДІ санітарнай асветы СССР, старшынёй выканкама Чырвонага Крыжа, прарэктарам 1-га Маскоўскага медыцынскага інстытута.

У свеце

1648 год — падпісанне Вестфальскага міру, заканчэнне Трыццацігадовай вайны — шэрагу ваенных канфліктаў у Свяшчэннай Рымскай імперыі германскай нацыі і Еўропе наогул, якія доўжыліся з 1618 да 1648 года і закранулі ў той ці іншай ступені практычна ўсе еўрапейскія краіны і рэгіёны.

1857 год — выпускнікі Кембрыджскага ўніверсітэта (Вялікабрытанія) заснавалі ў Шэфілдзе першую ў свеце футбольную каманду.

1929 год — «Чорны чацвер» і пачатак Вялікай дэпрэсіі ў ЗША. У вузкім сэнсе гэты тэрмін прымяняецца толькі ў дачыненні да Злучаных Штатаў, а ў дачыненні да ўсяго свету гаворка ідзе пра сусветны эканамічны крызіс. Спад найбольш закрануў развітыя краіны Захаду: ЗША, Канаду, Вялікабрытанію, Германію і Францыю. Моцна пацярпелі прамысловыя гарады, у шэрагу краін практычна спынілася будаўніцтва, цэны на сельскагаспадарчую прадукцыю з-за адсутнасці плацежаздольнага попыту ўпалі на 50—60 %. Прычынай эканамічнага крызісу стала сукупнасць фактараў: крызіс перавытворчасці, імклівы прырост насельніцтва, скарачэнне міжнароднага гандлю, біржавыя спекуляцыі, змяншэнне ваенных заказаў пасля заканчэння Першай сусветнай вайны. Пад канец перыяду рэцэсіі ўзровень прамысловай вытворчасці быў адкінуты да ўзроўню пачатку XX стагоддзя. Колькасць беспрацоўных у краінах Захаду дасягнула 30 млн чалавек.

Так гаварыць...

ФАБІЙ:

Дзеля Айчыны трэба аквяраваць нават славай.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	7.55	17.52	9.57
Віцебск —	7.48	17.38	9.50
Магілёў —	7.45	17.42	9.57
Гомель —	7.38	17.42	10.04
Гродна —	8.10	18.07	9.57
Брэст —	8.07	18.11	10.04

Месяц

Апошняя квадра ў 11.03.
Месяц у сузор'і Льва.

Імяніны

Пр. Зінаіды, Льва, Піліпа.
К. Марты, Антона, Марціна, Рафаіла.

Фота Ірыны ТАМКОВІЧ.

ЗАЎТРА



УСМІХНЕМСЯ

— Вось у дзяцінстве чытаў гэтую кнігу, і многае было незразумела. А цяпер чытаеш, усё ўспрымаеш па-іншаму і думаеш: ну і тупы ж я быў — усё ж проста, як двойчы два.

— Хопіць ужо арыфметыку за першы клас гартаць, давай працуй.

Хутка ў ваенкаматах:
— Квадробер, кажаш? Значыць, камандаванне «служыць» ведаеш...

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА. ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмная — 311 17 13 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 311 17 44, маркетынгу — 263 66 73, бухгалтэрыі — 311 17 16.

www.zviazda.by
e-mail: info@zviazda.by
для зваротаў: zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 311 17 27, e-mail: reklama@zviazda.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар.

Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета адрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 3820000007667 ад 30.04.2004.

220013, Мінск, праспект Незалежнасці, 79/1. Выходзіць 5 разоў на тыдзень. Тыраж 11 717. Індэкс 63850. Зак. № 2385.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 23 кастрычніка 2024 года.